Артыкул 13. Працэсуальная эканомія

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выконвае задачы судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, у як мага кароткія тэрміны ў межах, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Артыкул 14. Законнасць судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы

Законнасць судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, забяспечваецца правільным прымяненнем законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, а таксама прытрымліваннем суддзямі суда, які разглядае эканамічныя справы, правіл, устаноўленых заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Артыкул 15. Роўнасць перад законам і судом, які разглядае эканамічныя справы

Асобы, якія прымаюць удзел у справе, пры ажыццяўленні правасуддзя судом, які разглядае эканамічныя справы, роўныя перад законам і судом, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, забяспечвае роўную судовую абарону праў і законных інтарэсаў усіх асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 16. Растлумачэнне працэсуальных праў і працэсуальных абавязкаў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, растлумачвае ўдзельнікам судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, іх працэсуальныя правы і працэсуальныя абавязкі, а таксама працэсуальныя наступствы адмовы ад рэалізацыі такіх праў і неналежнага выканання такіх абавязкаў.

Артыкул 17. Павага годнасці асобы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, а таксама ўсе ўдзельнікі судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, абавязаны паважаць годнасць адзін аднаго.

Артыкул 18. Раўнапраўе і добрасумленнасць бакоў

Судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, ажыццяўляецца на аснове раўнапраўя бакоў.

Бакі ў судовым пасяджэнні маюць роўныя правы пры абгрунтаванні сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, падачы доказаў у іх пацвярджэнне, здзяйсненні іншых працэсуальных дзеянняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, абавязаны забяспечыць захаваннем прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, працэсуальных форм абароны праў і законных інтарэсаў бакоў. Суд не мае права сваімі дзеяннямі ставіць які-небудзь з бакоў у пераважнае становішча, таксама як і змяншаць яго правы.

У спрэчцы паміж сабой бакі абавязаны добрасумленна карыстацца працэсуальнымі правамі, якія належаць ім, і выконваць працэсуальныя абавязкі. Кожны ўдзельнік судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, прызнаецца добрасумленным, пакуль не даказана адваротнае.

Артыкул 19. Спаборнасць

Судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, ажыццяўляецца на аснове спаборнасці.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, абавязаны абгрунтаваць свае патрабаванні і пярэчанні.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права ведаць аб аргументах адно аднаго да пачатку судовага разбору. Кожнай асобе, якая ўдзельнічае ў справе, гарантуецца права падаваць доказы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, і іншаму боку па справе, а таксама забяспечваецца права заяўляць хадайніцтвы, выказваць свае меркаванні і доказы, даваць тлумачэнні аб усіх пытаннях, якія ўзнікаюць у ходзе разгляду справы, звязаных з падачай доказаў. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, нясуць рызыку надыходу наступстваў здзяйснення або нездзяйснення імі працэсуальных дзеянняў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, захоўваючы незалежнасць, аб'ектыўнасць і бесстароннасць, кіруе судовым працэсам, стварае асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, умовы для падачы доказаў, актыўнага ўдзелу ў іх даследаванні і параўнанні, у выяўленні фактычных абставін, а таксама для правільнага прымянення законаў і іншых нарматыўных прававых актаў пры разглядзе справы.

Артыкул 20. Мова судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы

Судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, вядзецца на беларускай і (або) рускай мовах.

Асобам, якія бяруць удзел у справе і не валодаюць або недастаткова валодаюць мовай судаводства, забяспечваецца права знаёміцца з матэрыяламі справы, удзельнічаць у працэсуальных дзеяннях праз перакладчыка, а таксама выступаць у судзе, які разглядае эканамічныя справы, на мове, якой яны валодаюць. У гэтых выпадках указаныя асобы маюць права на бязвыплатнай аснове карыстацца паслугамі перакладчыка ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Судовыя дакументы (іх копіі), якія суд, што разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з заканадаўствам аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, абавязаны накіроўваць або ўручаць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, павінны быць складзены на мове судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 21. Галоснасць разбору справы

Разбор справы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, адкрыты.

Разбор справы на закрытым судовым пасяджэнні дапускаецца, калі адкрыты разбор можа прывесці да выдавання звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, або іншай тайны, якая ахоўваецца законам, што ўтрымліваюцца ў матэрыялах справы, у тым ліку пры задавальненні судом, які разглядае эканамічныя справы, хадайніцтва асобы, якая бярэ ўдзел у справе і спасылаецца на неабходнасць невыдавання такіх звестак або на іншыя абставіны, якія перашкаджаюць адкрытаму разбору.

Пры разборы справы на закрытым судовым пасяджэнні прысутнічаюць асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікі, а ў неабходных выпадках – сведкі, эксперты, спецыялісты і перакладчыкі.

Аб разборы справы на закрытым судовым пасяджэнні выносіцца матываваны прысуд.

Разбор справы на закрытым судовым пасяджэнні вядзецца з захаваннем правіл судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, і з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб дзяржаўных сакрэтах.

Рэзалютыўная частка судовай пастановы заўсёды аб'яўляецца публічна.

Артыкул 22. Права на юрыдычную дапамогу

У судаводстве ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і грамадзяне маюць права карыстацца юрыдычнай дапамогай адвакатаў і іншых прадстаўнікоў у мэтах абароны сваіх праў і законных інтарэсаў, якія парушаны або аспрэчваюцца.

Артыкул 23. Дыспазітыўнасць

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права свабодна распараджацца матэрыяльнымі і працэсуальнымі правамі, якія належаць ім, не парушаючы пры гэтым правы і законныя інтарэсы іншых асоб і дзяржавы.

Справы ў судаводстве ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, узбуджаюцца толькі па іскавых заявах, заявах, скаргах, пратэстах, прадстаўленнях аб пераглядзе справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, і хадайніцтвах зацікаўленых асоб і разглядаюцца толькі ў дачыненні да заяўленых патрабаванняў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 24. Непасрэднасць судовага разбору

Суд, які разглядае эканамічныя справы, пры разборы справы абавязаны непасрэдна даследаваць усе доказы па справе.

Пададзеныя ў суд, што разглядае эканамічныя справы, доказы, якія не былі прадметам даследавання на судовым пасяджэнні, не могуць быць пакладзены ў аснову прынятай судовай пастановы, калі іншае непасрэдна не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Артыкул 25. Нарматыўныя прававыя акты, якія прымяняюцца пры вырашэнні гаспадарчых (эканамічных) спрэчак і разглядзе іншых спраў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, вырашае спрэчкі і разглядае іншыя справы на падставе актаў заканадаўства.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выявіўшы пры разглядзе справы неадпаведнасць акта дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь або іншым заканадаўчым актам, у тым ліку выданне яго з перавышэннем паўнамоцтваў, прымае рашэнне ў адпаведнасці з прававымі нормамі, якія маюць большую юрыдычную сілу, і ставіць перад Прэзідыумам або Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь пытанне аб звароце ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у мэтах прызнання адпаведнага нарматыўнага прававога акта неканстытуцыйным або прымае меры для прызнання ненарматыўнага прававога акта несапраўдным.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў заканадаўчым акце, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

Правілы, устаноўленыя ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, якія не ўступілі ў сілу, могуць прымяняцца судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь.

У выпадку адсутнасці норм заканадаўства, якія рэгулююць спрэчныя праваадносіны, суд, які разглядае эканамічныя справы, прымяняе тыя нормы заканадаўства, якія рэгулююць падобныя адносіны (аналогія закона), а пры адсутнасці такіх норм – разглядае справу зыходзячы з агульных пачаткаў і сэнсу заканадаўства (аналогія права).

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з заканадаўствам, міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, пагадненнем бакоў, заключаным у адпаведнасці з імі, прымяняе нормы права іншых дзяржаў. Гэта правіла не закранае

дзеянні імператыўных норм заканадаўства, прымяненне якіх рэгулюецца раздзелам VII Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 26. Прымяненне норм замежнага права і (або) звычаяў, якія выкарыстоўваюцца ў міжнародным гандлі

У выпадку прымянення замежнага права суд, які разглядае эканамічныя справы, высвятляе існаванне і змест яго норм у адпаведнасці з іх афіцыйным тлумачэннем, практыкай прымянення і дактрынай у адпаведнай замежнай дзяржаве.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у адпаведнасці з заканадаўствам прымяняюць звычаі (правіла паводзін, якое склалася і шырока прымяняецца ў якой-небудзь галіне прадпрымальніцкай дзейнасці, не прадугледжанае заканадаўствам, незалежна ад таго, ці зафіксавана яно ў якім-небудзь дакуменце), аб якіх бакі ведалі або павінны былі ведаць і якія ў міжнародным гандлі шырока вядомыя і пастаянна захоўваюцца бакамі ў дагаворах дадзенага роду ў адпаведнай галіне гандлю. Звычаі, якія супярэчаць абавязковым для ўдзельнікаў адпаведных адносін палажэнням заканадаўства або дагавору, не прымяняюцца.

У мэтах высвятлення існавання і зместу норм замежнага права і (або) звычаяў суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права звярнуцца за садзейнічаннем і растлумачэннем у кампетэнтныя органы і арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь, за межамі Рэспублікі Беларусь або прыцягнуць спецыялістаў.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права падаваць дакументы, якія пацвярджаюць існаванне і змест норм замежнага права і (або) звычаяў, на якія яны спасылаюцца для абгрунтавання сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, і іншым чынам садзейнічаць суду, які разглядае эканамічныя справы, у высвятленні існавання і зместу такіх норм.

Па патрабаваннях, звязаных з ажыццяўленнем бакамі прадпрымальніцкай дзейнасці, суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права ўскласці на бакі абавязак даказвання існавання і зместу норм замежнага права і (або) звычаяў.

Пры атрыманні судом, які разглядае эканамічныя справы, з кампетэнтных органаў, арганізацый або ад спецыялістаў копій адпаведных нарматыўных прававых актаў, належным чынам завераных і перакладзеных на мову судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, і ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, існаванне і змест норм замежнага права і (або) звычаяў лічацца высветленымі.

Калі існаванне і (або) змест норм замежнага права і (або) звычаяў, нягледзячы на прынятыя ў адпаведнасці з гэтым артыкулам меры, не высветлены, суд, які разглядае эканамічныя справы, прымяняе адпаведныя нормы права Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 27. Абавязковасць судовых пастаноў і судовых зваротаў

Судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, абавязковыя для ўсіх дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, іншых органаў, юрыдычных асоб, арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, службовых асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян і падлягаюць няўхільнаму выкананню на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Законныя распараджэнні, патрабаванні, даручэнні, выклікі і іншыя судовыя звароты абавязковыя для ўсіх асоб, якім яны адрасаваны.

Невыкананне судовых пастаноў, а таксама іншае выяўленне непавагі да суда, які разглядае эканамічныя справы, цягнуць за сабой адказнасць, устаноўленую заканадаўчымі актамі.

Абавязковасць судовай пастановы не пазбаўляе зацікаўленых асоб, якія не ўдзельнічалі ў справе, магчымасці звярнуцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у мэтах абароны сваіх праў і законных інтарэсаў, якія парушаны або аспрэчваюцца.

Абавязковасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь судовых пастаноў судоў замежных дзяржаў, міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў вызначаецца заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 28. Судовы нагляд

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе судовы нагляд за законнасцю судовых пастаноў у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 3
СКЛАД СУДА, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ. САКРАТАР СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ – ПАМОЧНІК СУДДЗІ

Артыкул 29. Склад суда, які разглядае эканамічныя справы

Склад суда, які разглядае эканамічныя справы, фарміруецца з улікам нагрузкі і спецыялізацыі суддзяў суда, які разглядае эканамічныя справы, у парадку, які выключае ўплыў на яго фарміраванне асоб, зацікаўленых у зыходзе справы.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай інстанцыі разглядаюць справы як у калегіяльным складзе, так і аднаасобна.

Па рашэнні старшыні суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намесніка справа можа быць разгледжана судом, які разглядае эканамічныя справы, у калегіяльным складзе, аб чым выносіцца прысуд.

Старшыня суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснік маюць права замяніць суддзю (суддзяў) суда, які разглядае эканамічныя справы, пры яго працяглай адсутнасці. Аб замене суддзі (суддзяў) выносіцца прысуд. Пасля замены суддзі (суддзяў) разгляд справы праводзіцца спачатку.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый разглядаюць справы ў калегіяльным складзе.

Пры разглядзе справы судом, які разглядае эканамічныя справы, у калегіяльным складзе ў яго павінны ўваходзіць не менш за тры (няцотная колькасць) суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, адзін з якіх з'яўляецца старшынствуючым.

Старшынствуючы ў калегіяльным складзе суддзя прызначаецца старшынёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснікам.

Суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, пры разглядзе справы карыстаюцца роўнымі правамі.

Суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, пры аднаасобным разглядзе справы або рашэнні іншых пытанняў працэсу дзейнічае ад імя суда, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 30. Парадак рашэння пытанняў судом, які разглядае эканамічныя справы

Пры аднаасобным разглядзе справы па першай інстанцыі пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе судовага разбору, вырашае суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, аднаасобна.

Пры разглядзе справы судом, які разглядае эканамічныя справы, у калегіяльным складзе пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе судовага разбору, вырашаюць суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, большасцю галасоў. Ніхто з суддзяў не мае права ўстрымлівацца ад галасавання. Суддзя, які старшынствуе на судовым пасяджэнні, галасуе апошнім.

Артыкул 31. Асобная думка суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы

Пры разглядзе справы судом, які разглядае эканамічныя справы, у калегіяльным складзе суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, не згодны з рашэннем большасці, абавязаны падпісаць вынесеную судовую пастанову і мае права выказаць сваю асобную думку без адзнакі аб гэтым у судовым акце, які падпісваецца. Асобная думка выказваецца ў пісьмовай форме і падпісваецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, адначасова з падпісаннем судовай пастановы.

Асобная думка суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, дадаецца да справы, але не аб'яўляецца асобам, якія бяруць удзел у справе.

Артыкул 32. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, у разглядзе справы

Суддзя суда, што разглядае эканамічныя справы, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе, што разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый.

Суддзя суда, што разглядае эканамічныя справы, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе, што разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, касацыйнай і нагляднай інстанцый.

Суддзя суда, што разглядае эканамічныя справы, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе, што разглядае эканамічныя справы, касацыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай і апеляцыйнай інстанцый.

Суддзя суда, што разглядае эканамічныя справы, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе, што разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі, за выключэннем Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай і апеляцыйнай інстанцый.

Артыкул 33. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі

Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі па даручэнні суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, выконвае наступныя дзеянні, неабходныя для падрыхтоўкі справы да разгляду і разгляду яе на судовым пасяджэнні:

паведамляе ўдзельнікам гаспадарчага працэсу аб часе і месцы правядзення судовага разбору і правярае іх яўку ў суд;

высвятляе прычыны няяўкі ўдзельнікаў гаспадарчага працэсу і дакладвае пра іх суддзі;

вядзе пратакол судовага пасяджэння;

выконвае даручэнні суддзі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем судовага пасяджэння.

Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі аказвае суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, дапамогу ў рэалізацыі дадзеных яму праў і выкананні ўскладзеных на яго абавязкаў. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі па даручэнні суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, выконвае асобныя дзеянні, не звязаныя з прыняццем судовых пастаноў, а таксама іншыя арганізацыйна-распарадчыя дзеянні.

ГЛАВА 4
АДВОДЫ

Артыкул 34. Падставы для адводу суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы

Суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, не можа ўдзельнічаць у разглядзе справы і абавязаны заявіць самаадвод, калі:

з'яўляецца блізкім сваяком каго-небудзь з асоб, якія бяруць удзел у справе, іх прадстаўнікоў, а калі асобай, якая бярэ ўдзел у справе, з'яўляецца юрыдычная асоба, – блізкім сваяком службовых асоб гэтай юрыдычнай асобы, яго заснавальнікаў (удзельнікаў), уласнікаў;

пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці суддзі і яго паўторны ўдзел у разглядзе справы ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса з'яўляецца недапушчальным;

пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі, эксперта, перакладчыка, пракурора, прадстаўніка аднаго з бакоў або сведкі;

пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці суддзі замежнага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

асабіста прама ці ўскосна зацікаўлены ў зыходзе справы або маюцца іншыя абставіны, якія могуць выклікаць сумненне ў яго аб'ектыўнасці і бесстароннасці.

У склад суда, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу, не могуць уваходзіць асобы, якія з’яўляюцца сваякамі паміж сабой.

Калі суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, не заявіў самаадводу пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных гэтым артыкулам, адвод можа быць заяўлены асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 35. Падставы для адводу пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі

Пракурор, эксперт, спецыяліст, перакладчык і сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі не могуць удзельнічаць у разглядзе справы і абавязаны заявіць самаадвод на падставах, прадугледжаных артыкулам 34 гэтага Кодэкса.

Падставамі для адводу эксперта ці спецыяліста з'яўляюцца іх службовая або іншая залежнасць ад асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, ці іх прадстаўнікоў у момант разгляду справы ці ў мінулым або правядзенне імі праверкі, матэрыялы якой паслужылі падставай або нагодай для звароту ў суд, які разглядае эканамічныя справы, або выкарыстоўваюцца пры разглядзе гэтай справы.

Удзел пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі пры папярэднім разглядзе гэтай справы ў якасці адпаведна пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі не з'яўляецца падставай для іх адводу або самаадводу.

Калі пракурор, эксперт, спецыяліст, перакладчык або сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі не заявілі самаадводу пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных гэтым артыкулам, адвод можа быць заяўлены асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 36. Заява самаадводу або адводу

Самаадвод або адвод павінны быць матываваны і заяўлены да пачатку разгляду справы па сутнасці.

У ходзе разгляду справы заява самаадводу або адводу дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі падставы самаадводу або адводу сталі вядомыя суду, які разглядае эканамічныя справы, або асобе, якая заяўляе самаадвод або адвод, пасля пачатку разгляду справы.

Самаадвод або адвод заяўляюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай форме з указаннем падстаў для самаадводу або адводу і прывядзеннем неабходных абгрунтаванняў.

Паўторны адвод на тых жа падставах не можа быць заяўлены адной і той жа асобай.

Артыкул 37. Парадак вырашэння заяўленага самаадводу або адводу

У выпадку заявы самаадводу або адводу суд, які разглядае эканамічныя справы, заслухоўвае меркаванні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама асобы, якая заявіла самаадвод або якой заяўлены адвод, калі асоба, якая адводзіцца, жадае даць тлумачэнні.

Пытанне аб адводзе суддзі суда, што разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу аднаасобна, вырашаецца старшынёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснікам.

Пры разглядзе справы судом, які разглядае эканамічныя справы, у калегіяльным складзе пытанне аб адводзе суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, вырашаецца калегіяльным складам суда, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу, у адсутнасць суддзі, які заявіў самаадвод або якому заяўлены адвод. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных за адвод і супраць адводу, суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, лічыцца адведзеным.

Пытанне аб адводзе, заяўленым некалькім суддзям суда, які разглядае эканамічныя справы, або ўсяму калегіяльнаму складу суда, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу, вырашаецца старшынёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснікам.

Суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, заявіўшы самаадвод, можа быць заменены іншым суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Пытанне аб задавальненні самаадводу або адводу пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі вырашаецца складам суда, які разглядае эканамічныя справы.

Па выніках разгляду пытанняў аб самаадводзе або аб адводзе выносіцца прысуд.

Артыкул 38. Наступствы задавальнення заявы самаадводу або адводу суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы

У выпадку самаадводу або адводу суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, некалькіх суддзяў суда, які разглядае эканамічныя справы, або ўсяго складу суда, які разглядае эканамічныя справы, справа разглядаецца ў тым жа судзе, які разглядае эканамічныя справы, іншым складам суддзяў.

Калі ў выніку задавальнення самаадводаў або адводаў немагчыма ўтварыць новы склад суда, які разглядае эканамічныя справы, для разгляду справы ў тым жа судзе, які разглядае эканамічныя справы, гэта справа павінна быць перададзена ў іншы суд, які разглядае эканамічныя справы, у парадку, устаноўленым артыкулам 53 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 5
КАМПЕТЭНЦЫЯ СУДА, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ

Артыкул 39. Падведамнасць спраў суду, які разглядае эканамічныя справы

Суду, які разглядае эканамічныя справы, падведамныя справы па гаспадарчых (эканамічных) спрэчках, справы, звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, і іншыя справы, аднесеныя да яго падведамнасці заканадаўчымі актамі.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, вырашае гаспадарчыя (эканамічныя) спрэчкі і разглядае іншыя справы з удзелам юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, з удзелам Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, службовых асоб і грамадзян.

Заява, прынятая судом, які разглядае эканамічныя справы, да свайго вядзення з выкананнем правіл падведамнасці, павінна быць разгледжана ім па сутнасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае таксама падведамныя яму справы з удзелам юрыдычных асоб, арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян Рэспублікі Беларусь, а таксама замежных арганізацый, міжнародных арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 40. Перадача спрэчак на вырашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Па пісьмовым пагадненні бакоў спрэчка, якая вынікае з грамадзянскіх праваадносін і падведамная суду, які разглядае эканамічныя справы, да прыняцця ім рашэння можа быць перададзена бакамі на разгляд міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Аб перадачы спрэчкі на разгляд міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа выносіцца прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 40[1]. Урэгуляванне спрэчак з удзелам медыятара

Гаспадарчая (эканамічная) спрэчка, якая ўзнікла з грамадзянскіх праваадносін і падведамная суду, які разглядае эканамічныя справы, па пісьмовым пагадненні бакоў або з іх згоды па ініцыятыве суда да выдалення суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы па сутнасці спрэчкі можа быць перададзена для ўрэгулявання бакамі з удзелам медыятара (медыятараў).

У выпадку перадачы спрэчкі для ўрэгулявання бакамі з удзелам медыятара (медыятараў) суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд аб пакіданні

іскавай заявы (заявы, скаргі) без разгляду згодна з правіламі, устаноўленымі главой 16 гэтага Кодэкса.

У выпадку невыканання добраахвотна медыятыўнага пагаднення, якое адпавядае патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні, выдача выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення праводзіцца судом, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых артыкуламі 262^1–262^3 гэтага Кодэкса.

Недасягненне медыятыўнага пагаднення па выніках медыяцыі не перашкаджае правядзенню прымірэнчай працэдуры ў судзе, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 41. Падведамнасць спрэчак, якія вынікаюць з грамадзянскіх і іншых праваадносін

Суд, які разглядае эканамічныя справы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, вырашае гаспадарчыя (эканамічныя) спрэчкі, якія вынікаюць з грамадзянскіх і іншых праваадносін і разглядае іншыя справы, звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, – арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і грамадзянамі.

Да гаспадарчых (эканамічных) спрэчак, якія вырашаюцца судом, што разглядае эканамічныя справы, у прыватнасці, адносяцца спрэчкі:

якія вынікаюць з праваадносін, звязаных з заключэннем, змяненнем, скасаваннем дагавораў;

якія вынікаюць з абавязкаў праз беспадстаўнае абагачэнне;

якія датычацца несапраўднасці здзелак;

аб невыкананні або неналежным выкананні абавязкаў;

аб абароне права ўласнасці і іншых рэчавых праў;

аб пакрыцці страт, шкоды.

Заканадаўчымі актамі да падведамнасці суда, які разглядае эканамічныя справы, могуць быць аднесены і іншыя справы.

Артыкул 42. Падведамнасць гаспадарчых (эканамічных) спрэчак і іншых спраў, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

Суд, які разглядае эканамічныя справы, вырашае гаспадарчыя спрэчкі, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, і разглядае іншыя справы, звязаныя з ажыццяўленнем юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і грамадзянамі прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, аб:

прызнанні несапраўдным ненарматыўнага прававога акта дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы,

якім закранаюцца правы і законныя інтарэсы заяўніка ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы, якімі закранаюцца правы і законныя інтарэсы заяўніка ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

спагнанні з юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую і іншую гаспадарчую (эканамічную) дзейнасць, падаткаў, збораў (пошлін), іншых абавязковых плацяжоў у рэспубліканскі і (або) мясцовы бюджэты і дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, а таксама пені, прадугледжанай заканадаўствам, калі іншы парадак іх спагнання не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі;

прызнанні не падлеглым выкананню выканаўчага або іншага дакумента, па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным парадку;

вяртанні з бюджэту грашовых сродкаў, спісаных у бясспрэчным парадку з юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

адмове ў выдачы (прадаўжэнні тэрміну дзеяння) спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі);

устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці суб'екта, які правяраецца (яго цэхаў, вытворчых участкаў), аб'екта будаўніцтва, абсталявання (далей – прыпыненне (забарона) дзейнасці);

прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), эксплуатацыі транспартных сродкаў (далей – прыпыненне (забарона) вытворчасці);

іншыя справы, разгляд якіх заканадаўчымі актамі аднесены да кампетэнцыі суда, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 43. Падведамнасць спраў аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне (юрыдычных фактаў)

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з главой 26 гэтага Кодэкса разглядае справы аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне для ўзнікнення, змянення або спынення праў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці.

Артыкул 44. Падведамнасць спраў аб скаргах на натарыяльныя дзеянні або адмову ў іх здзяйсненні

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з артыкулам 266 гэтага Кодэкса разглядае справы аб скаргах на натарыяльныя дзеянні або адмову ў іх здзяйсненні.

Артыкул 45. Падведамнасць спраў аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэнняў замежных судоў і замежных арбітражных рашэнняў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з главой 28 гэтага Кодэкса разглядае справы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэнняў замежных судоў і замежных арбітражных рашэнняў па спрэчках, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці.

Артыкул 46. Падведамнасць спраў аб абскарджанні рашэнняў міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і аб выдачы выканаўчых дакументаў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з главой 29 гэтага Кодэкса разглядае справы аб:

абскарджанні рашэнняў міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, па спрэчках, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

выдачы выканаўчых дакументаў на прымусовае выкананне рашэнняў міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, па спрэчках, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

выдачы выканаўчых дакументаў на прымусовае выкананне медыятыўных пагадненняў, якія адпавядаюць патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні.

Артыкул 46^1. Падведамнасць спраў аб скаргах на адказы на звароты юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з артыкулам 266^2 гэтага Кодэкса разглядае справы аб скаргах юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў або грамадзян на адказ арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка) на зварот, рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці, адказ на скаргу ў вышэйстаячую арганізацыю.

Артыкул 46^2. Падведамнасць спраў аб скаргах (пратэстах) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, кіраўніка органа прымусовага выканання

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з артыкулам 266^3 гэтага Кодэкса разглядае справы аб скаргах (пратэстах) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў.

Артыкул 47. Спецыяльная падведамнасць

Суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае справы:

аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве);

па спрэчках аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі юрыдычных асоб, арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, спыненні дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў;

па спрэчках аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі, аб ухіленні ад дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычных асоб, арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і індывідуальных прадпрымальнікаў;

па спрэчках, звязаных з прымяненнем умоў заснавальніцтва юрыдычнай асобы або арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, і (або) удзелу ў іх;

аб абароне дзелавой рэпутацыі ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

іншыя справы, звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Справы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, разглядаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, незалежна ад таго, ці з'яўляюцца ўдзельнікамі праваадносін, з якіх узніклі спрэчка або патрабаванне, юрыдычныя асобы, арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальныя прадпрымальнікі або грамадзяне.

Артыкул 48. Падсуднасць спраў судам, якія разглядаюць эканамічныя справы

Справы, падведамныя суду, які разглядае эканамічныя справы, разглядаюцца па першай інстанцыі эканамічным судом вобласці (горада Мінска), за выключэннем спраў, аднесеных да падсуднасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае ў якасці суда першай інстанцыі:

справы аб аспрэчванні ненарматыўных прававых актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых рэспубліканскіх органаў, якія не адпавядаюць закону і закранаюць правы і законныя інтарэсы заяўніка ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

гаспадарчыя (эканамічныя) спрэчкі паміж Рэспублікай Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі Рэспублікі Беларусь, а таксама паміж адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі Рэспублікі Беларусь;

справы, звязаныя з дзяржаўнымі сакрэтамі;

іншыя справы, аднесеныя заканадаўчымі актамі да падсуднасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у межах падведамнасці спраў судам, якія разглядаюць эканамічныя справы, мае права дадаткова вызначаць падсуднасць спраў, прымаць да свайго вядзення і разглядаць любую справу.

Артыкул 49. Агульныя правілы падсуднасці

Іск прад'яўляецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства адказчыка.

Іск да юрыдычнай асобы, які вынікае з дзейнасці яе адасобленага падраздзялення, можа быць прад'яўлены па месцы знаходжання адасобленага падраздзялення юрыдычнай асобы.

Сустрэчны іск незалежна ад яго падсуднасці прад'яўляецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае першапачатковы іск.

Артыкул 50. Падсуднасць па выбары істца

Іскі да адказчыкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі розных абласцей Рэспублікі Беларусь або абласцей (вобласці) і горада Мінска, прад'яўляюцца на выбар істца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства аднаго з адказчыкаў.

Іск да адказчыка, месца знаходжання або месца жыхарства якога невядомыя, можа быць прад'яўлены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання яго маёмасці або па яго апошнім вядомым месцы знаходжання ці месцы жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь.

Іск да адказчыка аб пакрыцці шкоды, прычыненай маёмасці юрыдычнай асобы або індывідуальнаму прадпрымальніку, можа быць прад'яўлены таксама ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы прычынення шкоды.

Іск да адказчыка, які з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам Рэспублікі Беларусь і знаходзіцца на тэрыторыі іншай дзяржавы, можа быць прад'яўлены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства істца ў Рэспубліцы Беларусь ці па месцы знаходжання маёмасці адказчыка ў Рэспубліцы Беларусь.

Іск да адказчыка, што вынікае з дагавора, у якім указана месца выканання, можа быць прад'яўлены таксама па месцы выканання дагавора.

Выбар паміж некалькімі судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, якім падсудная справа, належыць істцу.

Артыкул 51. Выключная падсуднасць

Іскі аб прызнанні права ўласнасці на нерухомую маёмасць, спрэчкі аб нерухомай маёмасці, у тым ліку аб выпатрабаванні маёмасці з чужога незаконнага валодання або аб ліквідацыі парушэнняў праў уласніка ці іншага законнага ўладальніка, не звязаных з пазбаўленнем права валодання, і іншыя іскі аб правах на нерухомую маёмасць прад'яўляюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання нерухомай маёмасці.

Іскі аб правах на марскія і паветраныя судны, судны ўнутранага плавання прад'яўляюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

Іскі да перавозчыка, якія вынікаюць з дагавораў перавозкі грузаў, пасажыраў і іх багажу, у тым ліку калі перавозчык з'яўляецца адным з адказчыкаў, прад'яўляюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання перавозчыка.

Іскі (заявы) да дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія вынікаюць з адміністрацыйных праваадносін, прад'яўляюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання істца (заяўніка), калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

Заявы аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне (юрыдычных фактаў), падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства заяўніка, за выключэннем заяў аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне для ўзнікнення, змянення або спынення права на нерухомую маёмасць, якія падаюцца ў суд, што разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання нерухомай маёмасці.

Заявы аб прызнанні даўжніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання даўжніка.

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, заяўляюцца (падаюцца) у суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія вынеслі рашэнне.

Заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства даўжніка ці па месцы знаходжання маёмасці даўжніка, калі месца знаходжання або месца жыхарства яго невядомыя.

Заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння падае бок, на карысць якога адбылося рашэнне, у суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства даўжніка, а калі месца знаходжання ці месца жыхарства даўжніка невядомыя, – у суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання яго маёмасці.

Скаргі на натарыяльныя дзеянні або адмову ў іх здзяйсненні падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання адпаведных натарыяльнай канторы, натарыяльнага бюро ці іншага органа, службовай асобе якога ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дадзена права афармляць натарыяльныя дзеянні.

Скаргі на адказы на звароты юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы жыхарства або месцы знаходжання заяўніка.

Заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы ажыццяўлення дзейнасці, якая прыпыняецца (забараняецца), вытворчасці, якая прыпыняецца (забараняецца). У выпадку, калі прыпыненне (забарона) дзейнасці, прыпыненне (забарона) вытворчасці ахопліваюць усю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь або некалькі яе абласцей, заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы жыхарства або месцы знаходжання суб'екта, які правяраецца.

Заявы па спрэчках паміж юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць дзейнасць або маюць маёмасць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы дзяржаўнай рэгістрацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца адказчыкам.

Скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання адпаведнага органа прымусовага выканання.

Артыкул 52. Дагаворная падсуднасць

Падсуднасць, устаноўленая ў адпаведнасці з артыкуламі 49 і 50 гэтага Кодэкса, можа быць зменена па пагадненні бакоў.

Артыкул 53. Перадача справы, прынятай судом да свайго вядзення, у іншы суд

Справа, прынятая судом, які разглядае эканамічныя справы, да свайго вядзення з захаваннем правіл падсуднасці, павінна быць разгледжана ім па сутнасці, хаця б у далейшым яна стала падсуднай іншаму суду, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, перадае справу на разгляд іншага суда, які разглядае эканамічныя справы, калі:

пры разглядзе справы ў гэтым судзе, які разглядае эканамічныя справы, выяўлена, што яна была прынята да вядзення з парушэннем правіл падсуднасці;

пасля адводу аднаго або некалькіх суддзяў суда, які разглядае эканамічныя справы, іх замена ў гэтым судзе, які разглядае эканамічныя справы, становіцца немагчымай;

адказчык, месца знаходжання або месца жыхарства якога былі невядомыя раней, заявіў хадайніцтва аб перадачы справы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па яго месцы знаходжання або месцы жыхарства;

абодва бакі заявілі хадайніцтва аб разглядзе справы судом, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання большасці доказаў;

адным з бакоў у спрэчцы з'яўляецца гэты ж суд, які разглядае эканамічныя справы;

разгляд справы ў гэтым судзе, які разглядае эканамічныя справы, немагчымы з-за іншых аб'ектыўных прычын.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, перадае справу на разгляд іншага суда агульнай юрысдыкцыі, калі пры разглядзе справы будзе выяўлена, што яна прынята да вядзення з парушэннем правіл падсуднасці.

Аб перадачы справы на разгляд іншага суда выносіцца прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Перадача справы з аднаго суда ў іншы праводзіцца пасля сканчэння тэрміну на абскарджанне.

Справа, накіраваная з аднаго суда ў іншы ў парадку, прадугледжаным гэтым артыкулам, падлягае безумоўнаму прыняццю да вядзення судом, у які яна накіравана. Спрэчкі аб падсуднасці паміж судамі не дапускаюцца.

ГЛАВА 6
АСОБЫ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У СПРАВЕ, І ІНШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ГАСПАДАРЧАГА ПРАЦЭСУ

Артыкул 54. Склад асоб, якія ўдзельнічаюць у справе

Асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, з'яўляюцца:

бакі;

заяўнікі і зацікаўленыя асобы – па спрэчках і справах, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін; у справах аб выяўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне (юрыдычных фактаў); аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве); аб скаргах на натарыяльныя дзеянні або адмову ў іх здзяйсненні, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы;

трэція асобы;

пракурор, дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання і іншыя органы, якія звярнуліся ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Артыкул 55. Правы і абавязкі асоб, якія ўдзельнічаюць у справе

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права:

у парадку, устаноўленым судом, які разглядае эканамічныя справы, знаёміцца з матэрыяламі справы, рабіць выпіскі з іх, здымаць за свой кошт копіі гэтых матэрыялаў;

заяўляць адводы;

падаваць доказы, знаёміцца да пачатку судовага разбору з доказамі, прадстаўленымі іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, удзельнічаць у даследаванні доказаў;

з дазволу суда, які разглядае эканамічныя справы, задаваць пытанні іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе;

заяўляць хадайніцтвы, падаваць заявы;

даваць суду, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай і вуснай форме тлумачэнні;

прыводзіць свае доказы па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць у ходзе разгляду справы;

знаёміцца з хадайніцтвамі іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, пярэчыць супраць іх хадайніцтваў, доказаў;

атрымліваць копіі судовых пастаноў, якія прымаюцца ў выглядзе асобнага дакумента;

абскарджваць судовыя пастановы;

ведаць аб скаргах, пададзеных іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе;

ажыццяўляць іншыя працэсуальныя правы, дадзеныя ім гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права падаваць у суд, які разглядае эканамічныя справы, дакументы ў электронным выглядзе ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, павінны добрасумленна карыстацца ўсімі належнымі ім працэсуальнымі правамі, не дапускаючы злоўжывання імі.

Злоўжыванне працэсуальнымі правамі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, цягне за сабой для гэтых асоб наступствы, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, нясуць працэсуальныя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, або ўскладзеныя на іх судом, які разглядае эканамічныя справы, у адпаведнасці з указанымі заканадаўчымі актамі.

Невыкананне працэсуальных абавязкаў асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, цягне за сабой для гэтых асоб наступствы, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы.

Артыкул 56. Правы і абавязкі асоб, не прыцягнутых да ўдзелу ў справе, у дачыненні да праў і абавязкаў якіх суд, што разглядае эканамічныя справы, прыняў судовую пастанову

Асобы, не прыцягнутыя да ўдзелу ў справе, у дачыненні да праў і абавязкаў якіх суд, які разглядае эканамічныя справы, прыняў судовую пастанову, маюць права абскардзіць яго ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. З дня прыняцця адпаведным судом, які разглядае эканамічныя справы, да вядзення скаргі

(апеляцыйнай, касацыйнай, у парадку нагляду) або пратэсту гэтыя асобы карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам для асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 56[1]. Асаблівасці ажыццяўлення ўдзельнікамі гаспадарчага працэсу асобных праў па справах, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі

Азнаямленне з матэрыяламі спраў, якія ўтрымліваюць звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, выпіскі з іх, зняцце копій з матэрыялаў спраў, якія не ўтрымліваюць звестак, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, ажыццяўляюцца ўдзельнікамі гаспадарчага працэсу з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, абавязаны вызначыць месца і тэрмін азнаямлення ўдзельнікаў гаспадарчага працэсу з працэсуальнымі дакументамі або іх копіямі, якія ўтрымліваюць звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, і забяспечыць такое азнаямленне з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

Артыкул 57. Працэсуальная праваздольнасць і працэсуальная дзеяздольнасць

Здольнасць мець працэсуальныя правы і несці працэсуальныя абавязкі (працэсуальная праваздольнасць) прызнаецца ў роўнай меры за ўсімі юрыдычнымі асобамі, арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і грамадзянамі, якія валодаюць у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, правам на судовую абарону ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, сваіх праў і законных інтарэсаў.

Здольнасць сваімі дзеяннямі ажыццяўляць працэсуальныя правы і выконваць працэсуальныя абавязкі (працэсуальная дзеяздольнасць) у судзе, які разглядае эканамічныя справы, належыць юрыдычным асобам, арганізацыям, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальным прадпрымальнікам і грамадзянам.

Правы і законныя інтарэсы недзеяздольных грамадзян і грамадзян, абмежаваных судом у дзеяздольнасці, у судзе, які разглядае эканамічныя справы, абараняюць іх законныя прадстаўнікі.

Артыкул 58. Бакі

Бакамі ў гаспадарчым працэсе з'яўляюцца ісцец і адказчык.

Істцамі з'яўляюцца юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, – арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і грамадзяне, якія прад'явілі іск у мэтах абароны сваіх законных інтарэсаў або ў мэтах абароны інтарэсаў якіх іск прад'яўлены.

Адказчыкамі з'яўляюцца юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі і грамадзяне, да якіх прад'яўлены іск.

Бакі карыстаюцца роўнымі працэсуальнымі правамі.

Артыкул 59. Заяўнікі

Заяўнікамі з'яўляюцца юрыдычныя асобы, арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, індывідуальныя прадпрымальнікі і грамадзяне, якія падалі ў суд, які разглядае эканамічныя справы, заявы і (або) скаргі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі аб судаводстве ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, і ўвайшлі ў гаспадарчы працэс на падставе гэтых заяў і (або) скарг.

Заяўнікі карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі боку, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

Артыкул 60. Удзел у справе некалькіх істцоў або адказчыкаў

У судаводстве ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, магчымы працэсуальны саўдзел, калі іск можа быць прад'яўлены сумесна некалькімі істцамі або да некалькіх адказчыкаў.

Працэсуальны саўдзел магчымы, калі:

прадметам спрэчкі з'яўляюцца агульныя правы або абавязкі для асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

правы і абавязкі асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць агульныя фактычныя і прававыя падставы;

прадметам спрэчкі з'яўляюцца аднародныя правы і абавязкі асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, што маюць аднолькавыя фактычныя і прававыя падставы.

Пры ўдзеле ў справе некалькіх істцоў або адказчыкаў кожны ісцец або адказчык выступаюць у працэсе самастойна. Саўдзельнікі маюць права даручыць вядзенне справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, аднаму або некалькім саўдзельнікам.

Пры немагчымасці разгляду справы без удзелу іншага адказчыка суд, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі па хадайніцтве бакоў або са згоды істца прыцягвае да ўдзелу ў справе іншага адказчыка.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі па сваёй ініцыятыве прыцягвае да ўдзелу ў справе іншага адказчыка, калі яго абавязковы ўдзел прадугледжаны заканадаўчымі актамі або вынікае з сутнасці спрэчкі ці разглядаецца справа, якая вынікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін.

Пры прыцягненні іншага адказчыка да ўдзелу ў справе разгляд справы праводзіцца спачатку.

Аб адмове ў прыцягненні працэсуальнага саўдзельніка выносіцца прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 61. Замена неналежнага адказчыка

Калі пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору або падчас судовага разбору ў судзе першай інстанцыі выяўлена, што іск прад'яўлены не да той асобы, якая павінна адказваць па іску, суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права па хадайніцтве або са згоды істца дапусціць замену неналежнага адказчыка належным. Калі ісцец не згодзен на замену адказчыка, суд мае права са згоды істца прыцягнуць належнага адказчыка ў якасці другога адказчыка.

Пасля замены неналежнага адказчыка або ўваходжання ў справу другога адказчыка разгляд справы праводзіцца спачатку.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуды аб замене неналежнага адказчыка належным або аб прыцягненні належнага адказчыка ў якасці другога адказчыка.

Калі ісцец не згодзен на замену адказчыка або на прыцягненне належнага адказчыка ў якасці другога адказчыка, суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае справу па прад'яўленым іску.

Артыкул 62. Працэсуальнае правапераемства

У выпадку выбыцця боку са справы (рэарганізацыя юрыдычнай асобы, смерць індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна, уступка патрабавання, перавод доўгу і іншыя выпадкі перамены асоб у абавязацельствах) суд, які разглядае эканамічныя справы, змяняе гэты бок яго правапераемнікам па пісьмовым хадайніцтве правапераемніка, аднаго з бакоў. Правапераемства магчымае на любой стадыі гаспадарчага працэсу.

Пры прыпыненні вядзення па справе ў выпадку выбыцця боку са справы з надыходам правапераемства працэс аднаўляецца з таго працэсуальнага дзеяння, на якім ён быў прыпынены.

Для правапераемніка ўсе дзеянні, здзейсненыя ў працэсе да яго ўваходжання ў справу, абавязковыя ў той меры, у якой яны былі абавязковыя для боку, які правапераемнік замяніў.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб замене боку яго правапераемнікам або аб адмове ў такой замене могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 63. Змяненне падставы або прадмета іску, змяненне памеру іскавых патрабаванняў, адмова ад іску, прызнанне іску, міравое пагадненне

Пры разглядзе справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, ісцец мае права змяніць падставу або прадмет іску, павялічыць або зменшыць памер іскавых патрабаванняў шляхам падачы пісьмовай заявы.

Пры разглядзе справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай, касацыйнай або нагляднай інстанцыі да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы, ісцец мае права адмовіцца ад іску ў цэлым або яго часткі.

Адказчык мае права пры разглядзе справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай, касацыйнай або нагляднай інстанцыі прызнаць іск у цэлым або яго часткі.

На любой стадыі працэсу бакі могуць закончыць справу міравым пагадненнем у парадку, устаноўленым главой 10 гэтага Кодэкса.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, не прымае заяў аб змяншэнні памеру іскавых патрабаванняў, аб адмове істца ад іску, аб прызнанні іску адказчыкам і не зацвярджае міравога пагаднення бакоў, калі гэта супярэчыць заканадаўству або парушае правы іншых асоб. У гэтых выпадках суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае спрэчку па сутнасці.

Артыкул 64. Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі

Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, маюць права ўвайсці ў справу шляхам прад'яўлення іску да аднаго або абодвух бакоў.

Трэція асобы, якія заявілі самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі істца, за выключэннем абавязку прытрымлівання дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі з адказчыкам, калі гэта ўстаноўлена заканадаўчымі актамі для дадзенай катэгорыі спрэчак або дагаворам.

Калі трэцяя асоба, якая заявіла самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, увайшла ў справу пасля пачатку судовага разбору, разгляд справы па першай інстанцыі суда, які разглядае эканамічныя справы, праводзіцца спачатку.

Аб уваходжанні ў справу або аб адмове ва ўваходжанні ў справу трэцяй асобы, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 65. Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, могуць быць прыцягнуты судом, які разглядае эканамічныя справы, або ўвайсці ў справу на баку істца або адказчыка да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, калі гэта пастанова можа паўплываць на іх правы або абавязкі ў дачыненні да аднаго з бакоў.

Хадайніцтва аб допуску ў справу юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна ў якасці трэцяй асобы, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, можа зыходзіць адначасова ад гэтых асоб, а таксама ад істца або адказчыка, на баку якіх гэтыя асобы будуць выступаць.

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі

істца або адказчыка, на чыім баку яны выступаюць, за выключэннем праў на змяненне падставы або прадмета іску, павелічэнне або змяншэнне памеру іскавых патрабаванняў, адмову ад іску, прызнанне іску, заключэнне міравога пагаднення, прад'яўленне сустрэчнага іску, а таксама права патрабавання прымусовага выканання судовай пастановы.

Калі трэцяя асоба, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, увайшла ў справу пасля пачатку судовага разбору, разгляд справы па першай інстанцыі суда, які разглядае эканамічныя справы, праводзіцца спачатку.

Аб прыцягненні да ўдзелу ў справе або аб адмове ў прыцягненні да ўдзелу ў справе трэцяй асобы, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 66. Удзел у справе пракурора

Пракурор пры выяўленні парушэнняў заканадаўства ў межах сваёй кампетэнцыі прад'яўляе ў суд, які разглядае эканамічныя справы, іск (заяву) у мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, у тым ліку:

падае заяву аб аспрэчванні ненарматыўных прававых актаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, іншых органаў або службовых асоб, якімі закранаюцца правы і законныя інтарэсы юрыдычных асоб і грамадзян у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

прад'яўляе іск аб прызнанні несапраўднымі здзелак, заключаных дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, дзяржаўнымі ўнітарнымі прадпрыемствамі, дзяржаўнымі ўстановамі, а таксама юрыдычнымі асобамі, у статутным фондзе якіх ёсць доля дзяржаўнай уласнасці.

Пракурор пры выяўленні парушэнняў заканадаўства ў межах сваёй кампетэнцыі мае права прад'явіць у суд, які разглядае эканамічныя справы, іск (заяву) у мэтах абароны інтарэсаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых асоб з іх згоды.

Іск (заяву) накіроўваюць:

у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь – Генеральны пракурор, пракуроры абласцей, горада Мінска і іх намеснікі;

у іншыя суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, – Генеральны пракурор, пракуроры абласцей, горада Мінска і іх намеснікі, а таксама пракуроры раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённыя і прыраўнаваныя да іх транспартныя пракуроры і іх намеснікі.

Пракурор, які прад'явіў іск (заяву), карыстаецца працэсуальнымі правамі і нясе працэсуальныя абавязкі істца, за выключэннем права на заключэнне міравога пагаднення. Істцом (заяўнікам) у такім выпадку з'яўляецца асоба, у мэтах абароны інтарэсаў якой пракурорам прад'яўлены іск (заява). Калі іск (заява) прад'яўлены пракурорам у мэтах абароны дзяржаўных інтарэсаў, то істцом з'яўляюцца

Рэспубліка Беларусь або адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь у асобе адпаведных дзяржаўных органаў.

Адмова пракурора ад прад'яўленага ім іску (заявы) не пазбаўляе істца (заяўніка) права патрабаваць разгляду справы па сутнасці.

Прынятая судом, які разглядае эканамічныя справы, адмова істца ад іску (заявы), які быў прад'яўлены ў мэтах абароны яго інтарэсаў пракурорам, цягне за сабой спыненне вядзення па справе.

Адмова істца (заяўніка) ад іску (заявы), заключэнне міравога пагаднення па іску, прад'яўленым пракурорам у мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, не цягнуць за сабой спынення вядзення па справе.

Удзел пракурора ў разглядзе справы, узбуджанай па яго іску (заяве), абавязковы.

Артыкул 67. Удзел у справе дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання і іншых органаў

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання і іншыя органы маюць права прад'явіць іск (заяву, скаргу) у суд, які разглядае эканамічныя справы, у мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, а таксама ў мэтах абароны інтарэсаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых асоб з іх згоды.

Орган, які падаў іскавую заяву (заяву, скаргу), карыстаецца працэсуальнымі правамі і нясе працэсуальныя абавязкі істца, за выключэннем права на заключэнне міравога пагаднення.

Адмова органа ад прад'яўленага ім іску (заявы, скаргі) не пазбаўляе істца (заяўніка) права патрабаваць разгляду справы па сутнасці.

Адмова істца (заяўніка) ад іску (заявы, скаргі), які быў прад'яўлены ў мэтах абароны яго інтарэсаў, цягне за сабой спыненне вядзення па справе.

Артыкул 68. Іншыя ўдзельнікі гаспадарчага працэсу

Апрача асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, у гаспадарчым працэсе могуць удзельнічаць асобы, якія садзейнічаюць ажыццяўленню правасуддзя, – эксперты, спецыялісты, сведкі, дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, перакладчыкі, панятыя.

Артыкул 69. Прысяга экспертаў, спецыялістаў, сведак

Эксперты, спецыялісты, сведкі прыносяць прысягу наступнага зместу:

«Разумеючы значэнне маіх паказанняў для высвятлення ісціны і ўлічваючы адказнасць перад законам, клянуся праўдзіва паведаміць суду аб усіх вядомых мне фактах па справе».

Тэкст прысягі падпісваецца экспертамі, спецыялістамі, сведкамі і захоўваецца ў справе.

Артыкул 70. Эксперт

Экспертам у судзе, які разглядае эканамічныя справы, можа выступаць асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў галіне навукі, мастацтва, тэхнікі або рамяства, неабходнымі для дачы заключэння, надзеленая ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, паўнамоцтвамі на правядзенне экспертызы і прызначаная судом, які разглядае эканамічныя справы, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Асоба, прызначаная экспертам, абавязана прыбыць на выклік суда, які разглядае эканамічныя справы, і даць аб'ектыўнае заключэнне аб пастаўленых пытаннях.

Калі пададзеных матэрыялаў недастаткова для падрыхтоўкі заключэння або пастаўленыя пытанні выходзяць за межы спецыяльных пазнанняў эксперта, ён абавязаны паведаміць суду, які разглядае эканамічныя справы, аб немагчымасці даць заключэнне.

Эксперт мае права адмовіцца ад дачы заключэння, калі пададзеныя яму матэрыялы недастатковыя або ён не валодае ведамі, неабходнымі для выканання ўскладзеных на яго абавязкаў.

Эксперт, калі гэта неабходна для дачы заключэння, мае права:

знаёміцца з матэрыяламі справы, якія адносяцца да прадмета экспертызы;

заяўляць хадайніцтвы аб выдачы яму дадатковых матэрыялаў для дачы заключэння;

удзельнічаць у судовых пасяджэннях суда, які разглядае эканамічныя справы, задаваць пытанні, што адносяцца да прадмета экспертызы, якая ім праводзіцца.

Хадайніцтвы эксперта аб выдачы яму дадатковых матэрыялаў для дачы заключэння разглядаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, без выкліку бакоў з вынясеннем прысуду ў тэрмін не пазней за пяць дзён з дня паступлення хадайніцтваў у суд.

Эксперт, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, якія ўтрымліваюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

За адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, а таксама за дачу яўна лжывага заключэння эксперт нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 71. Спецыяліст

Спецыялістам у судзе, які разглядае эканамічныя справы, можа выступаць асоба, якая валодае неабходнымі ведамі па адпаведнай спецыяльнасці і дае кансультацыі аб пытаннях, якія маюць значэнне для разгляду справы.

Асоба, выкліканая судом, які разглядае эканамічныя справы, у якасці спецыяліста, абавязана прыбыць у суд, адказваць на пастаўленыя пытанні, даваць тлумачэнні і кансультацыі, у тым ліку ў пісьмовай форме.

Выклік судом, які разглядае эканамічныя справы, спецыяліста, накладае на кіраўніка арганізацыі, дзе працуе спецыяліст, на індывідуальнага прадпрымальніка, у якога працуе спецыяліст, абавязак забяспечыць яму магчымасць прыбыць у суд, які разглядае эканамічныя справы, для выканання свайго абавязку.

Спецыяліст мае права з дазволу суда, які разглядае эканамічныя справы, знаёміцца з матэрыяламі справы, заяўляць хадайніцтвы аб выдачы яму дадатковых звестак і матэрыялаў, атрымліваць узнагароджанне за дачу кансультацый, атрымліваць пакрыццё выдаткаў, звязаных з яўкай у суд, які разглядае эканамічныя справы.

Спецыяліст мае права адмовіцца ад дачы кансультацый, калі пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў або пададзеныя яму матэрыялы недастатковыя для дачы кансультацый.

Спецыяліст, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, якія ўтрымліваюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Артыкул 72. Сведка

Сведкам можа быць асоба, якой вядомыя звесткі аб абставінах, што маюць значэнне для правільнага разгляду справы судом, які разглядае эканамічныя справы.

Звесткі, паведамленыя сведкам, не з'яўляюцца доказамі, калі сведка не можа ўказаць крыніцу свайго ведання.

Асоба, якая хадайнічае аб выкліку сведкі, абавязана паведаміць яго прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і месца жыхарства.

Асоба, выкліканая ў якасці сведкі, абавязана прыбыць у суд, які разглядае эканамічныя справы, у прызначаны час і паведаміць вядомыя ёй звесткі аб абставінах справы.

Сведка абавязаны даваць праўдзівыя паказанні, адказваць на пытанні суда, які разглядае эканамічныя справы (суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы), і асоб, якія ўдзельнічаюць у працэсе.

За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў, а таксама за дачу яўна лжывых паказанняў сведка нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Сведкамі не могуць быць:

прадстаўнікі па грамадзянскай і гаспадарчай справе і асобы, якія выконваюць абавязкі абаронцаў па крымінальнай справе, – у дачыненні да фактаў, якія сталі ім вядомыя ў сувязі з выкананнем абавязкаў прадстаўніка або абаронцы;

прадстаўнікі бакоў, якія ўдзельнічалі ў прымірэнчай працэдуры, медыяцыі, прыміральнікі і медыятары – у дачыненні да фактаў, якія сталі ім вядомыя ў сувязі з удзелам у прымірэнчай працэдуры, медыяцыі, за выключэннем выпадкаў, калі бакі далі на гэта сваю пісьмовую згоду;

свяшчэннаслужыцелі – у дачыненні да фактаў, звесткі аб якіх яны атрымалі падчас споведзі;

асобы, якія з прычыны фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факты або ўзнаўляць звесткі аб фактах і даваць аб іх паказанні;

іншыя асобы – у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Ніхто не павінен прымушацца да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям'і, блізкіх сваякоў.

Артыкул 73. Дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права прыцягнуць да ўдзелу ў гаспадарчым працэсе кампетэнтны дзяржаўны орган, орган мясцовага кіравання і самакіравання і (або) іншы орган для дачы заключэння па пытаннях, якія адносяцца да сферы дзейнасці гэтага дзяржаўнага або іншага органа.

Прыцягнуты да ўдзелу ў гаспадарчым працэсе дзяржаўны орган, орган мясцовага кіравання і самакіравання і (або) іншы орган накіроўваюць у суд, які разглядае эканамічныя справы, сваіх прадстаўнікоў, якія дзейнічаюць па іх даручэнні і ад іх імя і абавязаны валодаць належнай кампетэнтнасцю ў сферы дзейнасці органаў, якія накіравалі іх.

Прадстаўнік дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання або іншага органа абавязаны прыбыць у суд, які разглядае эканамічныя справы, і паведаміць суду і асобам, што ўдзельнічаюць у справе, дакладныя звесткі, якія адносяцца да сферы дзейнасці органа, што накіраваў яго, і адказваць на іх пытанні.

Артыкул 74. Перакладчык

Перакладчыкам з'яўляецца асоба, якая валодае мовамі, веданне якіх неабходна для пісьмовага або вуснага перакладу, і прыцягненая судом у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Удзельнікі гаспадарчага працэсу не маюць права прымаць на сябе абавязкі перакладчыка, хаця б яны і валодалі неабходнымі для перакладу мовамі.

Удзельнікі гаспадарчага працэсу маюць права прапанаваць суду, які разглядае эканамічныя справы, кандыдатуру перакладчыка.

Перакладчык абавязаны прыбыць на выклік суда, які разглядае эканамічныя справы, дакладна і поўна выканаць даручаны пераклад, пацвердзіць дакладнасць перакладу сваім подпісам у пратаколе судовага пасяджэння або на перакладзеным дакуменце, адмовіцца ад удзелу ў вядзенні па справе, калі ён не валодае ведамі, неабходнымі для перакладу.

Перакладчык мае права задаваць пытанні ўдзельнікам гаспадарчага працэсу, якія прысутнічаюць пры перакладзе, у мэтах удакладнення сэнсу слоў і выразаў, якія перакладаюцца, знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння, у якім ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі, якія падлягаюць занясенню ў пратакол.

Перакладчык, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, якія ўтрымліваюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

За адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, а таксама за зроблены заведама няправільны пераклад у судзе перакладчык нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 75. Паняты

У якасці панятых запрашаюцца не менш за дзве асобы, не зацікаўленыя ў зыходзе справы, для пасведчання ходу і вынікаў працэсуальнага дзеяння ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Паняты мае права:

рабіць наконт працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, заявы і заўвагі, якія падлягаюць занясенню ў пратакол;

знаёміцца з пратаколам працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, і патрабаваць унясення ў яго выпраўленняў і дапаўненняў.

Паняты абавязаны:

прымаць удзел у працэсуальным дзеянні;

сведчыць сваім подпісам у пратаколе працэсуальнага дзеяння факт здзяйснення гэтага дзеяння, яго ход і вынікі.

Паняты можа быць дапытаны ў якасці сведкі аб абставінах, звязаных са здзяйсненнем працэсуальнага дзеяння, удзельнікам якога ён быў.

Панятымі не могуць быць:

асобы, якія не дасягнулі паўналецця;

асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

асобы, якія з прычыны фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факт здзяйснення працэсуальнага дзеяння, яго ход і вынікі;

работнікі суда, праваахоўных або кантрольных органаў.

ГЛАВА 7
ПРАДСТАЎНІЦТВА Ў СУДЗЕ, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ

Артыкул 76. Прадстаўнікі

Юрыдычныя асобы вядуць свае справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, праз свае органы, якія дзейнічаюць у адпаведнасці з заканадаўчымі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, а таксама ўстаноўчымі дакументамі.

Прадстаўляць інтарэсы юрыдычнай асобы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, мае права адвакат, кіраўнік або работнік юрыдычнай асобы па справах гэтай асобы, іншыя асобы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Ад імя юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, у судзе, які разглядае эканамічныя справы, выступае ўпаўнаважаны прадстаўнік ліквідацыйнай камісіі.

Індывідуальны прадпрымальнік і грамадзянін мае права весці свае справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, асабіста або праз прадстаўніка. Асабісты ўдзел у справе індывідуальнага прадпрымальніка і грамадзяніна не пазбаўляе іх права мець па справе прадстаўніка. Прадстаўнікамі індывідуальнага прадпрымальніка і грамадзяніна могуць быць адвакаты, законныя прадстаўнікі, блізкія сваякі, муж (жонка), іншыя асобы, якія ажыццяўляюць прадстаўніцтва ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

У судзе, які разглядае эканамічныя справы, справы Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь вядуць упаўнаважаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку прадстаўнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання і грамадзяне.

Артыкул 77. Асобы, якія могуць быць прадстаўнікамі ў судзе, што разглядае эканамічныя справы

Прадстаўніком у судзе, які разглядае эканамічныя справы, можа быць дзеяздольная фізічная асоба, якая мае належным чынам афармленыя паўнамоцтвы на вядзенне справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Правы і законныя інтарэсы грамадзян, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю на момант разгляду справы, абараняюць у гаспадарчым працэсе іх законныя прадстаўнікі, якім гэта права дадзена заканадаўчымі актамі. Законныя прадстаўнікі могуць даручыць вядзенне справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, іншаму прызначанаму імі прадстаўніку.

Артыкул 78. Афармленне паўнамоцтваў прадстаўніка

Прадстаўнікі дапускаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, да ўдзелу ў справе толькі пры наяўнасці адпаведных паўнамоцтваў.

Даверанасць, выдадзеная прадстаўніку, павінна быць падпісана асобай, правамоцнай выдаваць такія даверанасці, і афармлена ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Даверанасць, выдадзеная прадстаўніку індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам, павінна быць засведчана ў натарыяльным парадку або:

кіраўніком юрыдычнай асобы, дзе працуе або вучыцца прадстаўленая асоба;

арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) якая аказвае жыллёва-камунальныя паслугі, па месцы жыхарства прадстаўленай асобы;

установай сацыяльнай абароны насельніцтва;

бальніцай або іншай стацыянарнай лячэбна-прафілактычнай установай, у якой прадстаўленая асоба знаходзіцца на лячэнні;

камандзірам адпаведнай воінскай часці, калі даверанасць выдаецца ваеннаслужачым, работнікам гэтых часцей або членам іх сямей.

Даверанасць, выдадзеная прадстаўніку асобай, якая знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі, сведчыцца адміністрацыяй адпаведнай папраўчай установы.

Паўнамоцтвы адваката сведчацца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Законныя прадстаўнікі падаюць у суд, які разглядае эканамічныя справы, дакументы, што пацвярджаюць іх права прадстаўляць інтарэсы падапечных.

Артыкул 79. Паўнамоцтвы прадстаўніка

Прадстаўнік мае права афармляць ад імя асобы, якую прадстаўляе, усе працэсуальныя дзеянні, за выключэннем:

падпісання іскавай заявы і водгуку на іскавую заяву;

падпісання заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення, водгуку на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення і заявы аб адмене прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе;

перадачы справы ў міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган;

поўнай або частковай адмовы ад іскавых патрабаванняў, змяншэння іх памеру;

змянення прадмета або падставы іску;

прызнання іску;

прыняцця мер для забеспячэння іску і адмовы ад прыняцця гэтых мер;

заключэння міравога пагаднення;

перадачы сваіх паўнамоцтваў іншай асобе (перадавер'е);

абскарджання судовай пастановы;

прад'яўлення патрабавання аб прымусовым выкананні судовай пастановы;

падпісання скаргі, якая падаецца ў парадку нагляду;

атрымання прысуджаных маёмасці або грашовых сродкаў;

удзелу ў прымірэнчай працэдуры, заключэння пагаднення аб прымірэнні, пагаднення аб прымяненні медыяцыі, медыятыўнага пагаднення;

падачы хадайніцтва аб разглядзе справы ў парадку іскавага вядзення ў выпадку адмовы ў вынясенні прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе;

падпісання заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння;

падпісання хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Паўнамоцтвы прадстаўніка на здзяйсненне дзеянняў, прадугледжаных абзацамі другім – васямнаццатым часткі першай гэтага артыкула, павінны быць спецыяльна прадугледжаны ў даверанасці, выдадзенай прадстаўленай асобай.

Прадстаўнік, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, якія ўтрымліваюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Артыкул 80. Асобы, якія не могуць быць прадстаўнікамі ў судзе, што разглядае эканамічныя справы

Прадстаўнікамі ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, не могуць быць:

асобы, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю або знаходзяцца пад апекай або папячыцельствам;

суддзі, следчыя, пракуроры, работнікі апарата суда, які разглядае эканамічныя справы, за выключэннем выпадкаў, калі ўказаныя асобы выступаюць у гаспадарчым працэсе ў якасці ўпаўнаважаных адпаведных судоў, пракуратуры або законных прадстаўнікоў;

іншыя асобы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі.

Артыкул 81. Парадак праверкі паўнамоцтваў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, абавязаны праверыць паўнамоцтвы асоб, што з'явіліся ў суд і ўдзельнічаюць у справе, і іх прадстаўнікоў.

Паўнамоцтвы правярае суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы (старшынствуючы на судовым пасяджэнні), шляхам вывучэння прад'яўленых суду дакументаў, што пацвярджаюць паўнамоцтвы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іх прадстаўнікоў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, на падставе даследавання дакументаў, прад'яўленых суду, вырашае пытанне аб прызнанні паўнамоцтваў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іх прадстаўнікоў і допуску іх да ўдзелу ў судовым пасяджэнні.

Дакументы, што пацвярджаюць паўнамоцтвы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іх прадстаўнікоў, пры неабходнасці дадаюцца да справы або звесткі з гэтых дакументаў заносяцца ў пратакол.

У выпадку непадачы асобай, якая ўдзельнічае ў справе, яго прадстаўніком неабходных дакументаў або падачы дакументаў, якія не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў прызнанні паўнамоцтваў адпаведнай асобы на ўдзел у справе, аб чым робіцца запіс у пратаколе судовага пасяджэння або выносіцца асобны прысуд.

Артыкул 82. Дакументы, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы

Індывідуальны прадпрымальнік, які асабіста ажыццяўляе свае паўнамоцтвы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, прад'яўляе суду пасведчанне аб рэгістрацыі яго ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка (натарыяльна завераную яго копію), а таксама свой пашпарт.

Кіраўнік юрыдычнай асобы прад'яўляе суду дакумент, які пацвярджае статус кіраўніка, а таксама свой пашпарт або пасведчанне.

Работнік юрыдычнай асобы або іншая асоба, якой даручана прадстаўляць інтарэсы юрыдычнай асобы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, падаюць суду даверанасць юрыдычнай асобы або іншы дакумент, які сведчыць такія паўнамоцтвы, а таксама прад'яўляюць свае пашпарты або пасведчанні.

Адвакат прад'яўляе суду пасведчанне адваката і даверанасць.

Іншыя ўдзельнікі гаспадарчага працэсу і іх прадстаўнікі падаюць суду, які разглядае эканамічныя справы, дакументы, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы на ўдзел у працэсе, у адпаведнасці з актамі заканадаўства.

ГЛАВА 8
ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ АБСТАВІН ПА СПРАВЕ

Артыкул 83. Доказы па справе і сродкі даказвання

Доказамі па справе з'яўляюцца атрыманыя ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі звесткі, на падставе якіх суд, які разглядае эканамічныя справы, выяўляе наяўнасць або адсутнасць абставін, якія абгрунтоўваюць патрабаванні і пярэчанні асоб, якія бяруць удзел у справе, а таксама іншых абставін, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

Да сродкаў даказвання адносяцца:

пісьмовыя і рэчавыя доказы;

гука- і відэазапісы;

тлумачэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

кансультацыі спецыялістаў;

заключэнні экспертаў;

паказанні сведкаў;

заключэнні дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

іншыя дакументы і матэрыялы.

У якасці доказаў дапускаюцца тлумачэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншых удзельнікаў гаспадарчага працэсу, атрыманыя шляхам выкарыстання сістэм відэа-канферэнц-сувязі.

Звесткі, атрыманыя з парушэннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, не з'яўляюцца доказамі і не маюць юрыдычнай сілы.

Калі бакі, якія ўдзельнічалі ў прымірэнчай працэдуры, пісьмова не дамовіліся аб іншым, бакі і іншыя асобы, якія прысутнічалі пры правядзенні прымірэнчай працэдуры, не маюць права спасылацца ў судовым разборы на:

прапанову аднаго з бакоў звярнуцца да прыміральніка або той факт, што адзін з бакоў выказаў гатоўнасць да ўдзелу ў прымірэнчай працэдуры;

меркаванні або прапановы, выказаныя адным з удзельнікаў прымірэнчай працэдуры ў дачыненні да магчымага прымірэння;

прызнанні, зробленыя адным з бакоў у ходзе прымірэнчай працэдуры;

праяву гатоўнасці адным з бакоў прыняць прапанову аб прымірэнні, зробленую іншым бокам;

звесткі, якія ўтрымліваюцца ў дакуменце, падрыхтаваным выключна для мэт прымірэнчай працэдуры.

Артыкул 84. Пісьмовыя доказы

Пісьмовымі доказамі з'яўляюцца акты, дагаворы, даведкі, таварна-транспартныя накладныя, дзелавая карэспандэнцыя, агульнадаступная інфармацыя, запісаная літарамі або выкананая ў форме лічбавага, графічнага запісу, размешчаная ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, атрыманая ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, іншыя дакументы і матэрыялы, якія змяшчаюць звесткі аб абставінах, што маюць значэнне для справы, у тым ліку выкананыя ў форме лічбавага, графічнага запісу, атрыманыя пры дапамозе факсімільнай, электроннай ці іншай сувязі або іншым спосабам, які дазваляе выявіць дакладнасць дакумента.

Дакументы, атрыманыя пры дапамозе факсімільнай, электроннай або іншай сувязі, у тым ліку з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, а таксама дакументы, падпісаныя электронным лічбавым подпісам або іншым аналагам уласнаручнага подпісу, дапускаюцца ў якасці пісьмовых доказаў з выкананнем патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам, іншым заканадаўствам або дагаворам, да дадзенага віду доказаў.

Калі копіі дакументаў пададзены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у электронным выглядзе, суд можа запатрабаваць падаць арыгіналы гэтых дакументаў.

Дакументы, якія падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым для гэтага віду дакументаў.

Пісьмовыя доказы, выкананыя поўнасцю або часткова на замежнай мове, павінны суправаджацца належным чынам завераным перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

Пісьмовыя доказы падаюцца ў арыгінале або ў форме належным чынам заверанай яго копіі. Калі да справы, якая разглядаецца, мае дачыненне толькі частка дакумента, падаецца завераная выпіска з яго.

Арыгінальныя дакументы падаюцца, калі абставіны справы ў адпаведнасці з заканадаўствам падлягаюць пацвярджэнню толькі такімі дакументамі, а таксама ў іншых выпадках на патрабаванне суда, які разглядае эканамічныя справы.

Пісьмовыя доказы падаюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама могуць быць выпатрабаваны па ініцыятыве суда, які разглядае эканамічныя справы.

Копіі пісьмовых доказаў, пададзеных у суд, які разглядае эканамічныя справы, асобай, якая ўдзельнічае ў справе, накіроўваюцца (уручаюцца) гэтай асобай іншым асобам, што ўдзельнічаюць у справе, у якіх яны адсутнічаюць.

Артыкул 85. Вяртанне арыгінальных дакументаў

Арыгінальныя дакументы, якія ёсць у справе, па хадайніцтве асоб, якія іх падалі, могуць быць ім вернуты пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы, а калі суд, які разглядае эканамічныя справы, прыйдзе да высновы, што задавальненне такога хадайніцтва магчымае без урону для правільнага вырашэння спрэчкі, – у працэсе вядзення па справе. Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права абавязаць асобу, якая хадайнічае аб вяртанні гэтага дакумента, падаць яго копію.

Артыкул 86. Рэчыўныя доказы

Рэчыўнымі доказамі з'яўляюцца прадметы, якія сваім знешнім выглядам, унутранымі ўласцівасцямі, месцам знаходжання або іншымі прыкметамі могуць служыць сродкам высвятлення абставін, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

Аб далучэнні рэчыўных доказаў да справы суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Артыкул 87. Захоўванне рэчыўных доказаў

Рэчыўныя доказы захоўваюцца ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, у справе або асобна ад яе.

Рэчыўныя доказы, якія з прычыны іх грувасткасці або іншых аб'ектыўных прычын не могуць быць дастаўлены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, пакідаюцца ў іх месцы знаходжання і перадаюцца на захоўванне фактычным уладальнікам або іншым асобам.

Усе рэчыўныя доказы павінны быць падрабязна апісаны ў пратаколе агляду, апячатаны, а пры неабходнасці – зафіксаваны на фота- ці відэаплёнцы.

Выдаткі на захоўванне рэчыўных доказаў размяркоўваюцца паміж бакамі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, і захавальнік прымаюць меры да захавання рэчыўных доказаў у нязменным стане.

Асобы, якія не забяспечылі захаванне рэчыўных доказаў, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

Артыкул 88. Агляд, даследаванне рэчыўных доказаў, якія хутка псуюцца, і распараджэнне імі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, неадкладна аглядае і даследуе рэчыўныя доказы, якія хутка псуюцца, , у іх месцы знаходжання ў парадку, устаноўленым артыкулам 102 гэтага Кодэкса. Пасля агляду гэтыя рэчыўныя доказы падлягаюць вяртанню асобе, якая падала іх, або асобам, за якімі суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаў права на гэтыя прадметы. Калі вяртанне рэчыўных доказаў, што хутка псуюцца, немагчымае, яны здаюцца ў адпаведныя ўстановы для выкарыстання паводле прызначэння або ўтылізацыі ці рэалізуюцца ў парадку, які ўстанаўлівае суд, што разглядае эканамічныя справы.

Агляд і даследаванне рэчыўных доказаў, якія хутка псуюцца, праводзяцца судом, які разглядае эканамічныя справы, з паведамленнем асобам, якія ўдзельнічаюць у справе. Няяўка апавешчаных належным чынам асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае правядзенню агляду і даследавання.

Артыкул 89. Распараджэнне рэчыўнымі доказамі, якія знаходзяцца ў судзе

Рэчыўныя доказы пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы, вяртаюцца асобам, ад якіх яны былі атрыманы, або перадаюцца асобам, за якімі суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаў права на гэтыя прадметы, або рэалізуюцца, або здаюцца ў адпаведныя ўстановы для выкарыстання паводле прызначэння або ўтылізацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца заканадаўствам.

Рэчыўныя доказы пасля іх агляду і даследавання судом, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве асоб, ад якіх яны былі атрыманы, могуць быць ім вернуты ў працэсе вядзення па справе, калі суд, які разглядае эканамічныя справы, прыйдзе да высновы, што задавальненне такога хадайніцтва магчымае без урону для разгляду справы.

Прадметы, якія адносяцца да рэчыўных доказаў і ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі не могуць знаходзіцца ў валоданні пэўных асоб, перадаюцца ва ўстаноўленым парадку адпаведным арганізацыям.

Аб распараджэнні рэчыўнымі доказамі суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Артыкул 90. Гука- і відэазапіс

Асобы, якія падаюць гука- і відэазапіс на электронных або іншых носьбітах ці хадайнічаюць аб іх выпатрабаванні, абавязаны ўказаць, калі, кім і ў якіх умовах ажыццяўляўся запіс.

Носьбіты гука- і відэазапісу захоўваюцца ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, пры справе. Суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае меры да захавання іх у нязменным стане.

Не дапускаецца выкарыстанне ў якасці доказаў гука- і відэазапісу, атрыманага скрытым шляхам, за выключэннем выпадкаў, калі такі запіс дапускаецца заканадаўствам.

У выключных выпадках пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы, носьбіты гука- і відэазапісу могуць быць вернуты асобе, ад якой яны атрыманы.

Аб вяртанні носьбітаў гука- і відэазапісу суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Артыкул 90[1]. Іншыя дакументы і матэрыялы

Іншыя дакументы і матэрыялы дапускаюцца ў якасці доказаў, калі ўтрымліваюць звесткі аб абставінах, якія маюць значэнне для правільнага разгляду справы, і атрыманы, выпатрабаваны або пададзены ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 91. Тлумачэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе

Тлумачэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, аб вядомых ім абставінах, што маюць значэнне для справы, падлягаюць праверцы і ацэнцы нароўні з іншымі доказамі. Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права лічыць высветленымі абставіны, якія маюць значэнне для справы, на падставе звестак, што паведамляюцца адным бокам, калі іншы бок утрымлівае ў сябе доказы і не падае іх на патрабаванні суда, які разглядае эканамічныя справы.

На прапанову суда, які разглядае эканамічныя справы, асоба, якая ўдзельнічае ў справе, выказвае свае тлумачэнні ў пісьмовай форме.

Прызнанне адным бокам абставін, на якіх іншы бок грунтуе свае патрабаванні або пярэчанні, вызваляе іншы бок ад абавязку далейшага іх даказвання. Аб прызнанні абставін робіцца запіс у пратаколе судовага пасяджэння. Калі прызнанне абставін выказана ў пісьмовай заяве, яна дадаецца да матэрыялаў справы.

Прызнанне асобай, якая ўдзельнічае ў справе, фактаў, якімі іншая асоба абгрунтоўвае свае патрабаванні або пярэчанні, для суда, які разглядае эканамічныя справы, не з'яўляецца абавязковым.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права лічыць прызнаны факт высветленым, калі ў яго няма сумненняў, што прызнанне факта адпавядае абставінам справы і не здзейснена пад уплывам падману, насілля, пагрозы, памылкі або ў мэтах скрывання ісціны.

Артыкул 92. Прызначэнне экспертызы

Для растлумачэння пытанняў, якія ўзнікаюць пры разглядзе справы і патрабуюць спецыяльных ведаў, па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або па сваёй ініцыятыве суд, які разглядае эканамічныя справы, прызначае экспертызу.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права падаць у суд, які разглядае эканамічныя справы, пытанні, якія павінны быць растлумачаны пры правядзенні экспертызы.

Канчатковы пералік пытанняў, па якіх павінна быць праведзена экспертыза, устанаўлівае суд, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуды аб прызначэнні экспертызы або аб адхіленні хадайніцтва аб яе прызначэнні.

Прысуд аб прызначэнні экспертызы і неабходныя матэрыялы суд, які разглядае эканамічныя справы, накіроўвае эксперту або ў экспертную ўстанову.

Калі бок па справе адмаўляецца ад удзелу ў правядзенні экспертызы або стварае перашкоды яе правядзенню (не з'яўляецца на экспертызу, не падае экспертам неабходных прадметаў даследавання і да т. п.), а з-за абставін справы без удзелу гэтага боку або без пададзеных ім прадметаў даследавання экспертызу правесці немагчыма, суд, які разглядае эканамічныя справы, у залежнасці ад таго, які з бакоў адхіляецца ад экспертызы і якое значэнне для яго яна мае, мае права прызнаць факт, для высвятлення якога экспертыза прызначалася, устаноўленым або абвергнутым.

Артыкул 93. Парадак правядзення экспертызы

Экспертызу праводзяць спецыялісты экспертнай установы па даручэнні кіраўніка ўстановы або іншыя асобы, якім яна даручана судом, што разглядае эканамічныя справы. Экспертызу праводзіць адзін або некалькі экспертаў.

Экспертыза можа праводзіцца на судовым пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, або па-за пасяджэннем, калі гэта неабходна з-за характару даследаванняў або пры немагчымасці ці цяжкасці дастаўкі на судовае пасяджэнне матэрыялаў для даследавання. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права прысутнічаць пры правядзенні экспертызы, за выключэннем выпадкаў, калі такая прысутнасць па-за судовым пасяджэннем можа перашкодзіць нармальнай працы экспертаў.

Пры атрыманні экспертнай установай прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прызначэнні экспертызы кіраўнік гэтай установы даручае яе правядзенне аднаму або некалькім работнікам, растлумачвае ім правы і абавязкі экспертаў, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, папярэджвае аб крымінальнай адказнасці за дачу яўна лжывага заключэння, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў, што сведчыцца подпісамі экспертаў.

Пры правядзенні экспертызы па-за экспертнай установай эксперт запрашаецца на судовае пасяджэнне, дзе суд, які разглядае эканамічныя справы, сведчыць яго асобу, спецыяльнасць, высвятляе, ці няма падстаў для яго адводу, растлумачвае эксперту яго правы і абавязкі і пад распіску папярэджвае яго аб крымінальнай адказнасці за дачу яўна лжывага заключэння, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў.

Артыкул 94. Заключэнне эксперта

Заключэнне эксперта выкладаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца экспертам (экспертамі), якому было даручана правядзенне экспертызы.

У заключэнні эксперта павінны быць указаны:

час і месца правядзення экспертызы;

асоба (прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, адукацыя, спецыяльнасць, займаная пасада), якая праводзіла экспертызу;

падставы правядзення экспертызы;

узоры і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца экспертам;

падрабязнае апісанне праведзеных даследаванняў, пытанні, пастаўленыя судом, які разглядае эканамічныя справы, перад экспертам, матываваныя адказы на іх;

высновы па выніках правядзення экспертызы.

Калі пры правядзенні экспертызы эксперт выявіць абставіны, якія маюць значэнне для справы і аб якіх яму не былі пастаўлены пытанні, ён мае права ўключыць высновы аб гэтых абставінах у сваё заключэнне.

Заключэнне эксперта даследуецца на судовым пасяджэнні і ацэньваецца нароўні з іншымі доказамі.

Заключэнне эксперта чытаецца ўголас на судовым пасяджэнні. Па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, або па ініцыятыве суда, які разглядае эканамічныя справы, эксперт можа быць выкліканы на судовае пасяджэнне.

Эксперт, які з'явіўся на судовае пасяджэнне, пасля абвяшчэння яго заключэння абавязаны даць аб ім неабходныя тлумачэнні, а таксама адказаць на пытанні суда, які разглядае эканамічныя справы, і асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Адказы эксперта на пытанні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 95. Дадатковая і паўторная экспертыза

У выпадку недастатковай яснасці або непаўнаты заключэння эксперта суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права прызначыць дадатковую экспертызу, якую праводзіць той або іншы эксперт.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права прызначыць паўторную экспертызу, якую праводзіць іншы эксперт. Паўторная экспертыза праводзіцца ў выпадках, калі заключэнне эксперта, які праводзіў першапачатковую экспертызу, недастаткова абгрунтавана, яго высновы выклікаюць сумненні, пададзеныя эксперту матэрыялы прызнаны недакладнымі або маюцца супярэчнасці паміж заключэннямі некалькіх экспертаў, а таксама калі былі парушаны правілы правядзення экспертызы.

Артыкул 96. Комплексная і камісійная экспертыза

Комплексная экспертыза прызначаецца, калі зрабіць якую-небудзь выснову, што мае значэнне для справы, можна толькі шляхам правядзення некалькіх даследаванняў з выкарыстаннем розных галін ведаў або розных навуковых дысцыплін у межах адной галіны ведаў.

Комплексная экспертыза праводзіцца не менш чым двума экспертамі розных спецыяльнасцей.

Кожны эксперт праводзіць даследаванне самастойна, нясе за яго адказнасць і дае заключэнне ў межах сваёй кампетэнцыі.

У заключэнні экспертаў указваецца, якія даследаванні і ў якім аб'ёме правёў кожны эксперт, якія факты ён выявіў і да якіх высноў прыйшоў. Кожны эксперт, які ўдзельнічаў у правядзенні комплекснай экспертызы, падпісвае тую частку заключэння, якая ўтрымлівае апісанне праведзеных ім даследаванняў, і нясе за яе адказнасць.

Эксперт не мае права падпісваць тую частку заключэння комплекснай экспертызы, якая не адносіцца да яго кампетэнцыі.

Агульную выснову робяць эксперты, кампетэнтныя ў ацэнцы атрыманых вынікаў і фармуляванні высновы. У выпадку ўзнікнення рознагалоссяў паміж экспертамі кожны з іх дае асобнае заключэнне аб пытаннях, якія выклікалі рознагалоссе.

Складаныя экспертызы могуць праводзіць камісіі экспертаў адной спецыяльнасці.

Калі па выніках праведзеных даследаванняў меркаванні экспертаў аб пастаўленых пытаннях супадаюць, эксперты складаюць адзінае заключэнне. У выпадку ўзнікнення рознагалоссяў кожны з экспертаў, якія ўдзельнічалі ў правядзенні камісійнай экспертызы, дае асобнае заключэнне аб пытаннях, якія выклікалі рознагалоссі.

Артыкул 96[1]. Кансультацыі спецыяліста

Для атрымання кансультацый аб пытаннях, якія патрабуюць спецыяльных ведаў і маюць значэнне для разгляду справы, суд, які разглядае эканамічныя справы, можа прыцягваць спецыяліста.

Спецыяліст дае кансультацыі добрасумленна і непрадузята зыходзячы з прафесійных ведаў і ўнутранага пераканання.

Кансультацыі даюцца спецыялістам без правядзення спецыяльных даследаванняў.

Спецыялісту могуць быць зададзены пытанні судом, які разглядае эканамічныя справы, і асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

Кансультацыі спецыяліста, дадзеныя ў пісьмовай форме, чытаюцца ўголас на судовым пасяджэнні і дадаюцца да матэрыялаў справы. Кансультацыі спецыяліста, дадзеныя ў вуснай форме, заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 96[2]. Вочная стаўка

Суд, які разглядае эканамічныя справы, на падставе хадайніцтва бакоў і (або) трэціх асоб на судовым пасяджэнні, а таксама па ўласнай ініцыятыве можа правесці вочную стаўку паміж бакамі, трэцімі асобамі (прадстаўнікамі бакоў, трэціх асоб) і (або) сведкамі, у паказаннях і тлумачэннях якіх маюцца істотныя супярэчнасці.

Калі вочная стаўка праводзіцца паміж асобамі, якія былі папярэджаны аб крымінальнай адказнасці, суддзя нагадвае дадзеным асобам аб гэтым. Калі сведкам

з'яўляецца непаўналетні, які не дасягнуў шаснаццаці гадоў, суд, які разглядае эканамічныя справы, не папярэджваючы аб крымінальнай адказнасці, нагадвае яму аб абавязку праўдзіва паведаміць усё вядомае аб справе.

Пры правядзенні вочнай стаўкі з удзелам непаўналетняга сведкі ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, а паводле меркавання суда і пры допыце сведак ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў павінен прысутнічаць педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй. У выпадку неабходнасці ў суд выклікаюцца таксама законныя прадстаўнікі непаўналетняга. Педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй і законныя прадстаўнікі з дазволу суда могуць задаваць непаўналетняму сведку пытанні.

У пачатку правядзення вочнай стаўкі суд, які разглядае эканамічныя справы, высвятляе, ці ведаюць дапытваныя адзін аднаго і ў якіх дачыненнях знаходзяцца паміж сабой. Затым дапытваным ва ўстаноўленай судом чарговасці прапануецца даць паказанні (тлумачэнні) аб тых фактах, для высвятлення якіх праводзіцца вочная стаўка. Пасля дачы дапытванымі паказанняў (тлумачэнняў) суд, які разглядае эканамічныя справы, можа задаць ім пытанні. З дазволу суда, які разглядае эканамічныя справы, пракурор, іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права задаваць пытанні ўдзельнікам вочнай стаўкі.

У пратаколе судовага пасяджэння паказанні (тлумачэнні) дапытваных запісваюцца ў той чарговасці, у якой яны даваліся. Кожны ўдзельнік вочнай стаўкі падпісвае свае паказанні і кожную старонку пратакола паасобку.

Артыкул 97. Допыт сведкі

Сведка можа быць дапытаны аб вядомых яму фактах, якія падлягаюць даказванню па справе.

Асоба, якая хадайнічае аб выкліку сведкі, абавязана ўказаць суду, які разглядае эканамічныя справы, факты, якія сведка можа пацвердзіць або абвергнуць, а таксама яго прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і месца жыхарства.

Перад допытам сведкі суд, які разглядае эканамічныя справы:

упэўніваецца ў асобе сведкі;

растлумачвае сведку яго права адмовіцца ад дачы паказанняў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

папярэджвае сведку аб крымінальнай адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў, а таксама за дачу яўна лжывых паказанняў.

Артыкул 98. Парадак допыту сведкі

Кожны сведка дапытваецца асобна. Сведкі, якія яшчэ не далі паказанняў, не могуць знаходзіцца ў зале судовага пасяджэння падчас разбору справы. Дапытаныя сведкі застаюцца ў зале пасяджэння да заканчэння разбору справы, калі суд не дазваляе ім выйсці раней, выслухаўшы аб гэтым меркаванні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Сведка можа быць дапытаны судом у месцы свайго знаходжання, калі ён з прычыны хваробы, старасці, інваліднасці або іншых уважлівых прычын не ў стане прыбыць на выклік суда, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, высвятляе адносіны сведкі да асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і прапаноўвае сведку паведаміць суду ўсё, што яму вядома па справе. Пасля гэтага сведку могуць быць зададзены пытанні судом, які разглядае эканамічныя справы, асобай, па ініцыятыве якой ён выкліканы, пракурорам і іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

Сведка можа быць дапытаны паўторна на тым жа або новым пасяджэнні па ініцыятыве суда, які разглядае эканамічныя справы, або па яго ўласнай заяве, а таксама па просьбе асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 99. Заключэнні дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, або па ініцыятыве суда прыцягваюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, да ўдзелу ў гаспадарчым працэсе для дачы заключэння. Дзяржаўны орган, орган мясцовага кіравання і самакіравання накіроўваюць у суд, які разглядае эканамічныя справы, сваіх прадстаўнікоў, якія даюць заключэнні аб пытаннях, што адносяцца да кампетэнцыі органаў, якія яны прадстаўляюць.

Прадстаўнікі дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, прыцягнутыя да ўдзелу ў гаспадарчым працэсе, фармулююць заключэнні на аснове пытанняў, пастаўленых перад імі судом, які разглядае эканамічныя справы, і асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

Па хадайніцтве прадстаўнікоў дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання суд, які разглядае эканамічныя справы, дае ім час, неабходны для падрыхтоўкі заключэнняў.

Прадстаўнікі дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання ад імя органаў, якія накіравалі іх у суд, які разглядае эканамічныя справы, даюць заключэнні, якія маюць характар афіцыйных заключэнняў гэтых органаў. Заключэнні дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання даюцца ў пісьмовай форме і афармляюцца адпаведнымі органамі як афіцыйныя дакументы, што зыходзяць з гэтых органаў.

Заключэнні дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання чытаюцца ўголас на судовым пасяджэнні.

Па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, або па ініцыятыве суда, які разглядае эканамічныя справы, прадстаўнікі дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання могуць быць выкліканы на судовае пасяджэнне. Прадстаўнік, які з'явіўся на судовае пасяджэнне, пасля абвяшчэння адпаведнага заключэння дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання мае права даць аб ім неабходныя тлумачэнні, а таксама абавязаны адказаць на дадатковыя пытанні суда, які разглядае эканамічныя справы, і асоб, якія

ўдзельнічаюць у справе. Адказы прадстаўнікоў на дадатковыя пытанні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 100. Прадмет і абавязак даказвання

Суд, які разглядае эканамічныя справы, зыходзячы з падстаў патрабаванняў і пярэчанняў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і з улікам зместу падлеглых прымяненню норм права вызначае абставіны, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння спрэчкі або разгляду справы (прадмета даказвання).

Кожная асоба, якая ўдзельнічае ў справе, павінна даказаць тыя абставіны, на якія яна спасылаецца як на абгрунтаванне сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Пры разглядзе спрэчкі аб прызнанні несапраўдным ненарматыўнага прававога акта дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы абавязак даказвання законнасці аспрэчанага акту ўскладаецца на орган або асобу, якая яго прыняла.

Кожная асоба, якая ўдзельнічае ў справе, павінна раскрыць доказы, на якія яна спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, перад іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, да завяршэння падрыхтоўкі справы да судовага разбору або ў межах тэрміну, устаноўленага судом, які разглядае эканамічныя справы, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, у працэсе даказвання вызначаюць аб'ём фактаў, якія падлягаюць даказванню, збіраюць доказы, што пацвярджаюць факты, якія падлягаюць даказванню, падаюць доказы, удзельнічаюць у даследаванні доказаў на судовым пасяджэнні, выказваюць суду сваё меркаванне аб ацэнцы доказаў.

Аб'ём фактаў, якія падлягаюць даказванню, можа быць зменены ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі ў сувязі са змяненнем істцом падставы або прадмета іску і (або) прад'яўленнем адказчыкам сустрэчнага іску.

Калі суд, які разглядае эканамічныя справы, палічыць немагчымым разгляд справы на падставе наяўных доказаў, ён мае права прапанаваць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, падаць дадатковыя доказы або непасрэдна іх выпатрабаваць.

Артыкул 101. Падача і выпатрабаванне доказаў

Доказы падаюць асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, у суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай і апеляцыйнай інстанцый у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Асоба, якая ўдзельнічае ў справе і не мае магчымасці самастойна атрымаць неабходны доказ ад асобы, якая ўдзельнічае ці не прыцягнута да ўдзелу ў справе і ў якой ён знаходзіцца, мае права заявіць у суд, які разглядае эканамічныя справы, хадайніцтва аб выпатрабаванні гэтага доказу. У хадайніцтве павінна быць указана, якія абставіны, што маюць значэнне для вырашэння справы, могуць быць устаноўлены гэтым доказам, пазначаны доказ і ўказана месца яго знаходжання.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, пры задавальненні хадайніцтва выпатрабуе адпаведны доказ ад асобы, у якой ён знаходзіцца.

Аб выпатрабаванні доказу суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, у якім указваюцца тэрмін і парадак падачы доказу.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, пры неабходнасці выдае асобе, якая ўдзельнічае ў справе, адпаведны прысуд для атрымання доказу.

Асоба, якая валодае доказам, запатрабаваным судом, які разглядае эканамічныя справы, накіроўвае яго непасрэдна ў суд або выдае на рукі асобе, якая мае адпаведны прысуд, для перадачы ў суд.

Калі асоба, ад якой судом, які разглядае эканамічныя справы, выпатрабуецца доказ, не мае магчымасці падаць яго наогул або не мае магчымасці падаць яго ў тэрмін, устаноўлены судом, яна абавязана не пазней за пяць дзён з дня атрымання прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб выпатрабаванні доказу паведаміць аб гэтым суду з указаннем прычын невыканання або затрымкі выканання яго патрабавання.

У выпадку непаведамлення суду, які разглядае эканамічныя справы, а таксама невыканання патрабавання аб падачы доказу, які выпатрабуецца, па з-за прычын, прызнаных судом, які разглядае эканамічныя справы, няўважлівымі, асоба, ад якой гэты доказ выпатрабуецца (службовая асоба юрыдычнай асобы), прыцягваецца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам. Пры гэтым асоба, што валодае запатрабаваным доказам, не вызваляецца ад абавязку падаць яго ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 102. Агляд і даследаванне доказаў у іх месцы знаходжання

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права правесці агляд і даследаванне доказаў у іх месцы знаходжання ў выпадках немагчымасці або цяжкасці іх дастаўкі ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Аб правядзенні агляду і даследавання доказаў у іх месцы знаходжання суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Агляд і даследаванне доказаў у іх месцы знаходжання праводзяцца судом, які разглядае эканамічныя справы, з паведамленнем асобам, якія ўдзельнічаюць у справе. Няяўка апавешчаных належным чынам асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае правядзенню агляду і даследавання.

У выпадку неабходнасці да ўдзелу ў аглядзе і даследаванні доказаў у іх месцы знаходжання могуць быць прыцягнуты эксперты, спецыялісты, сведкі або перакладчыкі.

Непасрэдна пасля агляду і даследавання доказаў у іх месцы знаходжання складаецца пратакол, які падпісваецца суддзёй суда, што разглядае эканамічныя справы (калегіяльным складам суда), які праводзіў агляд і даследаванне доказаў, і асобамі, якія ўдзельнічалі ў іх аглядзе і даследаванні.

Артыкул 103. Адноснасць доказаў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае і даследуе толькі тыя доказы, якія могуць пацвердзіць або абвергнуць факты, якія падлягаюць даказванню па разгляданай справе.

Артыкул 104. Дапушчальнасць доказаў

Абставіны справы, якія, згодна заканадаўству, павінны быць пацверджаны пэўнымі доказамі, не могуць пацвярджацца іншымі доказамі.

Артыкул 105. Заява аб падложнасці доказу

Асоба, якая ўдзельнічае ў справе, мае права зрабіць заяву аб падложнасці пададзенага ў суд, які разглядае эканамічныя справы, доказу, калі мае аб гэтым звесткі, якія могуць быць праверaны.

Заява аб падложнасці пададзенага ў суд, які разглядае эканамічныя справы, доказу падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай форме, павінна быць падпісана заяўнікам і змяшчаць абгрунтаванне такога сцвярджэння.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, заслухоўвае меркаванні іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, наконт пададзенай заявы і аб магчымасці далейшага судовага разбору справы. Аб прынятым рашэнні суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Артыкул 106. Падставы вызвалення ад даказвання

Не падлягаюць даказванню абставіны, прызнаныя судом, які разглядае эканамічныя справы, агульнавядомымі.

Абставіны, устаноўленыя ўступіўшай у законную сілу судовай пастановай па раней разгледжанай судом, які разглядае эканамічныя справы, справе, не падлягаюць доказу нанава пры разглядзе судом, які разглядае эканамічныя справы, іншай справы, у якой удзельнічаюць тыя ж асобы або іх спадкаемцы.

Абставіны, устаноўленыя ўступіўшай у законную сілу судовай пастановай іншага суда агульнай юрысдыкцыі і якія маюць значэнне для справы, разгляданай судом, які разглядае эканамічныя справы, не падлягаюць доказу нанава асобамі, якія ўдзельнічалі ў справе, разгледжанай іншым судом агульнай юрысдыкцыі, ці іх спадкаемцамі.

Не падлягаюць доказу ўстаноўленыя ўступіўшым у законную сілу прысудам суда па крымінальнай справе абставіны, якія маюць значэнне для справы, разгляданай судом, які разглядае эканамічныя справы, у дачыненні да здзяйснення пэўных дзеянняў і асоб, якія іх здзейснілі.

Артыкул 107. Вызваленне ад даказвання абставін справы, прызнаных бакамі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, першай і апеляцыйнай інстанцый на ўсіх стадыях гаспадарчага працэсу павінен садзейнічаць дасягненню бакамі згоды ў ацэнцы фактычных абставін справы ў цэлым або іх часткі, праяўляць у гэтых мэтах неабходную ініцыятыву, выкарыстоўваць свае працэсуальныя паўнамоцтвы і аўтарытэт органа судовай улады.

Абставіны справы, прызнаныя бакамі ў выніку дасягнутай паміж імі згоды, прымаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, у якасці факту, які не патрабуе далейшага даказвання.

Згода бакоў аб фактычных абставінах справы, дасягнутая па-за судовым пасяджэннем, і змест такой згоды сведчацца судом шляхам складання пратакола, які падпісваецца бакамі і зацвярджаецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы.

Згода бакоў, дасягнутая на судовым пасяджэнні, і змест такой згоды заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння і сведчацца подпісамі бакоў.

Пытанні, якія адносяцца да фактычных абставін справы, прызнаныя і пасведчаныя бакамі ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам, у ходзе далейшага вядзення ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый не правяраюцца.

Артыкул 108. Ацэнка доказаў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, ацэньвае доказы па сваім унутраным перакананні, заснаваным на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні доказаў, якія ёсць у справе.

Ніякія доказы не маюць для суда, які разглядае эканамічныя справы, загадзя ўстаноўленай сілы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, ацэньвае адноснасць, дапушчальнасць, дакладнасць кожнага доказу паасобку, а таксама дастатковасць і ўзаемную сувязь доказаў у іх сукупнасці.

Доказ прызнаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, дакладным, калі ў выніку яго даследавання, параўнання з іншымі доказамі суд выявіць, што звесткі, якія змяшчаюцца ў ім, адпавядаюць рэчаіснасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, першай і апеляцыйнай інстанцый абавязаны прывесці ў судовай пастанове матывы, паводле якіх адны доказы пакладзены судом у абгрунтаванне сваіх высноў, а іншыя адхілены.

Артыкул 109. Забеспячэнне доказаў

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе і маюць падставы баяцца, што падача неабходных доказаў стане немагчымай або цяжкай, могуць падаць у суд, які разглядае эканамічныя справы і прыняў да свайго вядзення справу, заяву аб забеспячэнні гэтых доказаў.

Да ўзбуджэння вядзення па справе забеспячэнне пісьмовых доказаў можа праводзіцца натарыусамі ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

Склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда або бок з яго згоды могуць звяртацца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы арбітражнага разбору або па месцы знаходжання маёмасці, у дачыненні да якой могуць быць прыняты меры для забеспячэння доказаў, з заявай аб забеспячэнні доказаў.

У заяве аб забеспячэнні доказаў павінны быць указаны:

доказы, якія неабходна забяспечыць;

абставіны, для пацвярджэння якіх неабходныя гэтыя доказы;

прычыны, якія прымусілі заяўніка падаць заяву аб забеспячэнні доказаў.

У мэтах забеспячэння доказаў суд, які разглядае эканамічныя справы, афармляе працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, якія накіраваны на замацаванне і захаванне гэтых доказаў (накладанне арышту, выпатрабаванне доказаў ад іншых асоб і арганізацый, агляд рэчавых доказаў).

Суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае заяву аб забеспячэнні доказаў без выкліку бакоў.

Па выніках разгляду заявы аб забеспячэнні доказаў суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуды аб забеспячэнні доказаў або аб адмове ў задавальненні гэтай заявы.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб адмове ў задавальненні заявы аб забеспячэнні доказаў можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым гэтым Кодэксам.

Артыкул 110. Прымяненне тэхнічных сродкаў для замацавання доказаў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, па сваёй ініцыятыве або па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, мае права прымяняць тэхнічныя сродкі для замацавання тлумачэнняў бакоў, іх прадстаўнікоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама фіксавання іншых працэсуальных дзеянняў доказнага характару.

Гука- і відэазапіс допыту толькі асобных сведак, або аднаго боку, або трэцяй асобы, а таксама спецыяльна выдзеленых для гэтага фрагментаў чыіх-небудзь паказанняў, дадзеных у ходзе допыту, не дапускаецца.

Пасля заканчэння працэсуальнага дзеяння гука- і відэазапіс дэманструецца ўдзельнікам працэсуальнага дзеяння.

Дакладнасць інфармацыі, замацаванай з дапамогай тэхнічных сродкаў, пацвярджаецца ўдзельнікамі працэсуальнага дзеяння ў пратаколе шляхам яго падпісання.

Артыкул 111. Судовыя даручэнні

Суд, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу, у выпадку немагчымасці атрымання доказаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь, у парадку, устаноўленым артыкулам 112 гэтага Кодэкса, мае права даручыць адпаведнаму суду, які разглядае эканамічныя справы, здзейсніць пэўныя працэсуальныя дзеянні.

Аб судовым даручэнні суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, у якім указваюцца склад асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, іх месца знаходжання, кароткі змест разгляданай справы, а таксама абставіны, якія падлягаюць высвятленню, і доказы, якія павінен сабраць суд, які разглядае эканамічныя справы, якому даецца даручэнне.

Пастанова аб судовым даручэнні абавязковая для суда, які разглядае эканамічныя справы і якому дадзена даручэнне, і павінна быць выканана ў тэрмін не большы за дзесяць дзён з дня атрымання прысуду.

Артыкул 112. Парадак выканання судовага даручэння

Судовае даручэнне выконваецца судом, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення пасяджэння. Няяўка апавешчаных належным чынам асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае выкананню даручэння.

Аб выкананні судовага даручэння выносіцца прысуд, які з усімі матэрыяламі на працягу пяці дзён перасылаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы і які накіраваў судовае даручэнне.

ГЛАВА 9

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІСКУ

Артыкул 113. Падставы забеспячэння іску

Суд, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, мае права прыняць меры для забеспячэння іску.

Забеспячэнне іску дапускаецца на любой стадыі гаспадарчага працэсу, калі непрыняцце мер для яго забеспячэння можа зрабіць цяжкім або немагчымым выкананне рашэння суда.

Па правілах, устаноўленых гэтай главой, меры для забеспячэння іску, разгляданага міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, могуць быць прыняты судом, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве складу міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда або боку арбітражнага (трацейскага) разбору.

Артыкул 114. Хадайніцтва аб забеспячэнні іску

Хадайніцтва аб забеспячэнні іску заяўляецца ў пісьмовай форме.

У хадайніцтве аб забеспячэнні іску павінны быць указаны:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які заяўляецца хадайніцтва;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) істца і адказчыка, іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца знаходжання, а таксама нумары тэлефонаў і (або) факсаў, калі гэтакія ёсць;

абставіны, на якіх заснаваны патрабаванні аб забеспячэнні іску;

мера забеспячэння, аб прымяненні якой хадайнічае асоба, што ўдзельнічае ў справе;

пры маёмасных патрабаваннях – іх памер;

пры просьбе аб арышце маёмасці – аб'ект забеспячэння іску з указаннем яго месца знаходжання;

абгрунтаванне прычын, якія выклікалі неабходнасць заявы хадайніцтва аб забеспячэнні іску;

пералік дададзеных дакументаў.

Да хадайніцтва боку арбітражнага разбору аб забеспячэнні іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадаецца дакумент, які пацвярджае згоду гэтага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда на зварот боку ў суд, які разглядае эканамічныя справы, з хадайніцтвам аб забеспячэнні іску.

Да хадайніцтва боку трацейскага разбору аб забеспячэнні іску, які разглядаецца трацейскім судом, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадаецца прысуд гэтага трацейскага суда аб узбуджэнні трацейскага разбору.

Да хадайніцтва аб забеспячэнні іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, дадаецца таксама дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (далей – сістэма АРІП) і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў хадайніцтве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы хадайніцтва.

Артыкул 115. Парадак разгляду хадайніцтва аб забеспячэнні іску

Хадайніцтва аб забеспячэнні іску разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы і вырашае спрэчку, без паведамлення асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней за тры дні з дня яго паступлення ў суд.

Хадайніцтва аб забеспячэнні іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, разглядаецца на судовым пасяджэнні судом, які разглядае эканамічныя справы, па месцы арбітражнага (трацейскага) разбору або па месцы знаходжання маёмасці, у дачыненні да якой могуць быць прыняты меры для забеспячэння іску.

Па выніках разгляду хадайніцтва аб забеспячэнні іску суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Пры заяве хадайніцтва аб забеспячэнні іску з парушэннем патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам 114 гэтага гэтага Кодэкса, суд, які разглядае эканамічныя справы, вяртае яго. Асоба, якая заяўляла хадайніцтва, пасля ліквідацыі выяўленых парушэнняў мае права ізноў заявіць хадайніцтва ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Пры задавальненні хадайніцтва аб забеспячэнні іску суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае меры, прадугледжаныя артыкулам 116 гэтага Кодэкса.

У забеспячэнні іску можа быць адмоўлена, калі:

суд, які разглядае эканамічныя справы, палічыць недастатковым абгрунтаванне прычын, якія выклікалі неабходнасць заявы хадайніцтва аб забеспячэнні іску;

прымяненне мер для забеспячэння іску можа істотна парушыць правы іншых асоб, звязаныя з аб'ектам забеспячэння.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб пытаннях забеспячэння іску, за выключэннем прысудаў аб адмене забеспячэння іску, могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску або аб адмове ў яго забеспячэнні высылаюцца бакам, а таксама іншым асобам, на якіх судом, які разглядае эканамічныя справы, ускладзены абавязак прыняцця мер для забеспячэння іску, не пазней за наступны дзень пасля іх вынясення.

У выпадку абскарджання прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску такая скарга павінна разглядацца адпаведнымі судовымі інстанцыямі (службовай асобай, якая мае права прынясення пратэсту) па сутнасці незалежна ад прыняцця рашэння аб адмене забеспячэння іску ў парадку, устаноўленым артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

Падача скаргі на прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску не прыпыняе выканання гэтага прысуду.

Артыкул 116. Меры для забеспячэння іску

Мерамі для забеспячэння іску могуць быць:

накладанне арышту на нерухомую маёмасць або іншую маёмасць, якія належаць адказчыку і знаходзяцца ў яго або ў іншых асоб;

накладанне арышту на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках у банках і (або) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях;

забарона адказчыку здзяйсняць пэўныя дзеянні;

ускладанне на адказчыка абавязку здзейсніць пэўныя дзеянні;

забарона іншым асобам здзяйсняць пэўныя дзеянні, якія датычацца прадмета спрэчкі;

прыпыненне спагнання па выканаўчым дакуменце або іншым дакуменце, які дапускае спагнанне ў бясспрэчным (безакцэптным) парадку, у выпадку прад'яўлення іскаў аб прызнанні такіх дакументаў не падлеглымі выкананню;

прыпыненне рэалізацыі маёмасці ў выпадку прад'яўлення іску аб вызваленні яе ад арышту;

часовае абмежаванне права грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца адказчыкамі, на выезд з Рэспублікі Беларусь;

іншыя меры, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

У выпадку неабходнасці дапускаецца адначасовае прыняцце некалькіх мер для забеспячэння іску.

За невыкананне мер для забеспячэння іску юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі і грамадзяне прыцягваюцца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Ісцец мае права сыскаць страты, прычыненыя яму нездзяйсненнем прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску, шляхам прад'яўлення іску ў той жа суд, які разглядае эканамічныя справы.

Вопіс і арышт маёмасці праводзяцца ў межах кошту іску.

Артыкул 117. Замена адной меры забеспячэння іску іншай

Па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, складу міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда або боку арбітражнага (трацейскага) разбору дапускаецца замена адной меры забеспячэння іску іншай.

Пытанне пра замену меры забеспячэння іску вырашаецца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 113–115 гэтага Кодэкса.

Артыкул 118. Выкананне прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску

Пры выкананні прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску шляхам накладання арышту на маёмасць або грашовыя сродкі адказчык мае права замест прыняцця ўстаноўленых судом мер для забеспячэння іску ўнесці на адпаведны рахунак суда, які разглядае эканамічныя справы, суму, якая выпатрабуецца істцом.

Выкананне прысуду аб прыняцці меры для забеспячэння іску, прадугледжанай абзацам дзявятым часткі першай артыкула 116 гэтага Кодэкса, па хадайніцтве адказчыка можа быць прыпынена на тэрмін, устаноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыпыненні выканання прысуду аб прыняцці меры для забеспячэння іску, прадугледжанай абзацам дзявятым часткі першай артыкула 116 гэтага Кодэкса, або аб адмове ў яго прыпыненні прымаецца ў парадку, прадугледжаным артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

Пры задавальненні іску мера па яго забеспячэнні дзейнічае да фактычнага выканання судовай пастановы.

Артыкул 119. Адмена забеспячэння іску

Забеспячэнне іску па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, можа быць адменена судом, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу. Пытанне аб адмене забеспячэння іску вырашаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, у тэрмін, не большы за тры дні з дня заявы хадайніцтва.

Забеспячэнне іску, які разглядаецца міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, па хадайніцтву боку арбітражнага (трацейскага) разбору можа быць адменена судом, які разглядае эканамічныя справы, які вынес прысуд аб забеспячэнні іску.

Па выніках разгляду пытання аб адмене забеспячэння іску суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуды аб адмене забеспячэння іску або аб адмове ў яго адмене.

Пры прыняцці судом, які разглядае эканамічныя справы, судовых пастаноў аб адмове ў іску, аб спыненні вядзення па справе або аб пакіданні іску без разгляду прынятыя меры для забеспячэння іску захоўваюцца да ўступлення ў законную сілу гэтых пастаноў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права адначасова з прыняццем судовай пастановы або пасля яе прыняцця вынесці прысуд аб адмене забеспячэння іску.

Артыкул 120. Пакрыццё страт, прычыненых забеспячэннем іску

Асоба, у дачыненні да якой прыняты прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб забеспячэнні іску, мае права пасля ўступлення ў законную сілу судовых пастаноў аб адмове ў іску, аб спыненні вядзення па справе або аб пакіданні іску без разгляду запатрабаваць ад асобы, якая заявіла хадайніцтва аб забеспячэнні іску, пакрыцця страт, прычыненых яму забеспячэннем іску.

ГЛАВА 10

МІРАВОЕ ПАГАДНЕННЕ

Артыкул 121. Заключэнне міравога пагаднення

Міравым пагадненнем з'яўляецца пагадненне бакоў аб спыненні судовай спрэчкі на аснове ўзаемных уступак.

Міравое пагадненне можа быць заключана бакамі на любой стадыі судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, а таксама пры дасягненні прымірэння ў парадку, устаноўленым главой 17 гэтага Кодэкса.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, прымаюць меры да ўрэгулявання спрэчкі і заключэння бакамі міравога пагаднення.

Міравое пагадненне можа быць заключана па любой справе, якая вынікае з грамадзянскіх праваадносін, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Міравое пагадненне не можа быць накіравана супраць праў і законных інтарэсаў іншых асоб або супярэчыць заканадаўству.

Артыкул 122. Форма і змест міравога пагаднення

Міравое пагадненне заключаецца бакамі ў пісьмовай форме і падпісваецца імі або іх прадстаўнікамі.

Прадстаўнік мае права заключыць міравое пагадненне пры наяўнасці на гэта паўнамоцтва, спецыяльна прадугледжанага ў даверанасці.

Міравое пагадненне павінна змяшчаць узгодненыя бакамі звесткі аб умовах, памеры і тэрмінах выканання абавязацельстваў адзін перад адным або адным бокам перад іншым, а таксама аб наступствах яго невыканання ў добраахвотным парадку.

Міравое пагадненне можа таксама змяшчаць умовы аб:

адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання абавязацельстваў;

уступцы права патрабавання;

прызнанні абавязку або змяншэнні яго памеру;

задавальненні патрабаванняў іншымі спосабамі, якія не супярэчаць заканадаўству.

У міравым пагадненні можа быць прадугледжана размеркаванне судовых выдаткаў паміж бакамі, якія яго заключылі. Калі ў міравым пагадненні такое ўказанне адсутнічае, суд, які разглядае эканамічныя справы, вырашае гэта пытанне ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Адзін экзэмпляр міравога пагаднення падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, і дадаецца да матэрыялаў справы.

Артыкул 123. Зацвярджэнне міравога пагаднення судом, які разглядае эканамічныя справы

Заява аб зацвярджэнні міравога пагаднення, заключанага бакамі, разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, у вядзенні якога знаходзіцца справа.

Па выніках разгляду заявы аб зацвярджэнні міравога пагаднення, заключанага бакамі, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Калі вядзенне па справе знаходзіцца ў стадыі выканання рашэння, міравое пагадненне падаецца на зацвярджэнне суду, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, які прыняў судовую пастанову, або па месцы выканання рашэння.

Міравое пагадненне, якое паступіла ў суд, які разглядае эканамічныя справы, да прыняцця судовай пастановы, якой завяршаецца разгляд справы, разглядаецца на судовым пасяджэнні суда, прызначаным для разгляду справы, з паведамленнем бакам.

Міравое пагадненне, якое заключаецца на стадыі выканаўчага вядзення, разглядаецца не больш за адзін месяц з дня яго паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы. Бакі міравога пагаднення апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка бакоў міравога пагаднення, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду пытання аб зацвярджэнні міравога пагаднення.

У рэзалютыўнай частцы прысуду (пастановы) суда, які разглядае эканамічныя справы, аб зацвярджэнні міравога пагаднення ўказваюцца:

змест міравога пагаднення;

парадак размеркавання судовых выдаткаў;

парадак спагнання дзяржаўнай пошліны пры невыкананні добраахвотна міравога пагаднення.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб зацвярджэнні міравога пагаднення, заключанага на стадыі выканаўчага вядзення, указваецца, што судовая пастанова, на падставе якой выдадзены судовы загад, не падлягае выкананню.

Міравое пагадненне ўступае ў сілу з дня яго зацвярджэння прысудам (пастановай) суда, які разглядае эканамічныя справы.

Прысуды (пастановы) суда, які разглядае эканамічныя справы, аб зацвярджэнні міравога пагаднення або аб адмове ў яго зацвярджэнні могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 124. Выкананне міравога пагаднення

Міравое пагадненне выконваецца бакамі добраахвотна.

У выпадку, калі міравое пагадненне не выконваецца ў парадку і тэрміны, вызначаныя ў ім, суд, які разглядае эканамічныя справы, па заяве зацікаўленага боку выдае выканаўчы дакумент у парадку, устаноўленым раздзелам IV гэтага Кодэкса. Пытанне аб выдачы выканаўчага дакумента разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, без выкліку бакоў.

ГЛАВА 11

СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ

Артыкул 125. Склад судовых выдаткаў

Судовыя выдаткі складаюцца з дзяржаўнай пошліны і выдаткаў, звязаных з разглядам справы.

Артыкул 126. Выдаткі, звязаныя з разглядам справы

Да выдаткаў, звязаных з разглядам справы, адносяцца:

грашовыя сумы, якія падлягаюць выплаце экспертам, спецыялістам, сведкам і перакладчыкам;

выдаткі на правядзенне агляду доказаў у іх месцы знаходжання;

выдаткі на аплату паслуг адвакатаў і іншых асоб, якія аказваюць юрыдычную дапамогу, панесеныя асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, у сувязі з разглядам справы і прызнаныя судом, які разглядае эканамічныя справы, неабходнымі;

іншыя выдаткі, прызнаныя судом, які разглядае эканамічныя справы, неабходнымі.

Артыкул 127. Выплата дзяржаўнай пошліны

Парадак выплаты або спагнання, вяртання і памер дзяржаўнай пошліны з іскавых і іншых заяў, скарг, хадайніцтваў, якія падаюцца ў суды, што разглядаюць эканамічныя справы, а таксама за выдачу судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, копій дакументаў устанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

Пры павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў дзяржаўная пошліна выплачваецца ў адпаведнасці з павелічэннем кошту іску.

Да заявы аб павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў дадаецца дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або

паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы заявы.

Артыкул 128. Цана іску

Цана іску вызначаецца:

па ісках аб спагнанні грашовых сродкаў – зыходзячы з сумы, якая спаганяецца;

па ісках аб прымусе да выканання дагаворных абавязацельстваў, якія маюць грашовую ацэнку, – зыходзячы з кошту няздзейсненага абавязацельства;

па ісках аб прызнанні не падлеглымі выкананню выканаўчага дакумента або іншага дакумента, па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным парадку, – зыходзячы з сумы, якая аспрэчваецца;

па ісках аб выпатрабаванні маёмасці – зыходзячы з кошту маёмасці;

па ісках аб выпатрабаванні зямельнага ўчастка – зыходзячы з кошту зямельнага ўчастка па ўстаноўленай цане, а пры яе адсутнасці – па рыначнай цане.

У цану іску ўключаюцца ўказаныя ў іскавай заяве сумы няўстойкі (штрафу, пені) і працэнты.

Цана іску, які складаецца з некалькіх самастойных патрабаванняў, вызначаецца сумай усіх патрабаванняў.

У выпадку няправільнага ўказання цаны іску яна вызначаецца судом, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 129. Выключаны

Артыкул 130. Выключаны

Артыкул 131. Выплата грашовых сум, належных экспертам, спецыялістам, сведкам і перакладчыкам

Экспертам, спецыялістам, сведкам і перакладчыкам кампенсуюцца расходы на праезд, наём жылога памяшкання, панесеныя імі ў сувязі з яўкай у суд, які разглядае эканамічныя справы, і выплачваюцца сутачныя.

Эксперты і спецыялісты атрымліваюць узнагароджанне за выкананую імі па даручэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, працу, калі выкананая праца не ўваходзіць у іх службовыя абавязкі.

Аплата працы перакладчыкаў і пакрыццё панесеных імі расходаў у сувязі з яўкай у суд, які разглядае эканамічныя справы, праводзяцца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

За работнікамі, якія выклікаюцца ў суд, што разглядае эканамічныя справы, у якасці сведак, захоўваецца сярэдняя заработная плата па месцы працы за час іх адсутнасці ў сувязі з яўкай у суд.

Сведкі, якія не знаходзяцца ў працоўных адносінах, атрымліваюць кампенсацыю за адцягненне ад звычайных заняткаў зыходзячы з фактычных выдаткаў часу і ў адпаведнасці з мінімальнай заработнай платай, устаноўленай заканадаўствам, за кошт

сродкаў, якія знаходзяцца на адпаведным рахунку суда, які разглядае эканамічныя справы.

Парадак выплаты і памеры грашовых сум, якія падлягаюць выплаце асобам, указаным у частцы першай гэтага артыкула, устанаўліваюцца заканадаўствам.

Сумы, належныя экспертам, спецыялістам і перакладчыкам, выплачваюцца пасля выканання імі сваіх абавязкаў за кошт сродкаў, якія знаходзяцца на адпаведным рахунку суда, што разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 132. Унясенне бакамі грашовых сум, неабходных для аплаты выдаткаў па справе

Грашовыя сумы, падлеглыя выплаце экспертам, спецыялістам і сведкам, а таксама неабходныя расходы на справу папярэдне ўносяцца на адпаведны рахунак суда, які разглядае эканамічныя справы, бокам, які заявіў хадайніцтва, або трэцяй асобай, якая заявіла самастойныя патрабаванні. Калі хадайніцтва заяўлена абодвума бакамі або выклік спецыялістаў і сведак, прызначэнне экспертызы і іншыя дзеянні, якія падлягаюць аплаце, праводзяцца па ініцыятыве суда, які разглядае эканамічныя справы, неабходныя грашовыя сумы ўносяцца бакамі ў роўных частках на адпаведны рахунак суда, які разглядае эканамічныя справы, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Артыкул 133. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе

Судовыя выдаткі размяркоўваюцца паміж істцом і адказчыкам прапарцыянальна памеру задаволеных іскавых патрабаванняў.

Дзяржаўная пошліна, ад выплаты якой ва ўстаноўленым парадку ісцец быў вызвалены, спаганяецца з адказчыка прапарцыянальна памеру задаволеных іскавых патрабаванняў, калі адказчык не вызвалены ад яе выплаты.

Пры адмове істца ад іску судовыя выдаткі, панесеныя ім, адказчык не кампенсуе. Адмова ад іску ў сувязі з добраахвотным задавальненнем іскавых патрабаванняў адказчыкам пасля прад'яўлення іску не перашкаджае спагнанню з адказчыка па патрабаванні істца панесеных ім судовых выдаткаў.

У выпадку заключэння міравога пагаднення або пагаднення аб прымірэнні судовыя выдаткі на справу пагашаюцца па пагадненні бакоў або ў адпаведнасці з часткай першага гэтага артыкула.

Пры адмове ў задавальненні іску выдаткі, панесеныя судом, які разглядае эканамічныя справы, у сувязі з разглядам справы, і дзяржаўная пошліна, ад выплаты якой ва ўстаноўленым парадку ісцец быў вызвалены, спаганяюцца з істца.

Працэсуальныя саўдзельнікі нясуць судовыя выдаткі на справу ў роўных долях, калі іншае не абумоўлена адрозненнем у цане іх патрабаванняў.

Калі салідарная адказнасць вынікае з прыроды спрэчных матэрыяльных праваадносін, суд, які разглядае эканамічныя справы, спаганяе з суадказчыкаў судовыя выдаткі салідарна.

Судовыя выдаткі, панесеныя ў сувязі з працэсуальнымі дзеяннямі, якія былі здзейснены па патрабаванні працэсуальнага саўдзельніка толькі ў яго інтарэсах, іншымі працэсуальнымі саўдзельнікамі не кампенсуюцца.

Пры пагадненні бакоў аб размеркаванні судовых выдаткаў суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права прыняць рашэнне ў адпаведнасці з гэтым пагадненнем.

Калі суд, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае скаргу, зменіць здзейсненую судовую пастанову або вынесе новую, не перадаючы справы на новы разгляд, ён адпаведна змяняе размеркаванне судовых расходаў альбо перадае гэтае пытанне на разгляд суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Судовыя выдаткі, панесеныя бакамі ў сувязі з разглядам скаргаў (апеляцыйнай, касацыйнай, у парадку нагляду), размяркоўваюцца паміж істцом і адказчыкам у адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

Артыкул 133[1]. Аднясенне судовых выдаткаў на асобу, якая злоўжывае сваімі працэсуальнымі правамі і не выконвае свае працэсуальныя абавязкі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права спагнаць з боку судовыя выдаткі незалежна ад зыходу справы, калі:

справа ўзнікла з прычыны парушэння бокам дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі, устаноўленага заканадаўчымі актамі для дадзенай катэгорыі спрэчак або дагаворам (пакіданне прэтэнзіі без адказу ў тэрмін, прадугледжаны дадаткам да сапраўднага Кодэкса, нявысылка выпатрабаваных дакументаў, адмова або ўхіленне ад правядзення перагавораў);

доказы, неабходныя для разгляду справы, пададзены бокам з парушэннем парадку падачы доказаў, устаноўленага гэтым Кодэксам, у тым ліку з парушэннем тэрміну падачы доказаў, устаноўленага судом, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права спагнаць судовыя выдаткі на справу, у тым ліку выдаткі, панесеныя асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, па іх пісьмовай заяве, з боку, які дапусціў злоўжыванне сваімі працэсуальнымі правамі ці не выканаў сваіх працэсуальных абавязкаў, калі гэта прывяло да адкладання судовага пасяджэння, зацягвання судовага працэсу, перашкаджэння разгляду справы і прыняцця законнай і абгрунтаванай судовай пастановы.

ГЛАВА 12

ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ

Артыкул 134. Устанаўленне і падлік працэсуальных тэрмінаў

Рэзалютыўная частка рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, абвяшчаецца на тым жа судовым пасяджэнні, на якім заканчваецца разгляд справы. Адначасова суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы (старшынствуючы на судовым пасяджэнні), абвяшчае, калі асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, могуць азнаёміцца з матываваным рашэннем, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Абвешчаная рэзалютыўная частка рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, павінна быць падпісана суддзёй (суддзямі) суда, які разглядае эканамічныя справы, і далучана да справы.

Суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы (старшынствуючы на судовым пасяджэнні), растлумачвае парадак і тэрмін абскарджання (апратэставання) рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, парадак і тэрмін падачы заўваг на пратакол судовага пасяджэння.

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, можа быць апублікавана ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Артыкул 202. Складанне матывіровачнай часткі рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы

Матывіровачная частка рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, складаецца не пазней за сем дзён з дня падачы заявы аб яе складанні або апеляцыйнай скаргі (пратэсту). Калі тэрмін падачы заявы, устаноўлены абзацам дзявятым часткі пятай артыкула 193 гэтага Кодэкса, прапушчаны з-за ўважлівай прычыны, ён можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, які вынес рашэнне.

Матывіровачная частка рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, падпісваецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, а ў выпадку разгляду справы калегіяльным складам суда, які разглядае эканамічныя справы, – усімі суддзямі, якія ўдзельнічалі ў прыняцці рашэння, у тым ліку суддзёй, які мае асобную думку.

Артыкул 203. Накіраванне копій рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, асобам, якія ўдзельнічаюць у справе

Суд, які разглядае эканамічныя справы, накіроўвае заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні копіі рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней за пяць дзён з дня прыняцця рашэння або ўручае ім копіі рашэння пад распіску.

У выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, суд, які разглядае эканамічныя справы, накіроўвае копіі рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, іншым зацікаўленым асобам.

Па справах, у матэрыялах якіх змяшчаюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, накіроўваецца або ўручаецца выпіска з рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, якая складаецца з уводнай і рэзалютыўнай частак і не ўтрымлівае звестак, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі.

Азнаямленне з апісальнай і матывіровачнай часткамі рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, якія змяшчаюць звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, ажыццяўляецца з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

Артыкул 204. Уступленне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, у законную сілу

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі, уступае ў законную сілу пасля сканчэння пятнаццаці дзён з дня яго прыняцця, калі не пададзена апеляцыйная скарга. У выпадку падачы апеляцыйнай скаргі рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, калі яно не адменена і не зменена, уступае ў законную сілу з дня прыняцця пастановы судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі.

Рашэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь уступае ў законную сілу з моманту яго абвяшчэння на судовым пасяджэнні.

Артыкул 205. Рашэнні і прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, што падлягаюць неадкладнаму выкананню

Неадкладнаму выкананню падлягаюць:

рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прызнанні несапраўднымі ненарматыўных прававых актаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, іншых органаў або службовых асоб;

рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці;

рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, аб абавязку арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка) ліквідаваць дапушчанае парушэнне;

рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, аб задавальненні патрабаванняў, калі адказчык прызнаў іск або калі неадкладнае выкананне судовых пастаноў прама прадугледжана заканадаўчым актам;

рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, аб абвяшчэнні эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва);

прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб адкрыцці конкурснага вядзення;

прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, па пытаннях забеспячэння іску і забеспячэння выканання выканаўчых дакументаў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права дапусціць неадкладнае выкананне рашэнняў у цэлым або іх часткі аб прысуджэнні грашовых сродкаў па простым або пераводным вэксалі (далей – вэксаль), чэку або іншай каштоўнай паперы, сапраўднасць якіх не аспрэчваецца адказчыкам, а таксама па іншых справах, калі замаруджванне ў выкананні рашэнняў можа прывесці да істотнага ўрону для боку ў спрэчцы, на карысць якога адбылося рашэнне, або зрабіць немагчымым іх выкананне.

Неадкладнае выкананне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, дапускаецца пры даванні бокам, на карысць якога адбылося рашэнне, на выпадак адмены рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, забеспячэння павароту выканання (сустрэчнага забеспячэння) шляхам унясення на адпаведны рахунак суда, які разглядае эканамічныя справы, грашовых сродкаў у памеры прысуджанай сумы або давання банкаўскай гарантыі, паручыцельства ці іншага фінансавага забеспячэння на тую ж суму.

Аб неадкладным выкананні рашэння або прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, у цэлым або іх часткі ўказваецца ў судовай пастанове.

Артыкул 206. Забеспячэнне выканання рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, мае права забяспечыць выкананне рашэння, не звернутага да неадкладнага выканання, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Артыкул 207. Абскарджанне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, якое не ўступіла ў законную сілу, можа быць абскарджана ў суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, якое ўступіла ў законную сілу, можа быць абскарджана ў суд, які разглядае эканамічныя справы, касацыйнай або наглядной інстанцыі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 208. Выкананне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі прыводзіцца ў выкананне пасля ўступлення яго ў законную сілу ў парадку, устаноўленым раздзелам IV гэтага Кодэкса і іншым заканадаўствам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 205 гэтага Кодэкса.

Артыкул 209. Дадатковае рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы

Па сваёй ініцыятыве або па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, суд, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў рашэнне, мае права прыняць дадатковае рашэнне да ўступлення ў законную сілу прынятага ім рашэння, Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, які прыняў рашэнне, – да выканання яго рашэння, калі:

судом не было прынята рашэнне па якім-небудзь патрабаванні, у дачыненні да якога асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, падалі доказы;

суд, вырашыўшы пытанне аб праве, не ўказаў у рашэнні памер сумы, якая падлягае спагнанню, падлеглай перадачы маёмасці або пэўных дзеянняў, якія абавязаны выканаць адказчык;

судне вырашыў пытанне аб судовых выдатках.

Пытанне аб прыняцці судом, які разглядае эканамічныя справы, дадатковага рашэння вырашаецца на судовым пасяджэнні.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка апавешчаных належным чынам асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае разгляду пытання аб прыняцці дадатковага рашэння.

Дадатковае рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, прымаецца па правілах, устаноўленых гэтай главой.

У выпадку адмовы ў прыняцці дадатковага рашэння суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Дадатковае рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, і прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб адмове ў прыняцці дадатковага рашэння могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 210. Растлумачэнне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы. Выпраўленне апісак, памылак друку і арыфметычных памылак

У выпадку няяснасці рашэння суд, які разглядае эканамічныя справы, які яго прыняў, мае права па хадайніцтве, прадстаўленні асобы, якая ўдзельнічае ў справе, судовага выканаўцы, дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, арганізацыі, якая выконвае рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, або па сваёй ініцыятыве растлумачыць рашэнне, не змяняючы яго зместу.

Растлумачэнне рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, дапускаецца, калі яно не прыведзена ў выкананне і не скончыўся тэрмін, на працягу якога рашэнне можа быць прымусова выканана.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, які вырашыў спрэчку, мае права па хадайніцтве, прадстаўленні асобы, якая ўдзельнічае ў справе, судовага выканаўцы, дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, арганізацыі, якая выконвае рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, або па сваёй ініцыятыве выправіць дапушчаныя ў судовай пастанове апіскі, памылкі друку і арыфметычныя памылкі, не змяняючы яго зместу.

Па пытаннях растлумачэння рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, выпраўлення апісак, памылак друку і арыфметычных памылак суд, які разглядае эканамічныя справы, на працягу дзесяці дзён з дня паступлення хадайніцтва, прадстаўлення ў суд выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 211. Адтэрміноўка або растэрміноўка выканання судовай пастановы, змяненне спосабу і парадку яе выканання

Суд, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў судовую пастанову, мае права па хадайніцтве боку, пададзеным да сканчэння тэрміну, устаноўленага для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання, адтэрмінаваць або растэрмінаваць выкананне судовай пастановы, змяніць спосаб і парадак яе выканання.

Пытанні аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання судовай пастановы, аб змяненні спосабу і парадку яе выканання вырашаюцца на судовым пасяджэнні з паведамленнем бакам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка любога з бакоў, апавешчаных належным чынам, не перашкаджае разгляду гэтых пытанняў.

Па выніках разгляду пытанняў аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання судовай пастановы, аб змяненні спосабу і парадку яе выканання суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 22
ПРЫСУД СУДА, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ

Артыкул 212. Вынясенне прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, і ў іншых выпадках – па пытаннях, якія патрабуюць рашэння ў ходзе судовага разбору.

Прысуд выносіцца судом, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай форме ў выглядзе асобнай судовай пастановы або пратакольнага прысуду.

Прысуд у выглядзе асобнай судовай пастановы суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць ва ўсіх выпадках, калі гэтым Кодэксам прадугледжана магчымасць абскарджання прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, асобна ад судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці. У іншых выпадках суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права вынесці прысуд як у выглядзе асобнай судовай пастановы, так і ў выглядзе пратакольнага прысуду.

Прысуд у выглядзе асобнай судовай пастановы суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць ва ўмовах, якія забяспечваюць захаванне тайны нарады суддзяў, па правілах, устаноўленых для прыняцця рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы.

Пратакольны прысуд можа быць вынесены судом, які разглядае эканамічныя справы, без выдалення з залы судовага пасяджэння. Пратакольны прысуд абвяшчаецца вусна і заносіцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 213. Змест прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, які выносіцца ў выглядзе асобнай судовай пастановы, павінны быць указаны:

найменне і склад суда, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў прысуд; найменне і нумар справы; дата і месца вынясення прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы; прозвішчы, уласныя імёны, імёны па бацьку (найменні) асоб, якія ўдзельнічаюць у справе; прадмет спрэчкі;

пытанне, па якім выносіцца прысуд;

матывы, паводле якіх суд, які разглядае эканамічныя справы, прыйшоў да сваіх высноў, са спасылкай на заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя прававыя акты;

выснова па пытанні, якое разглядаецца;

ці падлягае прысуд абскарджанню і апратэставанню, парадак і тэрміны яго абскарджання і апратэставання.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, што выносіцца ў выглядзе асобнай судовай пастановы, падпісваецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або калегіяльным складам суда, які разглядае эканамічныя справы, які яго вынес.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, што заносіцца ў пратакол судовага пасяджэння (пратакольным прысудзе), указваюцца пытанне, па якім выносіцца прысуд, і выснова па пытанні, якое разглядаецца, пры неабходнасці суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права ўказаць у ім матывы, паводле якіх ён прыйшоў да такой высновы.

Артыкул 214. Накіраванне прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, накіроўвае заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні копіі прысуду, вынесенага ў выглядзе асобнай судовай пастановы, асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншым зацікаўленым асобам не пазней за пяць дзён з дня вынясення прысуду суда, які разглядае эканамічныя

справы, калі іншы тэрмін не прадугледжаны гэтым Кодэксам, або ўручае ім копіі прысуду пад распіску.

Артыкул 215. Прыватны прысуд

У выпадку выяўлення пры разглядзе спрэчкі парушэння юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, службовымі асобамі або грамадзянамі заканадаўчых і іншых нарматыўных прававых актаў у іх дзейнасці суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права вынесці прыватны прысуд.

Прыватны прысуд накіроўваецца адпаведным юрыдычным асобам, індывідуальным прадпрымальнікам, дзяржаўным органам, органам мясцовага кіравання і самакіравання, службовым асобам або грамадзянам, якія абавязаны ў тэрмін, не большы за адзін месяц з дня вынясення прыватнага прысуду паведаміць у суд, які разглядае эканамічныя справы, аб прынятых мерах.

Прыватны прысуд можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 216. Парадак і тэрміны абскарджання прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, можа быць абскарджаны асобна ад судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, у выпадку, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам прадугледжана абскарджанне гэтага прысуду, а таксама калі ён перашкаджае далейшаму руху справы.

У дачыненні да прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, абскарджанне якога не прадугледжана гэтым Кодэксам, а таксама ў дачыненні да пратакольнага прысуду могуць быць заяўлены пярэчанні пры абскарджанні судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці.

Скарга на прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, можа быць пададзена не пазней за пятнаццаць дзён з дня вынясення прысуду, калі іншы тэрмін не прадугледжаны гэтым Кодэксам. Падача скаргі на прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, і яе разгляд ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам для апеляцыйнага абскарджання (апратэставання) рашэнняў суда, які разглядае эканамічныя справы.

ГЛАВА 23
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ АСОБНЫХ ВІДАХ ВЯДЗЕННЯ Ў СУДЗЕ, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ, ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

Артыкул 217. Асобныя віды вядзення

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, разглядаюць па першай інстанцыі справы асобных відаў вядзення па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных адпаведнымі главамі гэтага Кодэкса і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 218. Форма і змест заявы (скаргі) і дакументы, якія дадаюцца да яе

Заявы (скаргі), якія падаюцца ў суд, што разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, разгляд якіх адносіцца да падведамнасці суда, які разглядае эканамічныя справы, павінны змяшчаць звесткі і мець прыкладзеныя дакументы, прадугледжаныя артыкуламі 159 і 160 гэтага Кодэкса, якія адносяцца да патрабавання, выкладзенага ў заяве (скарзе), калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

Артыкул 219. Тэрмін разгляду спраў аб асобных відах вядзення

Справы па асобных відах вядзення разглядаюцца ў тэрмін не большы за адзін месяц з дня паступлення заявы (скаргі) у суд, які разглядае эканамічныя справы, уключаючы тэрмін на падрыхтоўку справы да судовага разбору і прыняцце рашэння па справе, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

ГЛАВА 24
ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ

Артыкул 220. Паняцце загаднага вядзення

Загадным вядзеннем з'яўляецца вынясенне судом, які разглядае эканамічныя справы, прысуду аб судовым загадзе без разбору і выкліку бакоў па заяве спагнанніка.

У загадным вядзенні разглядаюцца патрабаванні аб спагнанні грашовых сродкаў, аб выпатрабаванні маёмасці або аб звароце спагнання на маёмасць даўжніка, якія маюць бясспрэчны характар (заснаваны на дакументах, якія пацвярджаюць запазычанасць даўжніка), або прызнаюцца (не аспрэчваюцца) даўжніком, але не выконваюцца.

Не падлягаюць разгляду ў парадку загаднага вядзення патрабаванні:

аб выпатрабаванні ўласнікам або іншым законным уладальнікам нерухомай маёмасці;

аб выкананні гарантыйнага абавязацельства (за выключэннем банкаўскай гарантыі);

аб выкананні абавязацельства, якое вынікла з дагавора аб уступцы патрабавання або пераводзе абавязку (за выключэннем выпадкаў пісьмовага прызнання даўжніком запазычанасці);

спагнанне па якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ажыццяўляецца шляхам здзяйснення натарыусам выканаўчага надпісу.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе з'яўляецца выканаўчым дакументам і прыводзіцца ў выкананне ў парадку, устаноўленым для выканання судовых пастаноў.

Артыкул 221. Форма і змест заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення

Заява аб узбуджэнні загаднага вядзення падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах падсуднасці, устаноўленых артыкуламі 49–52 гэтага Кодэкса.

У заяве аб узбуджэнні загаднага вядзення павінны быць указаны:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца заява;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) спагнанніка і даўжніка, іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца знаходжання, банкаўскія рэквізіты, кантактныя тэлефоны, факсы і электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

патрабаванні спагнанніка са спасылкай на нормы заканадаўства;

абставіны, на якіх заснаваны патрабаванні, і доказы, якія пацвярджаюць іх;

разлік сумы, якая спаганяецца;

пералік дакументаў, якія дадаюцца.

Заява аб узбуджэнні загаднага вядзення падпісваецца спагнаннікам або яго прадстаўніком.

Да заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення павінны быць прыкладзены доказы накіравання даўжніку копіі дадзенай заявы і копій дакументаў, якія дадаюцца да

заявы і накіроўваюцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы. Да заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення, падпісанай прадстаўніком, павінна быць прыкладзена даверанасць, якая пацвярджае яго паўнамоцтвы на падпісанне заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення.

Артыкул 221[1]. Прыняцце заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення і ўзбуджэнне загаднага вядзення

Пытанне аб прыняцці судом, які разглядае эканамічныя справы, заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення вырашае суд, які разглядае эканамічныя справы, аднаасобна.

Аб узбуджэнні загаднага вядзення суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, у якім указвае даўжніку на неабходнасць падачы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, водгуку на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення ў парадку, прадугледжаным часткай першай артыкула 223 гэтага Кодэкса.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб узбуджэнні загаднага вядзення накіроўваецца спагнанніку і даўжніку не пазней за пяць дзён з дня паступлення заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 222. Падставы для адмовы ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення, калі:

заяўленыя патрабаванні не падлягаюць разгляду ў судзе, які разглядае эканамічныя справы;

заяўленыя патрабаванні не падлягаюць разгляду ў парадку загаднага вядзення;

даўжнік знаходзіцца па-за межамі юрысдыкцыі суда, які разглядае эканамічныя справы;

бачыцца наяўнасць спрэчкі аб праве, якую немагчыма вырашыць на падставе пададзеных дакументаў;

заява пададзена з парушэннем правіл падсуднасці;

па заяўленых патрабаваннях не аплачана дзяржаўная пошліна;

не захаваны патрабаванні да формы і зместу заявы, прадугледжаныя артыкулам 221 гэтага Кодэкса;

не пададзены дакументы, якія пацвярджаюць заяўленыя патрабаванні;

не прыкладзены доказы, якія пацвярджаюць накіраванне копіі заявы даўжніку.

Аб адмове ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня паступлення заявы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, толькі на падставах, прадугледжаных абзацамі другім, трэцім і шостым часткі першай гэтага артыкула.

Адмова ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення не пазбаўляе спагнанніка права пасля ліквідацыі абставін, якія сталі падставай для адмовы ў прыняцці заявы ў адпаведнасці з абзацамі шостым – дзясятым часткі першай гэтага артыкула, ізноў звярнуцца з заявай аб узбуджэнні загаднага вядзення.

Адмова ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення, за выключэннем выпадку, прадугледжанага абзацам другім часткі першай гэтага артыкула, не перашкаджае магчымасці падачы спагнаннікам іскавай заявы па тых жа патрабаваннях у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 223. Водгук на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення

Даўжнік на працягу сямі дзён з дня атрымання ім прысуду аб узбуджэнні загаднага вядзення падае ў выпадку нязгоды з заяўленымі патрабаваннямі ў суд, які разглядае эканамічныя справы, водгук на заяву з дадаваннем да яе дакументаў, якія пацвярджаюць пярэчанні супраць патрабаванняў спагнанніка. У водгуку на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення павінны быць указаны наяўныя пярэчанні супраць патрабаванняў спагнанніка са спасылкай на нормы заканадаўства, абставіны, на якія заснаваны пярэчанні, і доказы, якія пацвярджаюць выкладзеныя абставіны.

Непадача даўжніком ва ўстаноўлены тэрмін водгуку на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення, а таксама яго згода з заяўленымі патрабаваннямі з'яўляюцца падставамі для вынясення судом, які разглядае эканамічныя справы, прысуду аб судовым загадзе.

Артыкул 224. Адмова ў вынясенні прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе і падставы перадачы спрэчкі для разгляду ў парадку іскавага вядзення

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў вынясенні прысуду аб судовым загадзе, калі:

даўжнік падаў у суд, які разглядае эканамічныя справы, водгук на заяву аб узбуджэнні загаднага вядзення ў парадку, устаноўленым часткай першай артыкула 223 гэтага Кодэкса;

ад спагнанніка паступіла заява аб адмове ад заяўленых патрабаванняў або заява аб адкліканні (вяртанні) заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення;

у дачыненні да даўжніка прынята рашэнне аб ліквідацыі (спыненні дзейнасці) або ўзбуджана справа аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) і адкрыта конкурснае вядзенне.

Прысуд аб судовым загадзе можа быць вынесены на частку заяўленых патрабаванняў, якая прызнаецца, але не выконваецца даўжніком. У непрызнанай даўжніком частцы суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў вынясенні прысуду аб судовым загадзе.

Аб адмове ў вынясенні прысуду аб судовым загадзе суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які накіроўваецца спагнанніку не пазней за пяць дзён з дня яго прыняцця.

Калі ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля накіравання прысуду аб адмове ў вынясенні прысуду аб судовым загадзе ад спагнанніка паступіць хадайніцтва аб разглядзе справы ў парадку іскавага вядзення, суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае справу па агульных правілах іскавага вядзення, устаноўленых гэтым Кодэксам. Да хадайніцтва аб разглядзе справы ў парадку іскавага вядзення дадаюцца дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых пры падачы іскавай заявы, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў хадайніцтве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы хадайніцтва, а таксама копіі хадайніцтва ў колькасці экзэмпляраў, роўнай колькасці адказчыкаў.

Адмова ў вынясенні прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе, адмова ў задавальненні хадайніцтва аб разглядзе справы ў парадку іскавага вядзення не перашкаджаюць магчымасці падачы спагнаннікам іскавай заявы па тых жа патрабаваннях у агульным парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 225. Парадак вынясення і змест прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе

Справы ў парадку загаднага вядзення разглядаюцца ў тэрмін не большы за дваццаць дзён з дня паступлення заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, даследуе пісьмовыя доказы пры разглядзе справы ў парадку загаднага вядзення.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе павінны быць указаны:

нумар загаднага вядзення і дата вынясення прысуду, указанне аб уступленні прысуду ў законную сілу;

найменне і адрас суда, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць) суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, які вынес прысуд;

звесткі аб даўжніку і спагнанніку:

у дачыненні да грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), іх месца жыхарства (месца знаходжання). У дачыненні да грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, таксама павінны быць указаны дата і месца іх нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), даныя дакумента, які сведчыць асобу (ідэнтыфікацыйны нумар, серыя (пры іх наяўнасці), нумар, дата выдачы, найменне органа, які выдаў дакумент), месца працы (калі яно вядомае), а ў дачыненні да індывідуальнага прадпрымальніка, які з'яўляецца даўжніком, акрамя ўказанага – таксама рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі, уліковы нумар плацельшчыка;

у дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, – іх найменне і месца знаходжання, рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі, уліковы нумар плацельшчыка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь – найменне і месца знаходжання органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імені бокам выканаўчага вядзення;

памер належных спагнанню грашовых сродкаў або пералік маёмасці, якая падлягае спагнанню, з указаннем яе кошту;

памер няўстойкі, працэнтаў, калі іх спагнанне прадугледжана заканадаўчымі актамі або дагаворам;

сумы судовых выдаткаў, якія падлягаюць спагнанню з даўжніка ў бюджэт або на карысць спагнанніка.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе складаецца і падпісваецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, у трох экзэмплярах, адзін з якіх застаецца ў справе, другі накіроўваецца даўжніку, а трэці завяраецца пячаткай суда, які разглядае эканамічныя справы, з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і выдаецца спагнанніку.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе ўступае ў законную сілу з моманту вынясення.

Артыкул 226. Адмена прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе

Даўжнік мае права не пазней за дзесяць дзён з дня атрымання прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе падаць у той жа суд, які

разглядае эканамічныя справы, заяву з патрабаваннем аб яго адмене або аб адмене яго ў частцы, калі ён не меў магчымасці з-за ўважлівых прычын своечасова заявіць свае пярэчанні супраць патрабаванняў спагнанніка. У заяве павінны быць указаны пярэчанні супраць патрабаванняў спагнанніка са спасылкай на нормы заканадаўства, абставіны, на якіх заснаваны пярэчанні, доказы, якія пацвярджаюць выкладзеныя абставіны, а таксама прычыны несвоечасовай падачы пярэчанняў супраць патрабаванняў спагнанніка. Да заявы дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць пярэчанні даўжніка супраць патрабаванняў спагнанніка.

Іншая асоба, правы і (або) законныя інтарэсы якой закранаюцца прысудам суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе, у дзесяцідзённы тэрмін з дня, калі гэтай асобе стала вядома аб вынясенні такога прысуду, мае права падаць у той жа суд, які разглядае эканамічныя справы, заяву аб яго адмене або аб адмене яго ў частцы. У заяве павінны быць указаны са спасылкай на нормы заканадаўства звесткі аб тым, якія правы і (або) законныя інтарэсы гэтай асобы закрануты прысудам суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе, абставіны, на якіх заснаваны пярэчанні, доказы, якія пацвярджаюць выкладзеныя абставіны, а таксама абгрунтаванне захавання ўстаноўленага гэтай часткай тэрміну на падачу заявы. Да заявы дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць выкладзеныя ў заяве звесткі.

У выпадках, прадугледжаных часткамі першай і другой гэтага артыкула, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд аб адмене прысуду аб судовым загадзе, або прысуд аб адмене прысуду аб судовым загадзе ў частцы, або прысуд аб адмове ў адмене прысуду аб судовым загадзе.

Копіі прысуду аб адмене прысуду аб судовым загадзе, або прысуду аб адмене прысуду аб судовым загадзе ў частцы, або прысуду аб адмове ў адмене прысуду аб судовым загадзе накіроўваюцца бакам, а таксама іншай асобе, якая падала заяву аб адмене прысуду аб судовым загадзе або адмене яго ў частцы, правы і (або) законныя інтарэсы якой закранаюцца прысудам суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе, не пазней за тры дні пасля яго вынясення.

Пры адмене прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб судовым загадзе патрабаванні спагнанніка могуць быць разгледжаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 25
ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ПРАВЕРЦЫ ЗАКОННАСЦІ НЕНАРМАТЫЎНЫХ ПРАВАВЫХ АКТАЎ, ДЗЕЯННЯЎ (БЯЗДЗЕЙНАСЦІ) ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ, ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ, ІНШЫХ ОРГАНАЎ, СЛУЖБОВЫХ АСОБ

Артыкул 227. Падача заяў аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта і аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці)

Юрыдычная асоба, індывідуальны прадпрымальнік або грамадзянін, а таксама пракурор мае права падаць у суд, які разглядае эканамічныя справы, заявы аб прызнанні несапраўдным ненарматыўнага прававога акта дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа, які не адпавядае заканадаўству і якім парушаюцца правы і законныя інтарэсы юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў ці грамадзян, або аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы, калі лічаць, што парушаны правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна ў

сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, а таксама што ненарматыўны прававы акт, які аспрэчваецца, дзеянні (бяздзейнасць), якія абскарджваюцца, супярэчаць заканадаўчаму або іншаму нарматыўнаму прававому акту.

Заявы, прадугледжаныя часткай першай гэтага артыкула, могуць быць пададзены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у тэрмін, устаноўлены актамі заканадаўства.

Артыкул 228. Змест заяў аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта і аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці)

Заявы аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта і аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці) павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкуламі 159 і 160 гэтага Кодэкса, і змяшчаць дадаткова:

у дачыненні да ненарматыўнага прававога акта, які аспрэчваецца – найменне органа, службовай асобы, якія выдалі акт, дату яго выдання; указанне, якія правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна парушаюцца гэтым актам або яго асобнымі палажэннямі, якому заканадаўчаму або іншаму нарматыўнаму прававому акту супярэчыць акт, які абскарджваецца. Да заявы дадаецца копія акта, які аспрэчваецца, з указаннем, у якім сродку масавай інфармацыі і калі апублікаваны гэты акт, калі ён быў апублікаваны;

у дачыненні да дзеянняў (бяздзейнасці), якія абскарджваюцца, органа, службовай асобы – найменне органа, прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку службовай асобы, якія здзейснілі дзеянні (дапусцілі бяздзейнасць), што абскарджваюцца; указанне, якія правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна парушаюцца гэтымі дзеяннямі (бяздзейнасцю), патрабаванні якіх заканадаўчых або іншых нарматыўных прававых актаў парушаны гэтымі дзеяннямі (бяздзейнасцю).

Падача заявы аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта ў суд, які разглядае эканамічныя справы, і прыняцце яе да разгляду не прыпыняюць дзеянне ненарматыўнага прававога акта, які аспрэчваецца.

Артыкул 229. Разгляд заяў аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта і аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці)

Суд, які разглядае эканамічныя справы, на судовым пасяджэнні правярае:

кампетэнцыю дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы, якія выдалі ненарматыўны прававы акт, адпаведнасць гэтага ненарматыўнага прававога акта або яго асобных палажэнняў, якія абскарджваюцца, заканадаўчым і іншым нарматыўным прававым актам;

кампетэнцыю дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы, якія здзейснілі дзеянні (дапусцілі бяздзейнасць), што абскарджваюцца, адпаведнасць гэтых дзеянняў (бяздзейнасці) патрабаванням заканадаўчых або іншых нарматыўных прававых актаў.

Суд не звязаны падставамі і доказамі, выкладзенымі ў заявах аб аспрэчванні ненарматыўнага прававога акта або аб абскарджанні дзеянняў (бяздзейнасці).

Пры разглядзе заявы аб прызнанні ненарматыўнага прававога акта супярэчным заканадаўству на дзяржаўны орган, орган мясцовага кіравання і самакіравання, іншы орган або службовую асобу, якія выдалі такі акт, ускладаецца абавязак даказвання:

адпаведнасці гэтага акта заканадаўчаму або іншаму нарматыўнаму прававому акту;

наяўнасці ў дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы належных паўнамоцтваў на выданне ненарматыўнага прававога акта, які аспрэчваецца.

Абавязак даказвання законнасці дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы ўскладаецца на дзяржаўны орган, орган мясцовага кіравання і самакіравання, іншы орган або службовую асобу, якія здзейснілі дзеянні (дапусцілі бяздзейнасць), што абскарджваюцца.

Артыкул 230. Рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прызнанні несапраўдным ненарматыўнага прававога акта або аб прызнанні незаконнымі дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выявіўшы, што ненарматыўны прававы акт, які аспрэчваецца або дзеянні (бяздзейнасць), якія абскарджваюцца, дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы і законныя інтарэсы заяўніка ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, прымае рашэнні аб прызнанні ненарматыўнага прававога акта несапраўдным або аб прызнанні дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы незаконнымі.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаўшы заяву абгрунтаванай, выносіць рашэнне аб абавязку адпаведнага дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа або службовай асобы ліквідаваць у поўным аб'ёме дапушчанае парушэнне праў і законных інтарэсаў юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна.

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, накіроўваецца кіраўніку дзяржаўнага органа, органа мясцовага кіравання і самакіравання, іншага органа ці службовай асобе, ненарматыўны прававы акт або дзеянні (бяздзейнасць) якіх былі аспрэчаны (абскарджаны), або ў вышэйстаячы ў парадку падпарадкаванасці дзяржаўны орган ці службовай асобе для ліквідацыі дапушчаных парушэнняў заканадаўства на працягу пяці дзён з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы.

Аб выкананні рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, павінна быць паведамлена ў суд, які разглядае эканамічныя справы, і заяўніку ў тэрмін не большы за адзін месяц з дня атрымання рашэння.

ГЛАВА 25[1]
ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВАХ КАНТРОЛЬНЫХ (НАГЛЯДНЫХ) ОРГАНАЎ АБ УСТАНАЎЛЕННІ ПРЫПЫНЕННЯ (ЗАБАРОНЫ) ДЗЕЙНАСЦІ, АБ ПРАДАЎЖЭННІ ПРЫПЫНЕННЯ (ЗАБАРОНЫ) ВЫТВОРЧАСЦІ

Артыкул 230[1]. Падача заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці

Дзяржаўныя органы (іх структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы, тэрытарыяльныя органы, падпарадкаваныя арганізацыі) і іншыя арганізацыі,

упаўнаважаныя заканадаўчымі актамі або нарматыўнымі прававымі актамі Урада Рэспублікі Беларусь на ажыццяўленне кантролю (нагляду) за дзейнасцю суб'ектаў, якія правяраюцца (арганізацый, іх адасобленых падраздзяленняў, якія маюць уліковы нумар плацельшчыка, прадстаўніцтваў замежных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, а таксама асоб, якія ажыццяўляюць адвакацкую дзейнасць індывідуальна, рамесную дзейнасць, дзейнасць у сферы аграэкатурызму, часовых (антыкрызісных) кіраўнікоў, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі) і ўключаныя ў пералік кантрольных (наглядных) органаў, упаўнаважаных праводзіць праверкі, і сфер іх кантрольнай (нагляднай) дзейнасці, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (далей – кантрольныя (наглядныя) органы), пры ўзнікненні неабходнасці ва ўстанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці падаюць у суд, які разглядае эканамічныя справы, адпаведную заяву.

Заява аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, да сканчэння тэрміну прыпынення (забароны) вытворчасці, указанага ў патрабаванні (прадпісанні) кантрольнага (нагляднага) органа.

Да заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці павінны быць дададзены доказы накіравання суб'екту, які правяраецца, копіі адпаведнай заявы і копій дакументаў, якія дадаюцца да яе і накіраваны ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 230[2]. Змест заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці

Заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 159 і абзацамі чацвёртым і шостым часткі першай артыкула 160 гэтага Кодэкса, і змяшчаць дадаткова:

найменне суб'екта, які правяраецца;

абгрунтаванне неабходнасці ўстанаўлення прыпынення (забароны) дзейнасці, прадаўжэння прыпынення (забароны) вытворчасці з пацвярджэннем стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю гэтымі дзейнасцю, вытворчасцю;

тэрмін, на які прапануецца ўстанавіць прыпыненне (забарону) дзейнасці, прадоўжыць прыпыненне (забарону) вытворчасці;

пералік цэхаў, вытворчых участкаў, аб'ектаў будаўніцтва, абсталявання, устанаўленне прыпынення (забароны) дзейнасці якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю – пры ўстанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці цэхаў, вытворчых участкаў, аб'ектаў будаўніцтва, абсталявання;

указанне відаў тавараў (работ, паслуг), прадаўжэнне прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю – пры прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг);

указанне пераліку транспартных сродкаў, прадаўжэнне прыпынення (забароны) эксплуатацыі якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы

нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю – пры прадаўжэнні прыпынення (забароны) эксплуатацыі транспартных сродкаў.

Артыкул 230[3]. Тэрмін разгляду заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці

Заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці (у тым ліку і ў тых выпадках, калі суб'ектам, які правяраецца, з'яўляецца прадстаўніцтва замежнай арганізацыі) павінны быць разгледжаны судом, які разглядае эканамічныя справы, у тэрмін, не большы за дзесяць дзён з дня вынясення прысуду аб прызначэнні справы да судовага разбору. У выключных выпадках з улікам асаблівай складанасці справы старшынёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснікам тэрмін разгляду справы можа быць прадоўжаны да аднаго месяца.

Артыкул 230[4]. Разгляд заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці

Суд, які разглядае эканамічныя справы, на судовым пасяджэнні правярае:

кампетэнцыю кантрольнага (нагляднага) органа, які вынес прапанову аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабаванне (прадпісанне) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці;

падставы для вынясення прапановы аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабавання (прадпісання) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці;

наяўнасць дакументальнага пацвярджэння падстаў для ўстанаўлення прыпынення (забароны) дзейнасці, прадаўжэння прыпынення (забароны) вытворчасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, не звязаны падставамі і доказамі, выкладзенымі ў заявах аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці.

Абавязак даказвання наяўнасці паўнамоцтваў і падстаў для вынясення прапановы аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабавання (прадпісання) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці ўскладаецца на кантрольны (наглядны) орган, які вынес такую прапанову, патрабаванне (прадпісанне).

Артыкул 230[5]. Рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, па заявах аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выявіўшы адсутнасць падстаў для ўстанаўлення прыпынення (забароны) дзейнасці, прадаўжэння прыпынення (забароны) вытворчасці, выносіць рашэнні аб адмове ў задавальненні заяў аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаўшы заяву аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці абгрунтаванай, выносіць рашэнне аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, у якім указвае найменне суб'екта, які правяраецца, пералік яго цэхаў, вытворчых участкаў, аб'ектаў будаўніцтва, абсталявання, устанаўленне прыпынення (забароны) дзейнасці якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаўшы заяву аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці абгрунтаванай, выносіць рашэнне аб прадаўжэнні прыпынення (забароны) вытворчасці, у якім указвае найменне суб'екта, які правяраецца, віды тавараў (работ, паслуг), пералік транспартных сродкаў, прадаўжэнне прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі, эксплуатацыі якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспекі, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю.

ГЛАВА 26
ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ВЫЯЎЛЕННІ ФАКТАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ЮРЫДЫЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ (ЮРЫДЫЧНЫХ ФАКТАЎ)

Артыкул 231. Юрыдычныя факты, што выяўляюцца судом, які разглядае эканамічныя справы

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выяўляе факты, што маюць юрыдычнае значэнне для ўзнікнення, змянення або спынення праў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў ці грамадзян у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, разглядае справы аб выяўленні:

факта прыналежнасці нерухомай маёмасці на праве ўласнасці юрыдычнай асобе, індывідуальнаму прадпрымальніку або грамадзяніну;

факта добрасумленнага, адкрытага і бесперапыннага валодання юрыдычнай асобай, індывідуальным прадпрымальнікам або грамадзянінам нерухомай маёмасцю або іншай маёмасцю як сваёй уласнай;

факта рэгістрацыі юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна ў пэўны час і ў пэўным месцы;

факта прыналежнасці праваўстаноўчага дакумента, які дзейнічае ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, юрыдычнай асобе, індывідуальнаму прадпрымальніку або грамадзяніну, калі найменне юрыдычнай асобы або прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна, указаныя ў дакуменце, не супадаюць з найменнем юрыдычнай асобы ў яе ўстаноўчым дакуменце або належным чынам зарэгістраванымі прозвішчам, уласным іменем і іменем па бацьку індывідуальнага прадпрымальніка або грамадзяніна ў яго пашпарце ці пасведчанні аб нараджэнні;

іншых фактаў у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, якія цягнуць за сабой юрыдычныя наступствы для юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў або грамадзян.

Артыкул 232. Падача заявы аб выяўленні юрыдычнага факта

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае да свайго вядзення і разглядае на судовым пасяджэнні заяву аб выяўленні юрыдычнага факта пры наяўнасці ў сукупнасці наступных умоў, калі:

згодна з заканадаўствам, факт параджае юрыдычныя наступствы, гэта значыць цягне за сабой узнікненне, змяненне або спыненне праваадносін у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

выяўленне юрыдычнага факта не звязваецца з наступным вырашэннем спрэчкі аб праве, падведамнай суду, які разглядае эканамічныя справы;

заканадаўствам не прадугледжаны іншы (пазасудовы) парадак выяўлення дадзенай катэгорыі юрыдычных фактаў;

заяўнік не мае іншай магчымасці атрымаць або аднавіць належныя дакументы, якія выяўляюць юрыдычны факт.

Артыкул 233. Змест заявы аб выяўленні юрыдычнага факта

Заява аб выяўленні юрыдычнага факта павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 159 і абзацамі другім, чацвёртым – шостым часткі першай артыкула 160 гэтага Кодэкса, і змяшчаць дадаткова:

указанне на факт, аб выяўленні якога хадайнічае заяўнік;

указанне на нормы заканадаўчага акта, з якіх вынікае, што дадзены факт цягне за сабой юрыдычныя наступствы ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці;

абгрунтаванне неабходнасці выяўлення гэтага факта;

доказы, якія пацвярджаюць немагчымасць атрымання заяўнікам належных доказаў або аднаўлення страчаных дакументаў іншым спосабам.

Артыкул 234. Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб выяўленні юрыдычнага факта

Рашэнне па справе аб выяўленні юрыдычнага факта прымаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых главой 21 гэтага Кодэкса.

Пры задавальненні судом заявы аб выяўленні юрыдычнага факта ў рашэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, указваецца на наяўнасць юрыдычнага факта і выкладаецца выяўлены факт.

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, аб выяўленні юрыдычнага факта з'яўляецца дакументам, які пацвярджае юрыдычны факт, і падставай для рэгістрацыі такога факта або афармлення адпаведнымі органамі праў, якія ўзнікаюць у сувязі з выяўленым юрыдычным фактам, але не замяняе сабой дакументы, якія выдаюцца гэтымі органамі.

ГЛАВА 27
ВЯДЗЕННЕ ПА РАЗГЛЯДЗЕ ГАСПАДАРЧЫХ (ЭКАНАМІЧНЫХ) СПРЭЧАК І ІНШЫХ СПРАЎ З УДЗЕЛАМ ЗАМЕЖНЫХ АСОБ

Артыкул 235. Кампетэнцыя судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па разглядзе гаспадарчай (эканамічнай) спрэчак і іншых спраў з удзелам замежных асоб

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь разглядаюць гаспадарчыя (эканамічныя) спрэчкі і іншыя справы, звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці з удзелам замежных асоб, калі:

адказчык знаходзіцца ці пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь знаходзіцца яго маёмасць;

орган кіравання, філіял або прадстаўніцтва замежнай асобы знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

спрэчка вынікла з дагавора, паводле якога выкананне павінна мець месца або мела месца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

патрабаванне вынікла з прычынення шкоды маёмасці дзеяннем або іншымі абставінамі, якія мелі месца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або пры надыходзе шкоды на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

спрэчка вынікла з беспадстаўнага абагачэння, якое мела месца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

ісцец па справе аб абароне дзелавой рэпутацыі знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь;

спрэчка вынікла з адносін, звязаных з абарачэннем каштоўных папер, выпуск якіх меў месца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

заяўнік па справе аб выяўленні факта, які мае юрыдычнае значэнне, указвае на наяўнасць гэтага факта на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

спрэчка вынікла з адносін, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй імён і іншых аб'ектаў і аказаннем паслуг у міжнароднай асацыяцыі сетак Інтэрнэт на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

у іншых выпадках – пры наяўнасці цеснай сувязі спрэчных праваадносін з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь.

Справы аб спыненні дзейнасці філіяла або прадстаўніцтва замежнай асобы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разглядаюцца судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь у выпадках, калі гэта прадугледжана заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь разглядаюць справы па гаспадарчых (эканамічных) спрэчках і іншыя справы, звязаныя з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці з удзелам замежных асоб і аднесеныя ў адпаведнасці з артыкулам 236 гэтага Кодэкса да іх выключнай кампетэнцыі.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь разглядаюць таксама справы ў адпаведнасці з пагадненнем бакоў, заключаным па правілах, устаноўленых артыкулам 237 гэтага Кодэкса.

Справа, прынятая судом, які разглядае эканамічныя справы, да свайго разгляду з захаваннем правіл, устаноўленых гэтым артыкулам, павінна быць разгледжана ім па сутнасці, нават калі ў ходзе вядзення па справе ў сувязі са змяненнем месца знаходжання і (або) месца жыхарства асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або іншымі абставінамі яна стала адносіцца да кампетэнцыі замежнага суда.

Артыкул 236. Выключная кампетэнцыя судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па разглядзе спраў з удзелам замежных асоб

Да выключнай кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь адносіцца разгляд наступных спраў з удзелам замежных асоб:

па спрэчках у дачыненні да маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці Рэспублікі Беларусь, у тым ліку па спрэчках, звязаных з прыватызацыяй дзяржаўнай маёмасці і прымусовым адчужэннем маёмасці для дзяржаўных патрэб;

па спрэчках, прадметам якіх з'яўляецца нерухомая маёмасць, калі яна знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку аб выяўленні факта валодання нерухомай маёмасцю або права на яе;

па спрэчках аб прызнанні несапраўднымі запісаў у дзяржаўных рэестрах (рэгістрах, кадастрах), праведзеных дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якога ўваходзіць вядзенне такога рэестра (рэгістра, кадастру);

па спрэчках, звязаных з заснаваннем, рэгістрацыяй або ліквідацыяй на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама абскарджаннем рашэнняў органаў гэтых юрыдычных асоб;

аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, месцам знаходжання або месцам жыхарства якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь;

па спрэчках аб выключэнні маёмасці з вопісу або вызваленні яе ад арышту, калі арышт маёмасці праведзены адпаведным дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь;

па спрэчках, звязаных з прызнаннем несапраўднымі ненарматыўных прававых актаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання Рэспублікі Беларусь.

У выключнай кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь знаходзяцца таксама гаспадарчыя (эканамічныя) спрэчкі і іншыя справы, якія вынікаюць з адміністрацыйных праваадносін, прадугледжаныя артыкулам 42 гэтага Кодэкса, з удзелам замежных асоб.

Артыкул 237. Пагадненне аб вызначэнні кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь

Калі бакі, хаця б адзін з якіх з'яўляецца замежнай асобай, заключылі пагадненне, у якім вызначана, што суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь валодае кампетэнцыяй па разглядзе спрэчкі, якая ўзнікла або можа ўзнікнуць, звязанай з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкім і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь будзе валодаць выключнай кампетэнцыяй па разглядзе дадзенай спрэчкі пры ўмове, што такое пагадненне не змяняе выключнай кампетэнцыі замежнага суда.

Пагадненне аб вызначэнні кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь павінна быць заключана ў пісьмовай форме.

Артыкул 238. Кампетэнцыя судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па прымяненні забеспячальных мер пры разглядзе спраў з удзелам замежных асоб

Па справах з удзелам замежных асоб, аднесеных у адпаведнасці з гэтай главой да кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь, суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь мае права прыняць меры для забеспячэння іску згодна з правіламі, устаноўленымі главой 9 гэтага Кодэкса.

Артыкул 239. Судовы імунітэт

Замежная дзяржава, якая выступае ў якасці суверэна, валодае судовым імунітэтам ад прад'яўленага да яго іску ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, прыцягнення яе да ўдзелу ў справе ў якасці трэцяй асобы, накладання арышту на маёмасць, якая належыць замежнай дзяржаве і знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і прыняцця ў адносінах да яе судом, які разглядае эканамічныя справы, мер для забеспячэння іску і маёмасных інтарэсаў. Зварот спагнання на такую маёмасць у парадку прымусовага выканання судовай пастановы дапускаецца толькі са згоды кампетэнтных органаў адпаведнай дзяржавы, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Судовы імунітэт міжнародных арганізацый вызначаецца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Адмова ад судовага імунітэту ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам адпаведнай дзяржавы або правіламі міжнароднай арганізацыі. У выпадку афармлення адмовы ад імунітэту суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь разглядае справу ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 240. Працэсуальныя наступствы разгляду замежным судом справы па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь пакідае іск без разгляду згодна з правіламі, устаноўленымі главой 16 гэтага Кодэкса, калі ў вядзенні замежнага суда знаходзіцца на разглядзе справа па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах, пры ўмове, што разгляд дадзенай справы ў адпаведнасці з артыкулам 236 гэтага Кодэкса не адносіцца да выключнай кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь спыняе вядзенне па справе згодна з правіламі, устаноўленымі главой 15 гэтага Кодэкса, калі ёсць рашэнне замежнага суда, якое ўступіла ў законную сілу, прынятае па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах, пры ўмове, што разгляд дадзенай справы ў адпаведнасці з артыкулам 236 гэтага Кодэкса не адносіцца да выключнай кампетэнцыі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь або няма падстаў у адпаведнасці з артыкулам 248 гэтага Кодэкса для адмовы ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне ўказанага рашэння.

Артыкул 241. Парадак разгляду спраў з удзелам замежных асоб

Справы з удзелам замежных асоб разглядаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Справы з удзелам замежных асоб, калі гэтыя асобы або органы іх кіравання, філіялы, прадстаўніцтвы або іх прадстаўнікі, упаўнаважаныя на вядзенне справы, знаходзяцца або пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разглядаюцца ў тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

Калі замежныя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, што разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь, знаходзяцца або пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, яны апавяшчаюцца аб судовым разборы прысудам суда, які разглядае эканамічныя справы, шляхам накіравання даручэння ва ўстанову юстыцыі або іншы кампетэнтны орган замежнай дзяржавы. У такіх выпадках разгляд справы працягваецца судом, які разглядае эканамічныя справы, на тэрмін, устаноўлены міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь для накіравання даручэнняў ва ўстанову юстыцыі або іншы кампетэнтны орган замежнай дзяржавы, а пры адсутнасці ў дагаворы такога тэрміну або пры адсутнасці ўказанага дагавора – на тэрмін, не большы за шэсць месяцаў.

Артыкул 242. Працэсуальныя правы і працэсуальныя абавязкі замежных юрыдычных асоб, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства

Замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства карыстаюцца працэсуальнымі правамі і маюць працэсуальныя абавязкі нароўні з юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

Замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства маюць права звяртацца ў суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па правілах падведамнасці і падсуднасці, устаноўленых гэтым Кодэксам, у

мэтах абароны сваіх парушаных або аспрэчвальных праў і законных інтарэсаў у сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці.

Замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія ўдзельнічаюць у справе, павінны падаць у суд, які разглядае эканамічныя справы, доказы, якія пацвярджаюць іх юрыдычны статус і права на ажыццяўленне прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці. У выпадку непадачы такіх доказаў суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права выпатрабаваць іх па сваёй ініцыятыве.

Урад Рэспублікі Беларусь можа ўстанавіць абмежаванні ў адказ (рэторсіі) у дачыненні да праў грамадзян і юрыдычных асоб тых дзяржаў, у якіх ёсць спецыяльныя абмежаванні праў грамадзян і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 243. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да дакументаў замежнага паходжання

Дакументы, выдадзеныя, складзеныя або засведчаныя па ўстаноўленай форме кампетэнтнымі органамі замежных дзяржаў за межамі Рэспублікі Беларусь згодна з заканадаўствам замежных дзяржаў у дачыненні да юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян Рэспублікі Беларусь або замежных юрыдычных асоб, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, прымаюцца судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь пры наяўнасці іх легалізацыі або пастаўленага апастыля, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Дакументы, складзеныя на замежнай мове, пры падачы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь павінны суправаджацца належным чынам завераным іх перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 244. Даручэнні аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выконвае перададзеныя яму ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі і (або) міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, даручэнні замежных судоў і кампетэнтных органаў замежных дзяржаў аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў (уручэнне павестак і іншых дакументаў, атрыманне пісьмовых доказаў, правядзенне экспертызы, агляд на месцы і інш.).

Даручэнне замежнага суда або кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы не падлягае выкананню, калі:

выкананне даручэння супярэчыць публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь;

выкананне даручэння не адносіцца да кампетэнцыі суда, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь;

сапраўднасць даручэння як дакумента, на падставе якога просіцца здзяйсненне асобных працэсуальных дзеянняў, не высветлена.

Аб прыняцці да выканання даручэння замежнага суда аб аказанні прававой дапамогі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Аб выкананні судом, які разглядае эканамічныя справы, даручэння або аб адмове ў яго выкананні выносяцца прысуды, якія накіроўваюцца адпаведнаму замежнаму суду або кампетэнтнаму органу замежнай дзяржавы.

Прысуды аб выкананні судом, які разглядае эканамічныя справы, даручэння або аб адмове ў яго выкананні могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь могуць ва ўстаноўленым парадку звяртацца ў замежныя суды або кампетэнтныя органы замежных дзяржаў з даручэннямі аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў.

ГЛАВА 28
ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ПРЫЗНАННІ І ПРЫВЯДЗЕННІ Ў ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ ЗАМЕЖНЫХ СУДОЎ І ЗАМЕЖНЫХ АРБІТРАЖНЫХ РАШЭННЯЎ

Артыкул 245. Прызнанне і прывядзенне ў выкананне рашэнняў замежных судоў і замежных арбітражных рашэнняў

Рашэнні замежных судоў і замежныя арбітражныя рашэнні прызнаюцца і прыводзяцца ў выкананне судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь, калі прызнанне і прывядзенне ў выкананне такіх рашэнняў прадугледжана заканадаўствам ці міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь або на аснове ўзаемнасці.

Пытанні аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння вырашаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, па заяве боку спрэчкі, разгледжанай замежным судом, або боку трацейскага разбору.

Артыкул 246. Заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння

Заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння падаюцца спагнаннікам у суд, які разглядае эканамічныя справы, у Рэспубліцы Беларусь па месцы знаходжання ці месцы жыхарства даўжніка або па месцы знаходжання маёмасці даўжніка, калі месца знаходжання або месца жыхарства яго невядомыя.

Заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння падаюцца ў пісьмовай форме і павінны быць падпісаны спагнаннікам або яго прадстаўніком.

У заявах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння ўказваюцца:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца заява;

найменне і месца знаходжання замежнага суда, які прыняў рашэнне, або найменне, месца знаходжання і склад замежнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, які прыняў рашэнне;

найменне спагнанніка, яго месца знаходжання або месца жыхарства;

найменне даўжніка, яго месца знаходжання або месца жыхарства;

звесткі аб рашэнні замежнага суда або аб замежным арбітражным рашэнні, аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне якіх хадайнічае спагнаннік;

патрабаванне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння;

пералік дакументаў, якія дадаюцца.

У заявах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння могуць быць таксама ўказаны нумары тэлефонаў і (або) факсаў, адрасы электроннай пошты спагнанніка, даўжніка, іх прадстаўнікоў і іншыя звесткі.

Да заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, дадаюцца:

належным чынам пасведчаная копія рашэння замежнага суда, аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне якога хадайнічае спагнаннік;

належным чынам пасведчаны дакумент, які пацвярджае ўступленне рашэння замежнага суда ў законную сілу або пацвярджае, што яно падлягае выкананню да яго ўступлення ў законную сілу, калі гэта не ўказана ў тэксце рашэння;

належным чынам пасведчаны дакумент, які пацвярджае, што даўжнік быў своечасова апавешчаны належным чынам аб разборы справы ў замежным судзе, аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння якога хадайнічае спагнаннік;

належным чынам пасведчаныя даверанасць або іншы дакумент, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы асобы, што падпісала заяву;

дакумент, які пацвярджае накіраванне даўжніку копіі заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда;

належным чынам пасведчаны пераклад на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь дакументаў, указаных у абзацах другім – шостым гэтай часткі.

Да заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне замежнага арбітражнага рашэння, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, дадаюцца:

належным чынам пасведчанае арыгінальнае замежнае арбітражнае рашэнне або яго належным чынам пасведчаная копія;

арыгінальнае пагадненне аб арбітражным разборы або яго належным чынам завераная копія;

належным чынам пасведчаны пераклад на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь дакументаў, указаных у абзацах другім і трэцім гэтай часткі.

Да заяў аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння дадаецца таксама дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў адпаведнай заяве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы заявы.

Дакументы, указаныя ў гэтым артыкуле, прызнаюцца належным чынам пасведчанымі, калі яны адпавядаюць патрабаванням артыкула 243 гэтага Кодэкса.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, вяртае спагнанніку заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння без разгляду ў выпадку невыканання патрабаванняў да заяў, устаноўленых гэтым артыкулам.

Артыкул 247. Парадак разгляду заяў аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння

Заявы аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння разглядаюцца на судовым пасяджэнні суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, аднаасобна ў тэрмін не большы за адзін месяц з дня іх паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтай главой, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, паведамляе асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка

ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду справы.

Пры разглядзе справы суд, які разглядае эканамічныя справы, на судовым пасяджэнні высвятляе наяўнасць або адсутнасць падстаў для прызнання і прывядзення ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння, прадугледжаных артыкулам 248 гэтага Кодэкса, шляхам даследавання доказаў абгрунтавання заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў, пададзеных у суд, які разглядае эканамічныя справы.

Пры разглядзе справы суд, які разглядае эканамічныя справы, не мае права пераглядаць рашэнне замежнага суда, замежнае арбітражнае рашэнне па сутнасці.

Артыкул 248. Падставы для адмовы ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда ў цэлым або яго часткі, калі:

рашэнне па праве дзяржавы, на тэрыторыі якой яно прынята, не ўступіла ў законную сілу, калі міжнародны дагавор Рэспублікі Беларусь не дапускае прызнання і прывядзення ў выкананне рашэння да яго ўступлення ў законную сілу;

бок, супраць якога прынята рашэнне, не быў своечасова апавешчаны належным чынам аб часе і месцы разгляду справы або з-за іншых прычын не мог падаць у суд свае тлумачэнні;

разгляд справы ў адпаведнасці з заканадаўствам або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь адносіцца да выключнай кампетэнцыі суда ў Рэспубліцы Беларусь;

ёсць рашэнне суда ў Рэспубліцы Беларусь, якое ўступіла ў законную сілу і прынята па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах;

на разглядзе суда ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца справа па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах, вядзенне па якой узбуджана да ўзбуджэння вядзення па справе ў замежным судзе, або калі суд у Рэспубліцы Беларусь першым прыняў да свайго вядзення заяву па спрэчцы паміж тымі ж асобамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах;

скончыўся тэрмін даўнасці прывядзення рашэння замежнага суда да прымусовага выканання і гэты тэрмін не адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы;

выкананне рашэння замежнага суда супярэчыла б публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне замежнага арбітражнага рашэння ў цэлым або яго часткі на падставе, прадугледжанай абзацам восьмым часткі першай гэтага артыкула, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 249. Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння

Па выніках разгляду заяў аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуды.

У прысудах суда, які разглядае эканамічныя справы, па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння павінны змяшчацца:

найменне і месца знаходжання замежнага суда, які прыняў рашэнне, або найменне, месца знаходжання і склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, які прыняў рашэнне;

найменні спагнанніка і даўжніка;

звесткі аб рашэнні замежнага суда або аб замежным арбітражным рашэнні, аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне якіх хадайнічае спагнаннік;

указанне на прызнанне і прывядзенне ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння або на адмову ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння ўступаюць у законную сілу з моманту іх вынясення і могуць быць абскарджаны ў суд касацыйнай або нагляднай інстанцыі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 250. Прымусовае выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння

Прымусовае выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, на падставе выканаўчых дакументаў, выдадзеных судом, які разглядае эканамічныя справы і вынес прысуды аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага арбітражнага рашэння.

Рашэнне замежнага суда або замежнае арбітражнае рашэнне могуць быць прад'яўлены да прымусовага выканання ў тэрмін не большы за тры гады з дня ўступлення іх у законную сілу. Калі ўказаны тэрмін прапушчаны, ён можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве спагнанніка па правілах, устаноўленых главой 12 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 29
ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ АБСКАРДЖАННІ РАШЭННЯЎ МІЖНАРОДНЫХ АРБІТРАЖНЫХ (ТРАЦЕЙСКІХ) СУДОЎ, ТРАЦЕЙСКІХ СУДОЎ, ІНШЫХ ПАСТАЯННЫХ АРБІТРАЖНЫХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, І АБ ВЫДАЧЫ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА

Артыкул 251. Суд, які разглядае эканамічныя справы, які адмяняе рашэнні міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў

Судом, які разглядае эканамічныя справы і адмяняе рашэнні міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, з'яўляецца эканамічны суд вобласці (горада Мінска) па месцы знаходжання міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія вынеслі рашэнне.

Артыкул 252. Тэрмін для заявы хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць

заяўлена на працягу трох месяцаў з дня, калі бок, які заяўляе такое хадайніцтва, атрымаў указанае рашэнне, або з дня вынясення міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, іншым пастаянным арбітражным органам рашэнняў аб хадайніцтве аб выпраўленні ва ўказаным рашэнні дапушчаных апісак, памылак друку і арыфметычных памылак ці іншых памылак аналагічнага характару або аб тлумачэнні асобнага пункта ці часткі рашэння.

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, заяўленае пасля сканчэння тэрміну на яго заяву, вяртаецца асобе, якая яго заявіла.

Аб вяртанні хадайніцтва суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня яго паступлення ў суд выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Тэрмін заявы хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Артыкул 253. Форма і змест хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа заяўляецца ў пісьмовай форме бокам па справе, разгледжанай міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, іншым пастаянным арбітражным органам.

У хадайніцтве аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ўказваюцца:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які заяўляецца хадайніцтва;

найменне, месца знаходжання і склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія прынялі рашэнне;

найменне бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору і іх месца знаходжання або месца жыхарства;

нумар рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, дата і месца яго вынясення;

дата атрымання рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа бокам, які заяўляе хадайніцтва аб яго адмене;

патрабаванне аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

падставы для адмены рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, прадугледжаныя артыкулам 255 гэтага Кодэкса або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа падпісвае асоба, якая заяўляе хадайніцтва, або яе прадстаўнік.

Да хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа дадаюцца:

копіі хадайніцтва ў колькасці экзэмпляраў па колькасці бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору;

натарыяльна завераная копія рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда для разгляду асобнай спрэчкі або копія рашэння пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, завераная старшынёй адпаведнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў хадайніцтве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы хадайніцтва;

даверанасць, якая пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка асобы на падпісанне хадайніцтва.

Хадайніцтва, заяўленае з парушэннем патрабаванняў да яго формы і зместу, устаноўленых гэтым артыкулам, вяртаецца асобе, якая яго заявіла.

Аб вяртанні хадайніцтва суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня яго паступлення ў суд выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 254. Разгляд хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа разглядае суд на судовым пасяджэнні з выпатрабаваннем справы.

Міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган абавязаны выслаць справу ў суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня паступлення запыту суда, які разглядае эканамічныя справы, у міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган.

Пры разглядзе хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа суд, які разглядае эканамічныя справы, правярае ў межах прад'яўленых у хадайніцтве патрабаванняў і пададзеных доказаў прытрымліванне міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, іншым пастаянным арбітражным органам пры прыняцці рашэння палажэнняў, прадугледжаных артыкулам 255 гэтага Кодэкса. Суд, які разглядае эканамічныя справы, не мае права даследаваць абставіны, выяўленыя міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, іншым пастаянным арбітражным органам, або пераглядаць рашэнне гэтага суда па сутнасці.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, пры разглядзе хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа незалежна ад указаных бокам падстаў для адмены правярае адпаведнасць указанага рашэння патрабаванням, устаноўленым часткай трэцяй артыкула 255 гэтага Кодэкса.

Артыкул 255. Абскарджанне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа і падставы для яго адмены

Абскарджанне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць праведзена толькі шляхам заявы хадайніцтва ў суд, які разглядае эканамічныя справы, аб яго адмене на падставах, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула.

Рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць адменена судом, які разглядае эканамічныя справы, на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аб міжнародных арбітражных (трацейскіх) судах. Рашэнне трацейскага суда можа быць адменена судом, які разглядае эканамічныя справы, на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аб трацейскіх судах.

Рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць адменена таксама ў выпадках, калі прадмет спрэчкі не можа быць прадметам арбітражнага (трацейскага) разбору згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або калі рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа супярэчыць публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь.

Пры заяве хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа суд, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве аднаго з бакоў мае права адкласці разгляд гэтага хадайніцтва на ўстаноўлены ім тэрмін, каб даць міжнароднаму арбітражнаму (трацейскаму) суду, трацейскаму суду, іншаму пастаяннаму арбітражнаму органу магчымасць аднавіць разбор справы або выканаць іншыя дзеянні, якія, паводле меркавання міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, дазволяць ліквідаваць падставы для адмены арбітражнага (трацейскага) рашэння.

Артыкул 256. Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб абскарджанні рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Па выніках разгляду хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб абскарджанні рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа павінны змяшчацца:

звесткі аб рашэнні, якое абскарджваецца, і аб месцы яго прыняцця;

звесткі аб найменні і складзе міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія прынялі рашэнне, якое абскарджваецца;

найменні бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору;

указанні на адмену рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ў цэлым або яго часткі або на адмову ў задавальненні патрабавання заяўніка ў цэлым або яго часткі.

Адмена рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа не перашкаджае паўторнаму звароту ў міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган бакамі арбітражнага (трацейскага) разбору, калі магчымасць такога звароту не страчана, або ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Калі рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа адменена судом, які разглядае эканамічныя справы, з прычыны несапраўднасці арбітражнага (трацейскага) пагаднення, або калі рашэнне было прынята аб спрэчцы, не прадугледжанай арбітражным (трацейскім) пагадненнем, або калі рашэнне не падпадае пад умовы арбітражнага (трацейскага) пагаднення, або калі рашэнне змяшчае пастановы па пытаннях, якія не ахапляюцца арбітражным (трацейскім) пагадненнем, бакі арбітражнага (трацейскага) пагаднення могуць звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб абскарджанні рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 257. Форма і змест заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Заяву аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ў выпадку невыканання добраахвотна рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа падае юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік, на карысць якіх прынята рашэнне, у суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства даўжніка або па месцы знаходжання маёмасці даўжніка, калі месца знаходжання або месца жыхарства яго невядомыя.

У заяве аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ўказваюцца:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца заява;

найменне, месца знаходжання і склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія прынялі рашэнне;

найменне бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору і іх месца знаходжання або месца жыхарства;

нумар рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, дата і месца яго вынясення;

патрабаванне аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Заяву аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага

пастаяннага арбітражнага органа падпісвае асоба, якая яе падае, або прадстаўнік гэтай асобы.

Да заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа дадаюцца:

арыгінал або натарыяльна завераная копія рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда для разгляду асобнай спрэчкі, арыгінал або копія рашэння пастаянна дзейнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, завераная старшынёй адпаведнага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

арыгінал або належным чынам пасведчаная копія арбітражнага (трацейскага) пагаднення;

дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы заявы;

доказы, якія пацвярджаюць факт невыканання іншым бокам па справе рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ў тэрмін, устаноўлены ў ім;

даверанасць, якая пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка асобы на падпісанне заявы.

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць пададзена на працягу шасці месяцаў з дня заканчэння тэрміну добраахвотнага выканання рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, пададзеная пасля сканчэння тэрміну на яе падачу, а таксама з парушэннем патрабаванняў да яе формы і зместу, устаноўленых гэтым артыкулам, вяртаецца асобе, якая яго падала.

Аб вяртанні заявы суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня яе паступлення ў суд выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Тэрмін падачы заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Артыкул 258. Выдача выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Пытанне аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа аб спрэчцы, якая вынікла з грамадзянскіх

праваадносін пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, па заяве боку арбітражнага разбору, на карысць якога прынята рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Артыкул 259. Парадак разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Заяву аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа разглядае суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, аднаасобна ў тэрмін не большы за адзін месяц з дня яе паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, суддзя мае права выпатрабаваць з міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа матэрыялы справы, па якой просіцца выканаўчы дакумент, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для выпатрабавання доказаў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, паведамляе належным чынам бакам арбітражнага (трацейскага) разбору аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа.

Пры разглядзе заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа суд, які разглядае эканамічныя справы, на судовым пасяджэнні выяўляе наяўнасць або адсутнасць падстаў для выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, прадугледжаных артыкулам 260 гэтага Кодэкса, шляхам даследавання доказаў абгрунтавання заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў, пададзеных у суд, які разглядае эканамічныя справы.

Калі ў выпадках, прадугледжаных абзацам шостым часткі першай артыкула 260 гэтага Кодэкса, на разглядзе суда, які разглядае эканамічныя справы, знаходзяцца хадайніцтвы аб адмене або аб прыпыненні выканання рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, суд, які разглядае эканамічныя справы, у якім разглядаецца заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне гэтага рашэння, калі прызнае мэтазгодным, мае права па хадайніцтве боку, які падаў заяву аб выдачы выканаўчага дакумента, адкласці разгляд гэтай заявы, а таксама абавязаць іншы бок даць належнае забеспячэнне па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Артыкул 260. Падставы для адмовы ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага

арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права адмовіць у выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ў выпадку, калі бок арбітражнага (трацейскага) разбору, супраць якога прынята рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, падасць доказы, што:

арбітражнае (трацейскае) пагадненне несапраўднае на падставах, прадугледжаных законам;

хаця б адзін з бакоў не быў належным чынам апавешчаны аб выбранні (прызначэнні) арбітраў або аб арбітражным (трацейскім) разборы, у тым ліку аб часе і месцы правядзення пасяджэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, або з-за іншых уважлівых прычын не мог падаць у міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган свае тлумачэнні;

рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа прынята аб спрэчцы, не прадугледжанай арбітражным (трацейскім) пагадненнем, або аб спрэчцы, якая не падпадае пад яго ўмовы, або змяшчае пастановы па пытаннях, якія выходзяць за межы арбітражнага (трацейскага) пагаднення. Калі ў рашэнні міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа пастановы па пытаннях, якія ахопліваюцца арбітражным (трацейскім) пагадненнем, могуць быць аддзелены ад тых, якія не ахопліваюцца такім пагадненнем, суд, які разглядае эканамічныя справы, мае права выдаць выканаўчы дакумент толькі на тую частку рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якая ўтрымлівае пастановы па пытаннях, якія ахопліваюцца арбітражным (трацейскім) пагадненнем;

склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа або працэдура арбітражнага (трацейскага) разбору не адпавядалі пагадненню бакоў або заканадаўству;

рашэнне яшчэ не стала абавязковым для бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору, або было адменена, або яго выкананне было прыпынена судом, які разглядае эканамічныя справы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, калі выявіць, што:

спрэчка, разгледжаная міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, трацейскім судом, іншым пастаянным арбітражным органам, не можа быць прадметам арбітражнага (трацейскага) разбору ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа парушае асноватворныя прынцыпы права Рэспублікі Беларусь.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, таксама мае права адмовіць у выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага

органа на іншых падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 261. Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа

Па выніках разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа павінны змяшчацца:

звесткі аб найменні і складзе міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

найменні бакоў арбітражнага (трацейскага) разбору;

звесткі аб рашэнні міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне якога хадайнічае заяўнік;

указанні на выдачу выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа або на адмову ў выдачы выканаўчага дакумента.

Адмова ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа не перашкаджае паўторнаму звароту ў міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган, калі магчымасць такога звароту не страчана, або ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Калі ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа ў цэлым або яго часткі адмоўлена судом, які разглядае эканамічныя справы, з прычыны несапраўднасці арбітражнага (трацейскага) пагаднення, або калі рашэнне было прынята па спрэчцы, не прадугледжанай арбітражным (трацейскім) пагадненнем, або калі рашэнне не падпадае пад умовы арбітражнага (трацейскага) пагаднення, або калі рашэнне змяшчае пастановы па пытаннях, якія не ахопліваюцца арбітражным (трацейскім) пагадненнем, бакі арбітражнага (трацейскага) разбору могуць звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, трацейскага суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 262. Выключаны

Артыкул 262[1]. Форма і змест заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення, якое адпавядае патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні, у выпадку невыканання добраахвотна медыятыўнага пагаднення падаецца зацікаўленым бокам медыятыўнага пагаднення ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання або месцы жыхарства (месцы знаходжання) даўжніка або па месцы знаходжання маёмасці даўжніка, калі месца знаходжання або месца жыхарства (месца знаходжання) яго невядомыя.

У заяве аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення ўказваюцца:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца заява;

прозвішчы, уласныя імёны, імёны па бацьку (найменні) бакоў медыятыўнага пагаднення, іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца знаходжання, кантактныя тэлефоны, факсы і электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку медыятара, яго месца знаходжання, кантактныя тэлефоны, факсы і электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

патрабаванне аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення.

Да заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення дадаюцца:

арыгінал медыятыўнага пагаднення;

доказы, якія пацвярджаюць факт невыканання іншым бокам медыятыўнага пагаднення ў тэрмін, устаноўлены ў ім;

даверанасць, якая пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка асобы на падпісанне заявы;

дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы заявы.

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення і дакументы, якія дадаюцца да яе, могуць быць пададзены ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у электронным выглядзе.

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць пададзена на працягу шасці месяцаў з дня заканчэння тэрміну добраахвотнага выканання медыятыўнага пагаднення.

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення, пададзеная пасля сканчэння тэрміну на яе падачу, а таксама з парушэннем патрабаванняў да яе формы і зместу, устаноўленых гэтым артыкулам, вяртаецца асобе, якая яе падала.

Аб вяртанні заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за пяць дзён з дня яе паступлення ў суд выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Тэрмін падачы заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Артыкул 262[2]. Парадак разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

Заява аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення разглядаецца на судовым пасяджэнні суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, аднаасобна ў тэрмін, не большы за адзін месяц з дня яе паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы, уключаючы тэрмін на вынясенне прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Бакі медыятыўнага пагаднення апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення.

Па выніках разгляду заявы аб выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 262[3]. Адмова ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення, калі выявіць, што медыятыўнае пагадненне не адпавядае патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні і (або) медыятыўнае пагадненне заключана з удзелам асобы, якая не мае пасведчання медыятара, выдадзенага Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Адмова ў выдачы выканаўчага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення не перашкаджае звароту ў суд, які разглядае эканамічныя справы, для вырашэння спрэчкі па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 30
ІНШЫЯ ВІДЫ ВЯДЗЕННЯ Ў СУДЗЕ, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ, ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

Артыкул 263. Выключаны

Артыкул 264. Выключаны

Артыкул 265. Вядзенне па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)

Справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў разглядаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве).

Артыкул 266. Вядзенне па справах аб скаргах на натарыяльныя дзеянні або адмову ў іх здзяйсненні

Асобы, якія звярнуліся за здзяйсненнем натарыяльнага дзеяння і лічаць няправільным здзейсненае натарыяльнае дзеянне або неправамернай адмову ў яго здзяйсненні, а таксама асобы, інтарэсы якіх парушаны ў сувязі са здзяйсненнем натарыяльнага дзеяння, маюць права падаць скаргу ў суд, які разглядае эканамічныя

справы, па месцы знаходжання адпаведных натарыяльнай канторы, натарыяльнага бюро або іншага органа, службовай асобе якой у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дадзена права афармляць натарыяльныя дзеянні.

Скаргі на няправільнае засведчанне завяшчання або на адмову ў яго засведчанні капітанам марскога судна або судна ўнутранага плавання, якое плавае пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, падаюцца ў суд па месцы прыпіскі судна або па месцы ўліку судна ў Рэспубліцы Беларусь.

Скарга падаецца ў суд не пазней за дзесяць дзён з дня, калі заяўніку стала вядома аб здзейсненым натарыяльным дзеянні або аб адмове ў яго здзяйсненні.

Скарга разглядаецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы, з удзелам заяўніка і натарыуса або службовай асобы, якія здзейснілі натарыяльнае дзеянне, што абскарджваецца, або якія адмовілі ў здзяйсненні натарыяльнага дзеяння. Няяўка ўказаных асоб не перашкаджае вырашэнню справы.

Артыкул 266[1]. Вядзенне па справах, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

Справы, якія вынікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, разглядаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для асобных відаў вядзення.

Артыкул 266[2]. Вядзенне па справах аб скаргах на адказы на звароты юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў або грамадзян

Юрыдычная асоба, індывідуальны прадпрымальнік або грамадзянін могуць звярнуцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, са скаргай на адказ арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка) на зварот, рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці, адказ на скаргу ў вышэйстаячую арганізацыю (далей – скарга на адказ на зварот), калі лічаць, што парушаны іх правы і законныя інтарэсы ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці.

Скарга на адказ на зварот павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 159 і абзацамі другім, чацвёртым – шостым часткі першай артыкула 160 гэтага Кодэкса, і змяшчаць дадаткова найменне арганізацыі (прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку (пры яго наяўнасці) індывідуальнага прадпрымальніка), якая дала адказ на зварот, дату адказу на зварот, указанне на тое, якія правы і законныя інтарэсы заяўніка парушаюцца гэтым адказам або яго асобнымі палажэннямі, патрабаванні якіх заканадаўчых або іншых нарматыўных прававых актаў парушаны гэтым адказам. Да скаргі дадаецца копія адказу на зварот, які абскарджваецца.

Скарга на адказ на зварот можа быць пададзена ў суд, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за месяц з дня атрымання заяўнікам адказу вышэйстаячай арганізацыі на зварот (пры адсутнасці абавязковага дасудовага парадку абскарджання – з дня атрымання заяўнікам адказу арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка)) або з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі на адказ на зварот у вышэйстаячую арганізацыю, калі заяўнік не атрымаў на яе адказ.

Прапушчаны з-за ўважлівых прычын тэрмін для падачы скаргі на адказ на зварот можа быць адноўлены судом.

Скарга на адказ на зварот разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, з апавяшчэннем асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Няяўка апавешчаных

належным чынам асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае разгляду скаргі на адказ на зварот у іх адсутнасць.

Па выніках разгляду скаргі на адказ на зварот суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць рашэнне.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, прызнаўшы адказ на зварот, які абскарджваецца, адказам, які парушае правы і законныя інтарэсы заяўніка, прызнае скаргу абгрунтаванай і выносіць рашэнне аб абавязку арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка) ліквідаваць дапушчанае парушэнне.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, выявіўшы, што адказ на зварот, які абскарджваецца, быў дадзены ў адпаведнасці з заканадаўствам у межах паўнамоцтваў арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні скаргі.

Рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, па скарзе на адказ на зварот для ліквідацыі дапушчаных парушэнняў накіроўваецца кіраўніку арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку), адказ на зварот якога быў абскарджаны, на працягу пяці дзён з дня ўступлення рашэння ў законную сілу.

Аб выкананні рашэння суда, які разглядае эканамічныя справы, па скарзе на адказ на зварот павінна быць паведамлена суду, які разглядае эканамічныя справы, і заяўніку не пазней чым у месячны тэрмін з дня атрымання такога рашэння.

Артыкул 266[3]. Вядзенне па справах аб скаргах (пратэстах) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, кіраўніка органа прымусовага выканання

Пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, могуць быць абскарджаны бакамі выканаўчага вядзення, іншымі асобамі, чые правы і законныя інтарэсы парушаны пры выкананні выканаўчых дакументаў, або апратэставаны пракурорам у суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы знаходжання адпаведнага органа прымусовага выканання.

Пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, могуць быць абскарджаны (апратэставаны) у выпадку нязгоды з пастановамі кіраўніка органа прымусовага выканання або вышэйстаячага кіраўніка органа прымусовага выканання, вынесенымі па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на такія пастановы, дзеянні (бяздзейнасць), пададзенай у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні. Скаргі (пратэсты) могуць быць пададзены на працягу дзесяці дзён з дня атрымання пастаноў кіраўніка органа прымусовага выканання, вынесеных па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, пададзенай у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

Пастановы Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь могуць быць абскарджаны (апратэставаны) на працягу дзесяці дзён з дня іх атрымання. Дзеянні (бяздзейнасць) Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь могуць быць абскарджаны (апратэставаны) на працягу дзесяці дзён з дня здзяйснення такіх дзеянняў (выяўлення факта такой бяздзейнасці) або з дня, калі асоба, якая падае

скаргу (пратэст), не апавешчаная аб часе і месцы здзяйснення гэтых дзеянняў, даведалася або павінна была даведацца аб іх здзяйсненні.

Тэрмін, прадугледжаны часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, можа быць адноўлены ў парадку, устаноўленым артыкулам 138 гэтага Кодэкса.

Скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым часткамі першай і другой артыкула 159 і часткай першай артыкула 160 гэтага Кодэкса.

У скарзе (пратэсце) таксама павінны быць указаны:

найменне выканаўчага дакумента, у сувязі з выкананнем якога абскарджваюцца (апратэстоўваюцца) пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, нумар выканаўчага дакумента і дата яго выдачы, патрабаванні, якія змяшчаюцца ў выканаўчым дакуменце;

найменне суда, іншага ўпаўнаважанага органа, прозвішча і ініцыялы службовай асобы, якія выдалі выканаўчы дакумент.

Да скаргі (пратэсту) павінны быць прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць накіраванне копіі гэтай скаргі (пратэсту) і прыкладзеных да яе дакументаў бакам выканаўчага вядзення, судоваму выканаўцу, кіраўніку органа прымусовага выканання, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца (апратэстоўваюцца), кіраўніку органа прымусовага выканання, які вынес пастанову па выніках разгляду скаргі (пратэсту), пададзенай у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

Суддзя вяртае скаргу (пратэст) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, без разгляду ў выпадку, калі будзе выяўлена, што гэта скарга (пратэст) пададзена з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых часткамі шостай і сёмай гэтага артыкула, часткамі першай і другой артыкула 159 і часткай першай артыкула 160 гэтага Кодэкса.

Скаргі (пратэсты) разглядаюцца не пазней за дзесяць дзён з дня паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Аб часе і месцы разгляду скаргі (пратэсту) апавяшчаюцца асоба, якая падала скаргу, пракурор, які прынёс пратэст, бакі выканаўчага вядзення і судовы выканаўца, кіраўнік органа прымусовага выканання, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца (апратэстоўваюцца), а таксама кіраўнік органа прымусовага выканання, які вынес пастанову па выніках разгляду скаргі (пратэсту), пададзенай у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы разгляду скаргі (пратэсту), не з'яўляецца перашкодай для разгляду скаргі (пратэсту).

Па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, а таксама на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, звязаныя з непасрэдным выкананнем выканаўчых дакументаў, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць рашэнне.

У выпадку прызнання скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання абгрунтаванай суд, які разглядае эканамічныя справы, у

рэзалютыўнай частцы рашэння вызначае меры, якія павінны быць прыняты судовым выканаўцам, кіраўніком органа прымусовага выканання, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджаны (апратэставаны), для ліквідацыі дапушчаных імі парушэнняў.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, адмаўляе ў задавальненні скаргі (пратэсту), калі выявіць, што пастановы або дзеянні (бяздзейнасць), якія абскарджваюцца (апратэстоўваюцца) вынесены або здзейснены судовым выканаўцам, кіраўніком органа прымусовага выканання ў адпаведнасці з законам, у межах іх паўнамоцтваў і правы і законныя інтарэсы бакоў выканаўчага вядзення, іншых асоб не былі парушаны пры выкананні выканаўчых дакументаў.

РАЗДЗЕЛ III
ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ

ГЛАВА 31
ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ, ЯКІ РАЗГЛЯДАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ СПРАВЫ, АПЕЛЯЦЫЙНАЙ ІНСТАНЦЫІ

Артыкул 267. Права апеляцыйнага абскарджання (апратэставання)

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама асобы, не прыцягнутыя да ўдзелу ў справе, чые правы і законныя інтарэсы парушаны судовай пастановай, вынесенай па справе, калі суд, які разглядае эканамічныя справы, прыняў судовую пастанову аб іх правах і абавязках, маюць права падаць апеляцыйную скаргу.

Пракурор, які ўдзельнічаў у разглядзе справы, мае права прынесці пратэст на рашэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі ў мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў незалежна ад абскарджання яго бакамі і іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама асобамі, не прыцягнутымі да ўдзелу ў справе, чые правы і законныя інтарэсы парушаны судовай пастановай, і іх згоды на прынясенне пратэсту. У выпадках прынясення пракурорам пратэсту ў мэтах абароны інтарэсаў юрыдычных асоб, якія не маюць у статутным фондзе долі дзяржаўнай уласнасці, а таксама ў мэтах абароны інтарэсаў індывідуальных прадпрымальнікаў або грамадзян дадаецца пісьмовая заява, якая пацвярджае іх згоду на прынясенне такога пратэсту.

Артыкул 268. Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі

Апеляцыйныя скаргі (пратэсты) разглядае суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі эканамічнага суда вобласці (горада Мінска).

Склад суда, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі прызначаецца старшынёй адпаведнага эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) або яго намеснікам у колькасці не меншай за тры суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 269. Тэрмін падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту)

Апеляцыйная скарга (пратэст) можа быць пададзена на працягу пятнаццаці дзён пасля прыняцця судом, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі судовай пастановы, якая абскарджваецца, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

Па хадайніцтве асобы, якая падае скаргу (пратэст), прапушчаны тэрмін падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту) можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі пры ўмове, калі хадайніцтва заяўлена не пазней за адзін месяц з дня прыняцця судовай пастановы, якая абскарджваецца, і

прычыны пропуску тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту) судом, які разглядае эканамічныя справы, прызнаны ўважлівымі.

Аб аднаўленні тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту) указваецца ў прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення. Пры гэтым у прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, указваецца, што судовы загад, выдадзены на падставе судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, што абскарджваецца, прызнаецца страціўшым сілу з моманту вынясення прысуду аб аднаўленні тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі.

Аб адмове ў аднаўленні тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту) суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які накіроўваецца асобе, што заявіла хадайніцтва, у тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб адмове ў аднаўленні тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту) можа быць абскарджаны (апратэставаны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Да сканчэння тэрміну, устаноўленага гэтым артыкулам для апеляцыйнага абскарджання (апратэставання), справа не можа быць выпатрабавана з суда, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 270. Форма і змест апеляцыйнай скаргі (пратэсту)

Апеляцыйная скарга (пратэст) падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай форме і падпісваецца асобай, якая падае скаргу (пратэст), або яе прадстаўніком, упаўнаважаным на падпісанне скаргі.

У апеляцыйнай скарзе (пратэсце) павінны быць указаны:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца апеляцыйная скарга (пратэст);

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) асобы, якая падае скаргу (пратэст), яе месца жыхарства (месца знаходжання) або месца знаходжання; прозвішчы, уласныя імёны, імёны па бацьку (найменні) іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, што прыняў судовую пастанову, на якую падаецца скарга (пратэст); нумар справы і дата прыняцця судовай пастановы; прадмет спрэчкі;

патрабаванні асобы, якая падае скаргу (пратэст), і падставы, паводле якіх асоба, якая падае скаргу (пратэст), лічыць судовую пастанову няправільнай, са спасылкай на заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя прававыя акты, абставіны справы і доказы;

пералік дакументаў, якія прыкладаюцца да скаргі (пратэсту).

Апеляцыйная скарга можа ўтрымліваць хадайніцтва аб прызначэнні прыміральніка.

Да апеляцыйнай скаргі дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць:

выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў скарзе або паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы скаргі;

накіраванне іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, копій апеляцыйнай скаргі і дакументаў, якія ў іх адсутнічаюць;

паўнамоцтвы на падпісанне апеляцыйнай скаргі (даверанасць, якая пацвярджае паўнамоцтва прадстаўніка асобы на абскарджанне судовых пастаноў).

Да апеляцыйнага пратэсту дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць:

накіраванне іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, копій апеляцыйнага пратэсту і дакументаў, якія ў іх адсутнічаюць;

паўнамоцтвы на падпісанне апеляцыйнага пратэсту.

Асоба, якая падае апеляцыйную скаргу (пратэст), абавязана накіраваць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні копіі апеляцыйнай скаргі (пратэсту) і прыкладзеных дакументаў, якія ў іх адсутнічаюць.

Апеляцыйная скарга (пратэст) можа быць пададзена як на судовую пастанову ў цэлым, так і на яе частку.

У апеляцыйнай скарзе (пратэсце) не могуць быць заяўлены новыя патрабаванні, якія не былі прад'яўлены пры разглядзе справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Да апеляцыйнай скаргі (пратэсту) на прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб вяртанні іскавай заявы павінны быць таксама прыкладзены вернутая іскавая заява і дакументы, якія прыкладаліся да яе пры падачы ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Артыкул 271. Водгук на апеляцыйную скаргу (пратэст)

Асоба, якая ўдзельнічае ў справе, пры атрыманні копіі апеляцыйнай скаргі (пратэсту) абавязана накіраваць у суд, які разглядае эканамічныя справы, водгук на яе ў тэрмін, які забяспечвае паступленне водгуку ў суд да дня разгляду апеляцыйнай скаргі (пратэсту), і доказы адпраўлення копій водгуку іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе. Да водгуку могуць быць прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць пярэчанні па скарзе.

Водгук на апеляцыйную скаргу (пратэст) падпісвае асоба, якая атрымала скаргу (пратэст), або яе прадстаўнік. Пры гэтым да водгуку, падпісанага прадстаўніком, прыкладаюцца дакументы, якія пацвярджаюць яго паўнамоцтвы на падпісанне водгуку.

Артыкул 272. Вяртанне апеляцыйнай скаргі (пратэсту)

Апеляцыйная скарга (пратэст) вяртаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі, калі:

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена асобай, якая не мае права на абскарджанне (апратэставанне) судовай пастановы;

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена на судовую пастанову, якая ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не можа быць абскарджана (апратэставана) у апеляцыйным парадку;

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена пасля сканчэння ўстаноўленага тэрміну і адсутнічае хадайніцтва аб яго аднаўленні або калі ў аднаўленні прапушчанага тэрміну на падачу апеляцыйнай скаргі (пратэсту) адмоўлена;

да вынясення прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення суда ад асобы, якая падала скаргу (пратэст), паступіла заява аб яе вяртанні (адкліканні);

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых артыкулам 270 гэтага Кодэкса.

Аб вяртанні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі выносіць прысуд, у якім указвае ўсе парушэнні

патрабаванняў гэтага Кодэкса, дапушчаныя пры падачы апеляцыйнай скаргі (пратэсту).

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб вяртанні апеляцыйнай скаргі ўказваецца аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб вяртанні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) накіроўваецца асобе, якая падала скаргу (пратэст), не пазней за пяць дзён з дня яе паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы. Адначасова з прысудам вяртаюцца апеляцыйная скарга (пратэст) і прыкладзеныя да яе дакументы.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб вяртанні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) можа быць абскарджаны (апратэставаны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

У выпадку адмены прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб вяртанні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) апеляцыйная скарга (пратэст) лічыцца пададзенай у дзень першапачатковага звароту ў суд, які разглядае эканамічныя справы.

Вяртанне апеляцыйнай скаргі (пратэсту), за выключэннем вяртання апеляцыйнай скаргі на падставах, указаных у абзацах другім і трэцім часткі першай гэтага артыкула, не перашкаджае паўторнаму звароту з апеляцыйнай скаргай у суд, які разглядае эканамічныя справы, у агульным парадку пасля ліквідацыі абставін, якія паслужылі падставай для яе вяртання.

Артыкул 273. Пакіданне апеляцыйнай скаргі (пратэсту) без разгляду

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі пакідае нявернутую апеляцыйную скаргу (пратэст) без разгляду, калі:

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых артыкулам 270 гэтага Кодэкса;

да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд і вырашэнне справы, ад асобы, якая падала скаргу (пратэст), паступіла заява аб яе вяртанні (адкліканні).

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі таксама пакідае нявернутую апеляцыйную скаргу без разгляду, калі да яе не прыкладзены дакументы, якія пацвярджаюць выплату дзяржаўнай пошліны, або ў ёй не ўказаны ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ў выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП, або такі ўліковы нумар не паведамлены суду, які разглядае эканамічныя справы, іншым спосабам пры падачы апеляцыйнай скаргі.

Аб пакіданні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) без разгляду суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, у якім могуць быць вырашаны пытанні аб размеркаванні паміж бакамі судовых выдаткаў.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб пакіданні апеляцыйнай скаргі без разгляду ўказваецца аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб пакіданні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) без разгляду накіроўваецца асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, у тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб пакіданні апеляцыйнай скаргі (пратэсту) без разгляду можа быць абскарджаны (апратэставаны) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Пасля ліквідацыі абставін, якія паслужылі падставай для пакідання апеляцыйнай скаргі (пратэсту) без разгляду, асоба, якая падавала скаргу (пратэст), мае права ізноў падаць у суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйную скаргу (пратэст) у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 274. Прыняцце апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення суда, які разглядае эканамічныя справы

Апеляцыйная скарга (пратэст), пададзеная з захаваннем патрабаванняў да яе формы і зместу, устаноўленых гэтым Кодэксам, прымаецца да вядзення судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі.

Пытанне аб прыняцці апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення вырашае суддзя суда, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі аднаасобна. Аб прыняцці апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі выносіць прысуд, у якім указваюцца час і месца правядзення судовага пасяджэння па разглядзе апеляцыйнай скаргі (пратэсту).

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення накіроўваецца асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней за пяць дзён з дня паступлення скаргі (пратэсту) у суд.

Артыкул 275. Спыненне вядзення па апеляцыйнай скарзе (пратэсце)

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі спыняе вядзенне па апеляцыйнай скарзе (пратэсце), калі:

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена асобай, якая не мае права на абскарджанне (апратэставанне) судовай пастановы;

апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена на судовую пастанову, якая ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не можа быць абскарджана ў апеляцыйным парадку, і была памылкова прынята судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі да вядзення;

пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі (пратэсту) да вядзення ад асобы, якая падала скаргу (пратэст), паступіла заява аб адмове ад скаргі (пратэсту) і адмова была прынята судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі.

Аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе (пратэсце) суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, у якім могуць быць вырашаны пытанні аб размеркаванні паміж бакамі судовых выдаткаў.

У прысудзе суда, які разглядае эканамічныя справы, аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе ўказваецца аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе (пратэсце) накіроўваецца асобе, якая падала скаргу (пратэст), а таксама асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней за пяць дзён з дня вынясення прысуду. Адначасова з прысудам вяртаюцца апеляцыйная скарга (пратэст) і прыкладзеныя да яе дакументы.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе (пратэсце) можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

У выпадку спынення вядзення па апеляцыйнай скарзе (пратэсце) паўторная падача той жа асобай у суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай скаргі (пратэсту) не дапускаецца.

Артыкул 276. Парадак разгляду справы судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі разглядае справу на судовым пасяджэнні па правілах разгляду справы судом, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтай главой.

У судзе, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі не прымяняюцца правілы аб злучэнні і раз'яднанні некалькіх патрабаванняў; аб змяненні прадмета або падставы іску, памеру іскавых патрабаванняў; аб прад'яўленні сустрэчнага іску; аб замене неналежнага адказчыка; аб уваходжанні ў справу трэцяй асобы, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, а таксама іншыя правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам толькі для разгляду справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Няяўка на судовае пасяджэнне суда, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі асобы, якая падала апеляцыйную скаргу (пратэст), і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага разбору, не перашкаджае разгляду справы ў іх адсутнасць.

Артыкул 277. Межы разгляду справы судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі на падставе апеляцыйнай скаргі (пратэсту) паўторна разглядае справу па доказах, якія ёсць у справе і дадаткова пададзеных доказах. Калі суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі выявіць немагчымасць разгляду справы на падставе доказаў, якія ёсць у справе, ён мае права прапанаваць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, падаць дадатковыя доказы або непасрэдна іх выпатрабаваць.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі прымае дадатковыя доказы, калі заяўнік абгрунтаваў немагчымасць іх падачы ў судзе першай інстанцыі з-за прычын, якія не залежаць ад яго.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі не правярае фактаў, выяўленых судом першай інстанцыі, калі такія факты ў судзе першай інстанцыі былі прызнаны і засведчаны асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, у парадку, устаноўленым артыкулам 107 гэтага Кодэкса.

Калі апеляцыйная скарга (пратэст) пададзена на частку судовай пастановы, суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі пры адсутнасці пярэчанняў іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, правярае абгрунтаванасць і законнасць прынятай судовай пастановы толькі ў частцы, якая абскарджваецца.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі незалежна ад доказаў, выкладзеных у апеляцыйнай скарзе (пратэсце), правярае, ці не дапушчаны судом, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі парушэнні норм працэсуальнага права, якія з'яўляюцца ў любым выпадку падставай для адмены судовай пастановы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі не прымае і не разглядае новыя патрабаванні, якія не былі прад'яўлены пры разглядзе справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Артыкул 278. Тэрмін разгляду апеляцыйнай скаргі (пратэсту)

Апеляцыйная скарга (пратэст) на судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі павінна быць разгледжана ў тэрмін, не

большы за пятнаццаць дзён з дня яе паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы, уключаючы тэрмін на прыняцце пастановы па выніках яе разгляду.

У выключных выпадках з улікам асаблівай складанасці справы тэрмін разгляду апеляцыйнай скаргі (пратэсту) можа быць прадоўжаны старшынёй суда, які разглядае эканамічныя справы, або яго намеснікам, але не больш чым на пятнаццаць дзён.

Апеляцыйная скарга (пратэст) на прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі аб вяртанні іскавай заявы (заявы, скаргі), аб адмове ў прыняцці іскавай заявы (заявы, скаргі) разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі не больш за пяць дзён з дня яе паступлення ў суд без апавяшчэння бакоў.

Артыкул 279. Паўнамоцтвы суда, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі мае права:

пакінуць судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі без змянення, а апеляцыйную скаргу (пратэст) – без задавальнення;

змяніць або адмяніць судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі і прыняць справу да свайго вядзення, а пры адмене прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, які перашкаджае далейшаму руху справы, а таксама судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) накіраваць справу (іскавую заяву, заяву, скаргу) у суд, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі для разгляду (вырашэння пытання) па сутнасці;

адмяніць судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі ў цэлым або яе частцы і пакінуць іск без разгляду або спыніць вядзенне па справе ў цэлым або яе частцы.

Артыкул 280. Падставы для змянення або адмены судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі

Падставамі для змянення або адмены судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі з'яўляюцца:

няпоўнае высвятленне абставін, якія маюць значэнне для справы;

недаказанасць абставін, якія маюць значэнне для справы, якія суд, які разглядае эканамічныя справы, палічыў высветленымі;

неадпаведнасць высноў, выкладзеных у судовым акце, абставінам справы;

парушэнне або няправільнае прымяненне норм матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права.

Нормы матэрыяльнага права лічацца парушанымі або няправільна прыменемымі, калі суд, які разглядае эканамічныя справы:

не прымяніў заканадаўства, якое падлягае прымяненню;

прымяніў заканадаўства, якое не падлягае прымяненню;

няправільна вытлумачыў заканадаўства.

Парушэнне або няправільнае прымяненне норм працэсуальнага права з'яўляюцца падставамі для змянення або адмены судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, калі гэта прывяло або магло прывесці да прыняцця няправільнай судовай пастановы.

Парушэнне норм працэсуальнага права з'яўляецца ў любым выпадку падставай для адмены судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, калі:

справа разгледжана судом у незаконным складзе;

справа разгледжана судом у адсутнасць каго-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе і не апавешчаны належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння;

пры разглядзе справы былі парушаны правілы аб мове судаводства ў судзе, які разглядае эканамічныя справы;

суд прыняў судовую пастанову аб правах і абавязках асоб, не прыцягнутых да ўдзелу ў справе;

судовая пастанова не падпісана кім-небудзь з суддзяў суда, які разглядае эканамічныя справы, або падпісана не тымі суддзямі суда, які разглядае эканамічныя справы, якія ў ёй указаны;

судовая пастанова прынята не тымі суддзямі суда, які разглядае эканамічныя справы, якія ўваходзілі ў склад суда, які разглядае эканамічныя справы, які разглядаў справу;

у справе адсутнічае пратакол судовага пасяджэння або ён не падпісаны асобамі, абавязанымі яго падпісаць, за выключэннем спраў, па якіх у адпаведнасці з гэтым Кодэксам вядзенне пратакола не з'яўляецца абавязковым.

Выявіўшы наяўнасць падстаў, прадугледжаных часткай чацвёртай гэтага артыкула, а таксама парушэнняў іншых норм гэтага Кодэкса, якія не могуць быць ліквідаваны судом, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі без адмены прынятай па справе судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, суд, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі адмяняе судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі і разглядае справу па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для разгляду справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Артыкул 281. Пастанова суда, які разглядае эканамічныя справы, апеляцыйнай інстанцыі

Пратэст у парадку нагляду можа быць прынесены на працягу аднаго года з дня ўступлення ў законную сілу судовай пастановы. Калі наступныя судовыя пастановы не адмяняюць (змяняюць) судовай пастановы, якой спрэчка (справа) вырашана па сутнасці, тэрмін прынясення пратэсту лічыцца з даты ўступлення ў сілу гэтай судовай пастановы.

Тэрмін для прынясення пратэсту ў парадку нагляду аднаўляецца, калі скарга была пададзена з захаваннем устаноўленага тэрміну яе падачы, але рашэнне па ёй не было прынята. Аднаўленне тэрміну для прынясення пратэсту ў парадку нагляду павінна быць у пратэсце агаворана.

Калі пратэст прыносіцца ў сувязі са скаргай у парадку нагляду, пададзенай з парушэннем тэрміну, устаноўленага часткай другой артыкула 300 гэтага Кодэкса, або без абскарджання судовай пастановы ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, у ім павінны быць прыведзены матывы, паводле якіх прызнаецца, што гэта адбылося з-за ўважлівых прычын.

Калі пратэст прыносіцца Генеральным пракурорам або яго намеснікамі ў выпадках, прадугледжаных часткай чацвёртай артыкула 308 гэтага Кодэкса, без наяўнасці скаргі, у ім павінны быць прыведзены матывы, якія з'явіліся падставай для выпатрабавання справы.

Копія пратэсту ў парадку нагляду накіроўваецца асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней за пяць дзён з дня прынясення пратэсту ў суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі.

Службовая асоба, якая прынесла пратэст у парадку нагляду, мае права да пачатку разгляду справы адклікаць пратэст з абгрунтаваннем прычын яго адклікання. Пры гэтым асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб адкліканні пратэсту ў парадку нагляду.

Артыкул 310. Змест пратэсту ў парадку нагляду

Пратэст у парадку нагляду павінен змяшчаць:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі, у які прыносіцца пратэст;

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў судовую пастанову, што апратэстоўваецца, нумар справы, дату прыняцця судовай пастановы, сціслы яе змест; даныя аб іншых судовых пастановах, прынятых па гэтай справе; матывы, паводле прызнаецца, што судовыя пастановы не абскарджваліся ў судах, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый з-за ўважлівых прычын;

падставы для накіравання справы для разгляду ў суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі, прадугледжаныя артыкулам 314 гэтага Кодэкса, матывы накіравання з указаннем канкрэтных норм матэрыяльнага і (або)

працэсуальнага права, парушаных пры прыняцці судовай пастановы, якая апратэстоўваецца;

просьбу службовай асобы, якая прынесла пратэст.

Артыкул 311. Пакіданне пратэсту ў парадку нагляду без разгляду

Суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі пакідае пратэст у парадку нагляду без разгляду, калі:

пратэст прынесены без нагод, прадугледжаных артыкулам 308 гэтага Кодэкса, і (або) да яго не прыкладзены адпаведна скарга, прадстаўленне ці хадайніцтва;

пратэст прынесены пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага часткай другой артыкула 309 гэтага Кодэкса, і ў ім не агаворана аб аднаўленні тэрміну для прынясення пратэсту ў парадку, прадугледжаным часткай трэцяй артыкула 309 гэтага Кодэкса;

пратэст не адпавядае патрабаванням, устаноўленым артыкулам 310 гэтага Кодэкса.

Пакіданне пратэсту ў парадку нагляду без разгляду на падставах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, не перашкаджае пасля ліквідацыі выяўленых парушэнняў паўторнаму прынясенню пратэсту.

Артыкул 312. Парадак і тэрміны разгляду пратэсту ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі

Пры разглядзе справы ў парадку нагляду прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса для разгляду спраў у судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі з выключэннямі і дапаўненнямі, прадугледжанымі гэтай главой, а таксама з улікам сутнасці нагляднага вядзення.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі прымае справу да свайго разгляду на падставе пратэсту, прынесенага ў адпаведнасці з артыкулам 310 гэтага Кодэкса.

Пратэсты ўключаюцца ў парадак дня суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі ў парадку чарговасці іх паступлення. Суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі не мае права разглядаць на судовым пасяджэнні справы, не ўключаныя ў парадак дня.

Пратэсты разглядаюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у тэрмін, не большы за два месяцы, а Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – у тэрмін, не большы за тры месяцы з дня паступлення пратэсту ў адпаведны суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі.

Асоба, якая прынесла пратэст, а таксама асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права ўдзельнічаць у пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі. Няяўка ўказаных асоб не перашкаджае разгляду справы ў судзе, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, калі яны былі апавешчаны аб часе і месцы разгляду справы і прыбылі на судовае пасяджэнне, маюць права даць тлумачэнні пасля даклада справы.

Вядзенне пратакола судовага пасяджэння і пратакола асобнага працэсуальнага дзеяння суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі з'яўляецца абавязковым у выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Пасля выступленняў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і асоб, якія прысутнічаюць на судовым пасяджэнні, суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі прымае пастанову на закрытым пасяджэнні.

Вынік разгляду пратэсту аб'яўляецца публічна.

Артыкул 313. Межы разгляду справы ў парадку нагляду

Пры разглядзе справы ў парадку нагляду суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі правярае правільнасць прымянення і тлумачэння норм матэрыяльнага і працэсуальнага права судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый на падставе матэрыялаў, якія ёсць у справе.

Артыкул 314. Падставы для змянення або адмены судовых пастаноў у парадку нагляду

Судовыя пастановы судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, што ўступілі ў законную сілу, падлягаюць змяненню або адмене, калі будзе выяўлена, што яны істотна парушаюць нормы матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права. Судовая пастанова не можа быць адменена на фармальных падставах.

Артыкул 315. Паўнамоцтвы суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі

Суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі мае права:

пакінуць судовыя пастановы судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі без змянення, а пратэст – без задавальнення;

адмяніць судовыя пастановы судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі ў цэлым або іх частцы і накіраваць справу на новы разгляд;

адмяніць судовыя пастановы судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі ў цэлым або іх частцы і пакінуць іскавую заяву без разгляду або спыніць вядзенне па справе;

пакінуць у сіле адну або некалькі судовых пастаноў, вынесеных па справе;

змяніць або адмяніць судовыя пастановы судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або судовую пастанову суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі і вынесці новую судовую пастанову, не перадаючы справу на новы разгляд, калі дапушчана памылка ў прымяненні і тлумачэнні норм матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, але ўсе абставіны справы выяўлены поўна і правільна і пацвярджаюцца неабходнымі доказамі.

Артыкул 316. Абавязковасць указанняў суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі

Указанні суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі, выкладзеныя ў пастанове аб адмене судовай пастановы, абавязковыя для суда, які разглядае эканамічныя справы, які нанава разглядае дадзеную справу.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі не мае права выяўляць або лічыць даказанымі абставіны, якія не былі выяўлены на судовым пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, або адхілены ім, прадрашаць пытанні дакладнасці або недакладнасці таго або іншага доказу, перавагі адных доказаў перад іншымі, а таксама ўказваць, якая судовая пастанова павінна быць прынята пры новым разглядзе справы.

Артыкул 317. Пастанова суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі

У пастанове суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі па выніках разгляду справы павінны быць указаны:

нумар справы, дата і месца прыняцця судовай пастановы; склад суда, які прыняў пастанову, прозвішча і ініцыялы суддзі-дакладчыка; прозвішчы і ініцыялы асоб, якія прысутнічалі на пасяджэнні, з указаннем іх паўнамоцтваў;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) асобы, якая падала скаргу ў парадку нагляду, калі пратэст прынесены ў сувязі з такой скаргай;

прозвішчы, уласныя імёны, імёны па бацьку (найменні) асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

сціслы пераказ сутнасці справы;

найменні судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, якія разглядалі справу ў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцыях, або суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі, даты прыняцця і сціслы змест прынятых судовых пастаноў;

доказы, выкладзеныя ў скарзе ў парадку нагляду;

доказы, выкладзеныя ў пратэсце ў парадку нагляду;

тлумачэнні асоб, якія прысутнічалі на судовым пасяджэнні;

спасылкі на заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя прававыя акты, якімі кіраваўся суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі пры прыняцці судовай пастановы; доказы, паводле якіх суд не прымяніў заканадаўчыя і іншыя нарматыўныя прававыя акты, на якія спасылалася асоба, што прынесла пратэст;

пры змяненні або адмене судовых пастаноў – матывы, паводле якіх суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі не пагадзіўся з высновамі судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі;

высновы па выніках разгляду пратэсту ў парадку нагляду, а таксама скаргі ў парадку нагляду, калі пратэст прынесены ў сувязі з такой скаргай;

дзеянні, якія павінны быць выкананы асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, і судамі, якія разглядаюць эканамічныя справы, калі справа перадаецца на новы разгляд.

Пры заключэнні бакамі міравога пагаднення ў працэсе разгляду пратэсту суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі прымае пастанову аб адмене пастаноў судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі, зацвярджэнні міравога пагаднення і аб спыненні вядзення па справе, якая накіроўваецца асобам, што ўдзельнічаюць у справе.

Артыкул 318. Парадак прыняцця пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь лічыцца прынятай, калі на яго пасяджэнні прысутнічала больш за палову членаў Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і за пастанову прагаласавала большасць ад агульнай колькасці прысутных. Старшынствуючы на пасяджэнні галасуе апошнім.

Пастанова Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь лічыцца прынятай, калі на яго пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці членаў Пленума

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і за пастанову прагаласавала большасць ад агульнай колькасці прысутных. Старшынствуючы на пасяджэнні галасуе апошнім.

Пры роўнасці галасоў суд, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі пакідае пратэст у парадку нагляду без задавальнення, а судовую пастанову – без змянення.

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь падпісваецца старшынствуючым. Пастанова Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь падпісваецца старшынствуючым і сакратаром Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Пастанова суда, які разглядае эканамічныя справы, нагляднай інстанцыі ўступае ў законную сілу з моманту яе прыняцця, і не пазней за дзесяць дзён з дня яе прыняцця копія пастановы накіроўваецца асобе, якая падала скаргу ў парадку нагляду, і іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

ГЛАВА 34
ПЕРАГЛЯД СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ, З-ЗА АБСТАВІН, ЯКІЯ АДКРЫЛІСЯ НАНАВА

Артыкул 319. Падставы для аднаўлення справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Судовыя пастановы, што ўступілі ў законную сілу, могуць быць перагледжаны прыняўшым іх судом, які разглядае эканамічныя справы, з-за абставін, якія адкрыліся нанава. Падставамі для аднаўлення справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, з'яўляюцца:

абставіны, якія абвяргаюць высновы суда, які разглядае эканамічныя справы, па справе, якія не былі і не маглі быць вядомыя заяўніку і суду, які разглядае эканамічныя справы;

выяўленыя прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, заведама лжывыя паказанні сведкі, заведама лжывае заключэнне эксперта, заведама лжывая кансультацыя спецыяліста, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, якія выклікалі прыняцце незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы па справе;

выяўленыя прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, злачынныя дзеянні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або іх прадстаўнікоў ці злачынныя дзеянні суддзяў, здзейсненыя ў сувязі з гэтай справай;

адмена судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, ці іншага суда або пастановы іншага органа, якія паслужылі падставай для прыняцця гэтай судовай пастановы, і прыняцце адпаведнай пастановы, процілеглай па змесце адпаведнаму акту (у цэлым або яго частцы), на падставе якой была прынята судовая пастанова па гэтай справе;

прызнанне судовай пастановай суда, які разглядае эканамічныя справы, якая ўступіла ў законную сілу, або іншага суда агульнай юрысдыкцыі несапраўднай здзелкі, якая выклікала прыняцце незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы па справе;

прызнанне Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь заканадаўчых актаў, прымененых судом, які разглядае эканамічныя справы, у справе, не адпаведнымі ў цэлым або іх частцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь або не адпаведнымі ў цэлым або іх частцы нарматыўным прававым актам большай юрыдычнай сілы.

Артыкул 320. Узбуджэнне вядзення аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Вядзенне аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, можа быць пачата па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама па прадстаўленні службовых асоб, якія маюць права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, у межах іх кампетэнцыі.

Заява (прадстаўленне) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, у пісьмовай форме і падпісваецца заяўнікам (службовай асобай).

Заява аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, можа быць пададзена не пазней за тры месяцы з дня адкрыцця абставін, якія адкрыліся нанава. Для ўнясення прадстаўлення тэрміны не ўстанаўліваюцца.

У заяве (прадстаўленні) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, павінны быць указаны:

найменне суда, які разглядае эканамічныя справы, у які падаецца заява (прадстаўленне);

абгрунтаваная просьба аб узбуджэнні вядзення аб аднаўленні справы;

судовая пастанова, якая падлягае адмене, і падставы для яе адмены;

доказы, якія пацвярджаюць наяўнасць абставін, якія адкрыліся нанава, і момант іх адкрыцця;

доказы, якія пацвярджаюць накіраванне асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, копій заявы (прадстаўлення) аб аднаўленні справы і прыкладзеных да яе дакументаў;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) асобы, якая падае заяву (прадстаўленне), а таксама дата яе падачы.

Аб узбуджэнні вядзення аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд.

Пры падачы заявы аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, пасля сканчэння тэрміну, прадугледжанага часткай трэцяй гэтага артыкула для яе падачы, і пры адсутнасці хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну, а таксама пры непадачы доказаў, якія пацвярджаюць накіраванне асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, копій такой заявы (прадстаўлення), гэта заява (прадстаўленне) вяртаецца асобе, якая яе падала (якая ўнесла).

Аб вяртанні заявы (прадстаўлення) выносіцца прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 321. Падлік тэрмінаў для падачы заявы аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Тэрміны для падачы заявы аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, лічацца:

у выпадку, прадугледжаным абзацам другім часткі другой артыкула 319 гэтага Кодэкса, – з дня, калі заяўніку сталі вядомы абставіны, якія адкрыліся нанава;

у выпадках, прадугледжаных абзацамі трэцім і чацвёртым часткі другой артыкула 319 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда;

у выпадках, прадугледжаных абзацамі пятым і шостым часткі другой артыкула 319 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу новай судовай пастановы або пастановы іншага органа, па змесце процілеглай адпаведнаму акту, на падставе якога была прынята судовая пастанова, якая пераглядаецца;

у выпадку, прадугледжаным абзацам сёмым часткі другой артыкула 319 гэтага Кодэкса, – з моманту прыняцця рашэння Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 322. Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, якія разглядаюць заявы (прадстаўленні) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Заяву (прадстаўленне) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, у мэтах адмены судовай пастановы суда, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі разглядае суд, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў гэту пастанову, пры ўмове, што суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай, касацыйнай або наглядной інстанцый не ўносілі ў яе змяненняў.

Заяву (прадстаўленне) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, у мэтах адмены судовых пастаноў судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, апеляцыйнай, касацыйнай і (або) наглядной інстанцый, якімі зменена або прынята новая судовая пастанова, разглядае суд, які разглядае эканамічныя справы, той інстанцыі, у якой зменена або прынята новая судовая пастанова.

Артыкул 323. Разгляд заявы (прадстаўлення) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Заява (прадстаўленне) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, разглядаецца на судовым пасяджэнні ў тэрмін, не большы за адзін месяц з дня яе паступлення ў суд, які разглядае эканамічныя справы. Заяўнік, службовая асоба, якая ўнесла прадстаўленне, і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца судом, які разглядае эканамічныя справы, аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння заказным пісьмом з паведамленнем аб уручэнні. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду заявы (прадстаўлення).

Заява (прадстаўленне) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, разглядаецца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, у тым ліку з улікам правіл, устаноўленых для разгляду спраў у судзе, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі, з выключэннямі і дапаўненнямі, прадугледжанымі гэтай главой, а таксама з улікам сутнасці вядзення аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава,.

Артыкул 324. Паўнамоцтвы суда, які разглядае эканамічныя справы, пры разглядзе заявы (прадстаўлення) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава

Суд, які разглядае эканамічныя справы, пасля разгляду заявы (прадстаўлення) аб аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, мае права:

задаволіць заяву (прадстаўленне), адмяніць судовыя пастановы, раней прынятыя па справе, і аднавіць справу з-за абставін, якія адкрыліся нанава;

адмовіць у аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава.

Пры адмене судовых пастаноў, раней прынятых па справе, і аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае рашэнне, якое можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Пасля прыняцця рашэння аб адмене судовых пастаноў, раней прынятых па справе, і аднаўленні справы з-за абставін, якія адкрыліся нанава, гэта справа разглядаецца ў тым жа судзе, які разглядае эканамічныя справы, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

РАЗДЗЕЛ IV
ВЯДЗЕННЕ, ЗВЯЗАНАЕ З ВЫКАНАННЕМ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ, ІНШЫХ РАШЭННЯЎ І АКТАЎ

ГЛАВА 35
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 325. Кампетэнцыя судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, звязаная з выкананнем судовых пастаноў, іншых рашэнняў і актаў

Суды, якія разглядаюць эканамічныя справы, выдаюць судовыя загады, дублікаты судовых загадаў, вырашаюць пытанне аб звароце выканання судовай пастановы, аднаўляюць прапушчаны тэрмін прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання, разглядаюць хадайніцтвы аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання судовай пастановы, заявы аб часовым абмежаванні права грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь, аб часовым абмежаванні права грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, на кіраванне механічнымі транспартнымі сродкамі, маторнымі маламернымі судамі, на паляванне, аб часовым абмежаванні грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях, прадстаўленні судовага выканаўцы, скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) кіраўніка органа прымусовага выканання, а таксама вырашаюць іншыя пытанні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 326. Выдача судом, які разглядае эканамічныя справы, судовага загада

Судовы загад выдаецца на падставе судовых пастаноў судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, рашэнняў міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, трацейскіх судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, рашэнняў замежных судоў, замежных арбітражных рашэнняў, медыятыўных пагадненняў, а таксама на падставе іншых актаў, выкананне якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аднесена да кампетэнцыі судовага выканаўцы.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, на падставе прынятай ім судовай пастановы пасля ўступлення яе ў законную сілу выдае судовы загад спагнанніку, за выключэннем выпадку неадкладнага выканання судовай пастановы, калі судовы загад выдаецца неадкладна пасля прыняцця гэтай судовай пастановы, а таксама выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Пры разглядзе пытання аб выдачы судовага загада на падставе іншых рашэнняў і актаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць матываваныя прысуды аб выдачы судовага загада або аб адмове ў выдачы судовага загада. Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб выдачы судовага загада або аб адмове ў выдачы судовага загада могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 327. Выдача па адной судовай пастанове некалькіх судовых загадаў

Калі судовая пастанова прынята на карысць некалькіх істцоў або супраць некалькіх адказчыкаў або калі выкананне павінна быць праведзена на тэрыторыі, якая знаходзіцца ў юрысдыкцыі розных органаў прымусовага выканання, выдаецца

некалькі судовых загадаў з указаннем у кожным з іх той часткі, якая падлягае выкананню па гэтым судовым загадзе.

Пры ўскладанні салідарнай адказнасці судовыя загады выдаюцца адпаведна колькасці салідарных даўжнікоў. Пры гэтым у кожным з судовых загадаў указваюцца агульная сума, якая падлягае спагнанню на карысць крэдытора, найменні ўсіх даўжнікоў, іх салідарная адказнасць.

Пры субсідыярнай адказнасці аднаго з даўжнікоў судовы загад аб спагнанні з субсідыярнага даўжніка выдаецца пасля падачы спагнаннікам доказаў немагчымасці спагнання ўсёй прысуджанай сумы з асноўнага даўжніка.

Пры даванні даўжніку растэрміноўкі выканання судовай пастановы спагнанніку па яго заяве выдаюцца асобныя судовыя загады аб спагнанні кожнай сумы, вызначанай растэрміноўкай.

Артыкул 328. Змест судовага загада

У судовым загадзе суда, які разглядае эканамічныя справы, павінны быць указаны:

найменне і адрас суда, які разглядае эканамічныя справы, які выдаў судовы загад;

найменне і нумар справы або матэрыялаў, на падставе якіх выдадзены выканаўчы дакумент;

прозвішча і ініцыялы суддзі суда, які разглядае эканамічныя справы, які выдаў судовы загад;

дата прыняцця судовай пастановы, на падставе якой выдадзены судовы загад;

дата ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, на падставе якой выдадзены судовы загад, або ўказанне на неадкладнае выкананне гэтай судовай пастановы;

звесткі аб даўжніку і спагнанніку:

у дачыненні да грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі гэтакае ёсць), іх месца жыхарства (месца знаходжання). У дачыненні да грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, таксама павінны быць указаны дата і месца іх нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), даныя дакумента, які сведчыць асобу (ідэнтыфікацыйны нумар, серыя (пры іх наяўнасці), нумар, дата выдачы, найменне органа, які выдаў дакумент), месца працы (калі яно вядомае), а ў дачыненні да індывідуальнага прадпрымальніка, які з'яўляецца даўжніком, акрамя ўказанага – таксама рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка, уліковы нумар плацельшчыка;

у дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, – іх найменне і месца знаходжання, рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі, уліковы нумар плацельшчыка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь – найменне і адрас органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імя бокам выканаўчага вядзення;

рэзалютыўная частка судовай пастановы, на падставе якой выдадзены судовы загад;

звесткі аб мерах для забеспячэння іску, калі такія прымаліся;

дата выдачы судовага загада і тэрмін яго дзеяння.

Калі да выдачы судовага загада дадзены адтэрміноўка або растэрміноўка выканання судовай пастановы, на падставе якой выдаецца судовы загад, у судовым загадзе ўказваецца, з якога часу пачынаецца цячэнне тэрміну выканання патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў гэтым судовым загадзе.

У судовым загадзе могуць быць указаны і іншыя звесткі, неабходныя для яго выканання.

Судовы загад падпісваецца суддзёй суда, які разглядае эканамічныя справы (старшынствуючым на судовым пасяджэнні), і завяраецца пячаткай суда, які разглядае эканамічныя справы, з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 329. Растлумачэнне судовага загада і іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, выдадзеных судом, які разглядае эканамічныя справы, спосабу і парадку іх выканання

У выпадку няяснасці патрабаванняў судовага загада або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, спосабу і парадку іх выканання суд, які разглядае эканамічныя справы, які выдаў гэты судовы загад або іншы выканаўчы дакумент, па заяве боку выканаўчага вядзення ці па прадстаўленні судовага выканаўцы можа растлумачыць выдадзены ім судовы загад або іншы выканаўчы дакумент, спосаб і парадак іх выканання.

Заява (прадстаўленне) аб растлумачэнні судовага загада або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, спосабу і парадку іх выканання падлягае разгляду судом, які разглядае эканамічныя справы, у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення заявы (прадстаўлення).

Артыкул 330. Выдача дубліката судовага загада

У выпадку страты судовага загада суд, які разглядае эканамічныя справы, які прыняў судовую пастанову і выдаў судовы загад, па заяве спагнанніка або прадстаўленні судовага выканаўцы можа выдаць дублікат судовага загада. Заява (прадстаўленне) аб выдачы дубліката судовага загада можа быць пададзена да сканчэння тэрміну, устаноўленага заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання.

Заява (прадстаўленне) аб выдачы дубліката судовага загада разглядаецца на судовым пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, з паведамленнем спагнанніку і даўжніку, апавяшчэннем судовага выканаўцы аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай для разгляду заявы (прадстаўлення) аб выдачы дубліката судовага загада.

Па выніках разгляду заявы (прадстаўлення) аб выдачы дубліката судовага загада суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, якое накіроўваецца спагнанніку і даўжніку або судоваму выканаўцу.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб выдачы дубліката судовага загада або аб адмове ў выдачы дубліката судовага загада могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 36
ПАВАРОТВЫКАНАННЯ СУДОВАЙ ПАСТАНОВЫ. АДНАЎЛЕННЕ ПРАПУШЧАНАГА ТЭРМІНУ ПРАД'ЯЎЛЕННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА ДА ВЫКАНАННЯ. ПРЫНЯЦЦЕ МЕР ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

ВЫКАНАННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА. ВЫЗВАЛЕННЕ МАЁМАСЦІ АД АРЫШТУ

Артыкул 331. Паварот выканання судовай пастановы

У выпадках, калі прыведзеная ў выкананне судовая пастанова зменена ці адменена і прынята новая судовая пастанова аб поўнай або частковай адмове ў іску, або вядзенне па справе спынена, або іск пакінуты без разгляду ў цэлым або яго частцы, даўжніку вяртаецца ўсё, што было спагнана з яго на карысць крэдытора па зменененай або адмененай у адпаведнай частцы судовай пастанове (паварот выканання судовай пастановы).

Калі не прыведзеная ў выкананне судовая пастанова зменена ці адменена і прынята новая судовая пастанова аб поўнай ці частковай адмове ў іску, або вядзенне па справе спынена, або іск пакінуты без разгляду ў цэлым ці яго частцы, суд, які разглядае эканамічныя справы, прымае судовую пастанову аб поўным ці частковым спыненні спагнання па зменененай ці адмененай у адпаведнай частцы судовай пастанове.

Артыкул 332. Рашэнне пытання аб павароце выканання судовай пастановы

Пытанне аб павароце выканання судовай пастановы павінна быць вырашана судом, які разглядае эканамічныя справы, які прымае новую судовую пастанову.

Суд, які разглядае эканамічныя справы, які разглядае справу ў апеляцыйнай, касацыйнай ці нагляднай інстанцыі, калі ён канчаткова вырашае спрэчку, або спыняе вядзенне па справе, або пакідае заяву без разгляду ў цэлым ці яе частцы, абавязаны вырашыць пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, прыведзенай у выкананне.

Калі ў пастанове аб змяненні або адмене судовай пастановы няма ўказання аб павароце яе выканання, даўжнік мае права падаць заяву аб павароце выканання судовай пастановы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, першай інстанцыі.

Па выніках разгляду заявы аб павароце выканання судовай пастановы суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Пры павароце выканання судовай пастановы суд, які разглядае эканамічныя справы, выдае судовы загад на вяртанне спагнаных грашовых сум, маёмасці або яе кошту на падставе заяў юрыдычных асоб або грамадзян, да якіх дадаецца дакумент, які пацвярджае выкананне раней прынятай па справе судовай пастановы.

Артыкул 333. Аднаўленне прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання

Пры пропуску тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання па з-за прычын, прызнаных судом, які разглядае эканамічныя справы, уважлівымі, прапушчаны тэрмін можа быць адноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве спагнанніка.

Хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання падаецца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, які выдаў выканаўчы дакумент, або ў суд, які разглядае эканамічныя справы, па месцы выканання выканаўчага дакумента.

Хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання разглядаецца на судовым пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, з апавяшчэннем спагнанніка і даўжніка аб часе і месцы

правядзення судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання.

Па выніках разгляду хадайніцтва аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, які накіроўваецца спагнанніку і даўжніку.

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання або аб адмове ў яго аднаўленні могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 334. Прыняцце судом, які разглядае эканамічныя справы, мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента

У выпадку, калі даўжнік не выконвае або ўхіляецца ад выканання патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў выканаўчым дакуменце, або мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента, прынятых судовым выканаўцам у выканаўчым вядзенні, недастаткова для своечасовага і поўнага выканання выканаўчага дакумента, суд, які разглядае эканамічныя справы, па заяве спагнанніка або прадстаўленні судовага выканаўцы можа прыняць у дачыненні да даўжніка наступныя меры для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента, калі гэта не перашкаджае выкананню іншых абавязацельстваў даўжніка:

1) часовае абмежаванне права грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь;

2) часовае абмежаванне права грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, на кіраванне механічнымі транспартнымі сродкамі, маторнымі маламернымі судамі, магутнасць рухавіка якіх перавышае 3,7 кілаваты (5 конскіх сіл), права на паляванне, за выключэннем выпадкаў, калі карыстанне ўказанымі правамі неабходна даўжніку ў сувязі з інваліднасцю або ў якасці адзінага сродку атрымання даходу, – на тэрмін да выканання даўжніком патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў выканаўчым дакуменце, але не больш чым на пяць гадоў;

3) часовае абмежаванне грамадзяніна або індывідуальнага прадпрымальніка, якія з'яўляюцца даўжнікамі, у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях.

Заява (прадстаўленне) аб прыняцці мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента разглядаецца на судовым пасяджэнні суда, які разглядае эканамічныя справы, з апавяшчэннем бакоў выканаўчага вядзення аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння.

Па выніках разгляду заявы (прадстаўлення) аб прыняцці мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента суд, які разглядае эканамічныя справы, выносіць прысуд, копіі якога накіроўваюцца бакам выканаўчага вядзення, судоваму выканаўцу, а таксама іншым асобам, на якіх ускладзены абавязак выканання адпаведных мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента.

Прысуд суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці мер для забеспячэння выканаўчага дакумента падлягае выкананню з моманту паведамлення даўжніку.

Дапускаецца замена адной меры для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента іншай мерай. Пытанне аб замене адной меры іншай мерай разглядаецца

судом, які разглядае эканамічныя справы, па заяве бакоў выканаўчага вядзення або прадстаўленні судовага выканаўцы.

Выкананне прысуду суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці мер, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 часткі першай гэтага артыкула, можа быць прыпынена на тэрмін, устаноўлены судом, які разглядае эканамічныя справы. Пытанне аб прыпыненні ўказаных мер разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, па хадайніцтве даўжніка.

Прынятыя раней меры для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента могуць быць адменены судом, які разглядае эканамічныя справы, па заяве бакоў выканаўчага вядзення або прадстаўленні судовага выканаўцы. Пытанне аб адмене мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента разглядаецца судом, які разглядае эканамічныя справы, не пазней за тры дні з дня паступлення заявы (прадстаўлення).

Прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, аб прыняцці мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента, аб замене адной меры для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента іншай мерай, аб прыпыненні або адмене прынятых мер для забеспячэння выканання выканаўчага дакумента могуць быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Падача скаргі на прысуды суда, які разглядае эканамічныя справы, указаныя ў частцы восьмай гэтага артыкула, не прыпыняе выканання гэтых прысудаў.

Артыкул 335. Вызваленне маёмасці ад арышту

У выпадку ўзнікнення спрэчкі, звязанай з прыналежнасцю маёмасці, на якую звяртаецца спагнанне, асоба, чыё права закранаецца выкананнем выканаўчага дакумента, мае права звярнуцца ў суд, які разглядае эканамічныя справы, з іскам аб вызваленні маёмасці ад арышту або выключэнні маёмасці з акта вопісу маёмасці.

Іскі аб вызваленні маёмасці ад арышту або выключэнні маёмасці з акта вопісу маёмасці могуць прад'яўляцца як уласнікамі арыштаванай маёмасці, якая не належыць даўжніку, так і асобамі, якім такая маёмасць належыць на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання.

Калі арышт на маёмасць накладзены ў мэтах забеспячэння канфіскацыі, адказчыкамі з'яўляюцца асоба, у дачыненні да якой прыменена канфіскацыя, і орган, які праводзіў арышт маёмасці. Калі арыштаваная маёмасць ужо рэалізавана, іск прад'яўляецца таксама да той асобы (асоб), у якой знаходзіцца маёмасць.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь **А.Лукашэнка**

Дадатак
да Гаспадарчага
працэсуальнага
кодэкса Рэспублікі
Беларусь

Прэтэнзійны парадак урэгулявання спрэчкі

1. Асоба, чые правы ці законныя інтарэсы парушаны, з мэтай непасрэднага ўрэгулявання спрэчкі з парушальнікам гэтых праў або інтарэсаў абавязана

прад'явіць яму прэтэнзію (пісьмовую прапанову аб добраахвотным урэгуляванні спрэчкі), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі ці дагаворам.

2. У прэтэнзіі ўказваюцца:

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) заяўніка прэтэнзіі і асобы (асоб), якой прэтэнзія прад'яўляецца (атрымальніка прэтэнзіі), іх месца жыхарства або месца знаходжання;

дата прад'яўлення прэтэнзіі;

абставіны, на падставе якіх прад'яўлена прэтэнзія;

доказы, якія пацвярджаюць гэтыя абставіны;

патрабаванні заяўніка прэтэнзіі са спасылкай на заканадаўства;

сума прэтэнзіі і яе разлік, калі прэтэнзія падлягае грашовай ацэнцы;

банкаўскія рэквізіты заяўніка прэтэнзіі (пры іх наяўнасці);

пералік дакументаў, якія дадаюцца да прэтэнзіі.

2^1. У прэтэнзіі могуць указвацца прапановы:

аб вырашэнні спрэчкі з удзелам медыятара;

аб заключэнні трацейскага пагаднення;

аб прызначэнні прымірэнчай працэдуры ў выпадку звароту ў суд, які разглядае эканамічныя справы;

аб выбары віду судаводства.

3. Да прэтэнзіі дадаюцца копіі дакументаў, якія абгрунтоўваюць і пацвярджаюць прад'яўленыя патрабаванні, або выпіскі з іх, якія адсутнічаюць у атрымальніка прэтэнзіі.

4. Прэтэнзія падпісваецца заяўнікам прэтэнзіі або яго прадстаўніком і накіроўваецца атрымальніку прэтэнзіі заказной карэспандэнцыяй з адваротным паведамленнем або ўручаецца пад подпіс.

5. Пры разглядзе прэтэнзіі бакі пры неабходнасці звяраюць разлікі, праводзяць экспертызу або афармляюць іншыя дзеянні для забеспячэння дасудовага ўрэгулявання спрэчкі.

6. Атрымальнік прэтэнзіі ў месячны тэрмін з дня яе атрымання, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўствам або дагаворам, пісьмова паведамляе заяўніку прэтэнзіі аб выніках разгляду прэтэнзіі. Адказ на прэтэнзію падпісваецца атрымальнікам прэтэнзіі або яго прадстаўніком і накіроўваецца заяўніку прэтэнзіі заказной карэспандэнцыяй з адваротным паведамленнем або ўручаецца пад подпіс.

7. Пры частковым або поўным адхіленні прэтэнзіі да адказу дадаюцца копіі дакументаў, якія абгрунтоўваюць адхіленне прэтэнзіі.

8. Неатрыманне адказу на прэтэнзію ва ўстаноўлены пунктам 6 гэтага Дадатку тэрмін не перашкаджае звароту заяўніка прэтэнзіі ў суд, які разглядае эканамічныя справы, з іскам у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, а таксама прад'яўленню прэтэнзіі ў якасці доказу прызнання (неаспрэчвання) атрымальнікам прэтэнзіі патрабаванняў, заяўленых у парадку загаднага вядзення.